Аднойчы ў поўдзень я стаяў на ўзгорку і глядзеў у неба, шука.. ў блакітнай выш..ні жаваранка. Я глядзеў угору, але ў залатым паднябессі заўваж..ў не жаваранка, а каршуна. Гэтага драпежніка я таксама ведаў і бач..ў не раз. Ляціць ён, бывала, над палеткамі махае гэтак паважна крыламі, а потым спыніцца на адным месцы і пачынае выглядаць на зямлі птушак або мышэй. Нагледзіць і кідаецца на ахвяру, са свістам рассяка.. паветра.

Каршун лунаў высока-высока, нібы глядзеў адтуль на мяне. Пасля каршун застыў на месцы быў з боку ад зыркага сляпучага сонца. (179 слоў)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паводле І. Грамовіча

**121. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары на правапіс прыставак і на правапіс *ы*, *і*, *й* пасля прыставак. Расстаўце знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі і звароткам.**

Да чаго прыгожая гэта вясновая раніца! У паветры яшчэ сыра. На лістах вішнякоў вісяць буйныя кроплі начных туманаў. І на платах і на стрэхах ляжыць яшчэ вільгаць. За сялом густа і тучна зеляніцца поле. Загоны перасякаюцца то тонкімі то шырокімі завілінамі дарог. На пагорку стаіць і яшчэ дрэмле вятрак. Ён ужо сіліцца ў..махнуць паднятымі крыламі. Уз..ходзіць сонца і паволі і баязліва паказваецца з-за гарызонту. Першыя прамяні яго кладуцца шырока густым і нібы цягучым золатам. Над стрэхамі хат вывіваюцца лёгкія празрыстыя дымкі. За імі на небе такое ж самае лёгкае ружаватае воблачка. Яму нудна быць аднаму на гэтай галубовай бя..концасці неба. Запрапасціўся недзе свавольнік-вецер. Воблачка не можа ..крануцца. За сялом паказваюцца і рыкаюць каровы, пад..маючы на дарозе за ноч нахападалы і ..лежаны пыл. Неспакойна ў гурце снуецца бык. Сонца пад..маецца над лесам. Яно слізгае па вяршалінах дрэў западае ў прагаліны. Лес пачынае дыміцца густымі пахамі. Бе..клапотна цвыркаюць птушкі. Яны то, гойдаючыся, пырхаюць з дрэва на дрэва то вылятаюць у поле. Там, падняўшыся ў неба, сваім танюткім і не..канчоным звонам заліваюцца жаўранкі...

Якая слаўная ты селавая вечна маладая і вечна пявучая раніца! (181 слова)

Паводле Я. Скрыгана

**122. Запішыце часціцы *не* (*ня*), *ні* з рознымі часцінамі мовы і дзеяслоўнымі формамі асобна ці разам. Расстаўце знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі, параўнальнымі зваротамі, звароткамі. Паўтарыце знакі прыпынку пры дыялогу, пастаўце іх і замяніце, дзе трэба, малыя літары вялікімі.**

Мацвей пачаў дзерці траву разам з каранямі. Выдзер сівец і, падпарадкоўваючыся некаму (не)вядомаму ў сабе, пачаў палкаю калупаць зямлю і дакалупаўся да нечага жывога пругкага. І, (не)вагаючыся, дзе той жа палкай дзе пальцамі неўзабаве ўжо абкопваў гэтае жывое асцярожна, (не)спяшаючыся, размініраваў ляда. І тое было падобна да міны. Яно такое ж (не)бяспечнае і як талерка круглае н.. да чаго (н..)падобнае. Яно было жывое. Мацвей адчуваў гэта. Але (н..)цеплыні (н..)цёку жыцця (н..)чулі пальцы яго. Жар гэты і цёк сыходзілі ад яго самога, ад Мацвея. Гарачы туман засціў яму вочы. І крык быў у ім нарадзіўся ў абуджаным целе яго. Здрадніцкі гаротны крык перахапіў запаленае ўнутраным жарам горла. Крычаў (н..)толькі ён, Мацвей. Крычала і Яно. Тое, што трымаў ён, плакала галасіла як горкае дзіця. Мацвей і сам (не)заўважыў, як выраніў слязу на гэтае жывое і галаснае. Сляза ўпала закіпела і як выпарылася растала.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Э хлопча што ж ты натварыў дзед Дзям’ян з жахам і асуджэннем глядзеў на Мацвея шчаслівы ты і (н..)шчасны. Цяпер тры гады можаш (не)хадзіць у лес. Што я натварыў чаму не хадзіць што гэта хто гэта Грыбніца унучак Маці ўсіх грыбоў Цела яе... (193 словы)

Паводле В. Казько

**123. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя зычныя літары. Запішыце часціцы *не (ня), ні* з рознымі часцінамі мовы асобна ці разам. Расстаўце знакі прыпынку паміж дзейнікам і выказнікам, пры аднародных членах сказа.**

Пале..се… Як шмат з табой сутыкнулася пераплялося, што ідзе ад душы чулай і добрай. Ты выклікаеш у ёй самыя светлыя і чыстыя пачу..ці сваімі людзьмі прыродай, якіх штачасна мы спасцігаем, а спасцігнуць да канца так і (н..)можам. Ты паступова па кропельцы раскрываеш свае таямніцы сваю кладоўку, дзе бага..ця (н..)мерана (н..)злічона. Яно бярэ пачатак з гістарычных далячынь і перадаецца ад пакалення да пакалення, як дар запаве..ны. Гэта духоўнасць самае святое, што (н..)колі (н..)ў якія часы (н..)страчвала сваёй каштоўнасці і (н..)колі (н..)страціць.

Пале..се сапраўдная скарбніца старажытнай самабытнай сялянскай культуры і прыроды. Тут, як (н..)дзе, яшчэ захоўваюцца астраўкі, якіх асабліва (н..)кранула цывілізацыя. Уклад жыцця застаецца такім жа, якім быў на працягу стаго..дзяў. Але іх, гэтых астраўкоў, становіцца ўсё менш і менш. За мінулыя два-тры дзесяціго..дзі пале..скі край пачаў істотна змяняцца. Гарадскую культуру (н..)ма..чыма стрымаць яна бесперашкодна сягае ў самыя глухія вёскі і паселішчы. На месцы старых хат будуюцца шыкоўныя катэджы з усімі выгодамі, асучасніваюцца быт умовы жы..ця.

Турава-Пінская зямля сэрца ўсяго Пале..ся. Гэты цяжкадаступны месцамі ўзгорысты ўрадлівы край захаваў збярог велізарнае бага..це шматвекавой культуры – як сялянскай так і гарадской – рэ..кія дзівоснай прыгажосці і каштоўнасці ланд..шафты вялікую разнастайнасць жывёльнага і раслі..нага свету. (194 словы)

Паводле П. Сабіны

**124. Устаўце прапушчаныя літары на правапіс галосных *е, ё, я* ці *о, э, а*, падоўжаных і падвоеных зычных. Запішыце прыслоўі і неразвіты прыдатак асобна, разам ці праз злучок. Расстаўце знакі прыпынку паміж дзейнікам і выказнікам, пры аднародных членах сказа.**

Матылькі л..гкакрылыя хуткаплы..ныя імгнен..і, расквеча..ныя сон..чнымі промнямі і водсв..тамі летняй поўні… Іх можна не заўважаць. Так большасць людзей і робіць (падумаеш, пырхае штосьці б..зважкае і б..скарыснае побач!). Можна высочваць лавіць і наколваць на тоўсты аркуш паперы, каб потым выхваля..ца перад сябрамі іх хараством і сваёй спрытнас..цю. Можна проста дзівіцца на матылькоў на іх лёгкія р..знакаляровыя іскаркі і потым (сам)насам з

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

сабой разважаць пра вечную вабнасць і н..вытлумачанасць цуду Прыроды. Гэтага ці любога. Тут ужо хто на што здатны. Цуд можа адбывацца (што)міг на вачах, але заўважа..ца н..многімі. Тымі, каго сучаснікі звычайна не разумеюць, (між)волі ці св..дома пазб..гаючы. У лепшым выпадку… Дзівакі! Ды калі прыгл..дзе..ца паназіраць за нараджэ..нем яркага дзівосна прыгожага матылька з брыдкай (н..ўклюды)вусеніцы, то не толькі думка с..гне за межы дакладна акрэсле..най р..альнасці, вы..ўляючы, малюючы новыя яе глыбіні, але і душа. Так, так, душа – што б ні называлі людзі душою! Яна ведала разгадкі ўсіх на свеце та..мніц, таму што была н..см..ротнаю. Н..см..ротнаю не ў тым сэнсе, што магла абмінуць і абмінала смерць, а ў тым, што заўжды адраджалася. Уваскр..сала, здавалася, з нічога – з малой іскаркі св..тла ці змроку, – уваскр..сала ў новым целе, пад новым імем. Хто б, акрамя некалькіх вучоных, назваў імя хоць двух-трох з тыс..ч і тыс..ч матылькоў, якія нараджаю..ца (што)весну? (205 слоў)

Паводле Т. Бондар

**125. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары на правапіс часціцы *не (ня)* з рознымі часцінамі мовы. Расстаўце знакі прыпынку пры пабочных і ўстаўных канструкцыях, паміж дзейнікам і выказнікам.**

Ля агароджы парку Гіта ўбачыла каменне, размаляванае чорнай і чырвонай фарбаю, і ўголас здзівілася. Таксіст ахвотна растлумачыў: здымалі маўляў (н..)даўна фільм пра вайну. Ён нават удзельнічаў у масавай сцэнцы і спадзяецца здымацца будзе яшчэ. У яго на думку рэжысёра вельмі каларытны твар.

– Твар гэта вельмі важная ў кіно, але галоўнае праца, – запярэчыў Сушко.

Таксіст змоўк, потым пачаў насвістваць, даючы зразумець, што ў яго ёсць і свой погляд на акцёрскую працу, і свой клопат і пасажыры яго зусім (не)цікавяць. Гэта ўзрадавала Сушко. Ён мог ціха размаўляць з Гітай, глядзець на яе, хвалюючыся ад блізкасці з жанчынай. Яна ж зусім (н..)даўна гадзіна нейкая не мінула: была зусім (н..)вядомая і (н..)дасягальная. (Н..)дасягальнасць захавалася, асталася, але цяпер яна (не)турбавала, мала яго (не)пакоіла.

Сушко шмат расказваў Гіце пра свой горад на Дзвіне, пра сваю працу. Яна слухала з увагаю. Размаўлялі і пра артыстаў і кінафільмы. Гіта глядзела многія фільмы, мела сваю думку пра іх, магла абараняць яе, рабіла гэта часам вельмі ўдала і добра. Яна спрачаецца (не)дзеля простай спрэчкі, а імкнецца пераканаць яго, Сушко, у правільнасці сваіх высноў. Ён знарок, у душы (не)пагаджаючыся з (не)каторымі яе меркаваннямі, пярэчыў, падахвочваў Гіту кароткімі пытаннямі.

Таксіст першым выбраўся з машыны, стаў на ўзбочыне, аглядаў узорчатыя палі, скрыжаваўшы рукі на грудзях. (206 слоў)

Паводле А. Савіцкага

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

**126. Запішыце прыметнікі, дзеясловы і дзеепрыслоўі з часціцай *не* (*ня*) асобна ці разам. Расстаўце знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі, параўнальнымі зваротамі і пабочнымі словамі.**

Усё мокрае выглядала шэрым халодным (не)прыветным возера хаты на ўзгорку неба над вёскаю ды возерам. Яшчэ і вецер даймаў да костачак хоць і надзею даваў. Можа разгоніць шэры лямец на небе ці прарве ў ім дзірку для сонейка, каб хоць адзін прамень зямлю знайшоў аблашчыў на ёй душу жывую. Антон Стафанавіч туліўся ў лёгкай ветрам падшытай куртачцы глыбей хаваў шыю ў настаўлены каўнер пераступаў з нагі на нагу, грэючыся, і дрыжаў ад холаду. На плячы ён трымаў эцюднік, а ў руках – вялізнае белае палатно для будучага шэдэўра. Вецер бухаў у палатно нібы ў бубен вырываў з рук. Стары ледзь утрымліваў яго, прыціскаючы аберуч да каленяў.

На гэтым беразе ў Васільках, крыху далей, як мы цяпер стаялі, я ўчора нагледзеў лазеньку-векавушку з вышчарбленымі нібы зубы ў бабулі вугламі з латаным-пералатаным дахам і закураным акенцам. Выгляд лазенька мела ўбогі. Ніжні вянец і дзверы паўрасталі ў зямлю. Сама па сабе яна (не)магла прывабіць маё вока. Але над ёй узвышаўся стары клён можа такога самага веку як лазенька. Яго старасць глядзелася ў шыкоўнай красе ды сіле. Клён абгарнуў дамочак сонечна-жаўталістым цяплом добрую ношку зачырванелага золата высыпаў на дах жаўтлява-залаценькі вяночак накінуў на чорны комін падаслаў, (не)шкадуючы, золатам вытканы дыван над акенцам дзвярыма сценамі нават і неба пазалаціў. І я далей (не)пайшоў паставіў эцюднік ды ўзяўся пісаць (н..)хітры пейзажык на (не)вялічкай памерам кардонцы. (222 словы)

Паводле В. Карамазава

**127. Запішыце словы на ўжыванне вялікай літары правільна. Устаўце, дзе трэба, зычныя. Расстаўце знакі прыпынку пры пабочных словах, прапушчаных членах сказа, паміж дзейнікам і выказнікам.**

Цяпер у Вязынцы цэнтр мемарыяльна-літаратурнага (К, к)упалаўскага запаве..ніка. Вязынка ўключана ў (М, м)іжнародны турысцкі маршрут. Праўда большасць турыстаў звычайна а..мяжоўваюцца знаёмствам з філіялам (Л, л)ітаратурнага музея Янкі Купалы. Ён ра..мясціўся ў хаце народнага песняра. І усё ж не менш можа даць знаёмства з мясцовасцю вакол (В, в)язынкі.

Хораша ісці лесам, хораша проста быць у ім, (В, в)язынкаўскім лесе. Прыслухацца да голасу птушак, прыпыніцца і дакрануцца да жаўтлявай ці бялюткай галоўкі кветкі. І зноў ідзеш сабе паціху, нібы захмялелы і ад паху леташняй іглiцы, і ад зляжалага лісця, і ад жывіцы. Яна выступае на ствалах сасонніку бурштынавымі кроплямі-слязінкамі.

Ні з чым не параўнальная (В, в)язынкаўская вясна! Калыска народнага песняра гэта і своеасаблівая калыска ўсёй (Б, б)еларускай паэзіі. Ды ці толькі (Б, б)еларускай?! Уплыў (К, к)упалаўскага генія сёння моцна а..чувальны на ўкраінскую і латышскую, літоўскую і эстонскую – бадай на ўсе літаратуры народаў былога СССР. А хочаш зразумець песняра пабывай на яго радзіме. І

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нягледзячы на тое, што ў (В, в)язынцы жыў Яська Луцэвіч зусім мала, гэты запаве..ны куточак роднай зямлі быў з паэтам у думках і марах, здзяйсненнях і спадзяваннях усё жыццё.

Непаўторная (В, в)язынкаўская вясна! Дзіўная гэта ясная пара. Сонца ўсё шчадрэй пачынае саграваць зямлю, дорачы ёй сваю ласку і цеплыню. Усё наваколле запалымнее мноствам фарбаў, ператворыцца ледзь не ў суцэльны казачны дыван. У ім дзіўна пераплятаюцца самыя розныя колеры і а..ценні. А крыху пазней ля бюста песняра ў (В, в)язынцы, непадалёку ад ягонай хаты, зацвітуць ружы. (225 слоў)

Паводле А. Марціновіча

**128. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары на правапіс прыставак, звонкіх, глухіх і падоўжаных зычных. Расстаўце знакі прыпынку пры аднародных членах сказа.**

Ён іграў пра кахан..е. Толькі вось пра якое – былое ці будучае– Андрэй не ведаў. І ведаць нават у гэтыя хвіліны не хацеў. Па..пёршы далон..ю шырокі ло.. у..дыбіўшы цёмныя віхрастыя валасы з прыкметнай сівізной, ён слухаў музыку. У гуках яе ..пляталіся чака..ні і стрэчы а..дымкі і прызна..ні яшчэ і сваркі і надзеі і крыўды і дарава..ні…

Музыка, то спакойная і плаўная то выбуховая і вірлівая, ..цінала душу вырывала яе з грудзей спрабавала а..несці кудысь далёка-далёка і зноў вяртала наза.., у тленнае цела, бы..цам пераконваючы, што яна служыць чалавеку, але не заўжды падуладная яго жада..ням і летуце..ням. Нават самым запаве..ным ужо амаль ..праў..аным.

Прыжмурваючыся хаваючы вільго..ную павалоку зеленаватых вачэй, Андрэй слухаў захапляльную музыку з асалодаю і цікавасцю з прагай ў..ляцець. Усё роўна як на чым але ў..ляцець… Ды нечакана ўсё змянялася ра..губленас..цю і няўцямнай амаль а..чайнай тугою бе..выходнас..цю, нібы пад ім пачынала раз’я..джацца падлога, расці бяздонная чорная яма, у якую вось-вось праваляцца усе і ўсё.

Андрэй слухаў доўга. Наколькі доўга – не ведаў. Час неяк неўпрыкмет ра..тварыўся і перастаў існаваць.

Над старым польскім горадам Быдгашчам займаўся красавіцкі непрацяглы вечар. Па небакраі каціўся вялікі сонечны шар. Ён напалову закрываў ад людскіх вачэй высокія шпілі старадаўніх касцёлаў і зіха..лівае шкло паверхаў сучасных высо..ных будынкаў. Яго няяркія промні пагой..валіся на вадзе барванелі на стагадовых ца..ляных будынках у..доў.. набярэ..най паблісквалі на голым жалезным чалавеку, што на адной назе прысеў на бя..конца доўгім канаце. (226 слоў)

Паводле А. Разановіча

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**129. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары *е*, *ё* або *я*. Расстаўце знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі, параўнальнымі зваротамі, паміж дзейнікам і выказнікам.**

Алка гэта св..шчэнны дубовы лес гэта цв..рдыня прадз..даўскай веры. Дуб а не якое іншае з..мное дрэва абралі багі. У шуме ягонай вечнай лістоты добра пасылаць свае вітанні і свае загады ўсім тым, хто пакланяецца П..ркунасу. Дуб не баіцца маланак. Ён сын маланкі. Тыс..чагадовы і н..парушны, глядзіць са сваіх вышынь на пакаленні людзей. Н..маўляты спалі ў калысках, падвешаных да ягоных галін, ахінутых ягоным ценем. Зараз яны растуць дужэюць робяцца воямі потым робяцца дз..дамі з белымі як снег бародамі. Дз..ды паміраюць кладуцца лёгкім прысакам на памінальных жоглішчах. Як жалуды прыходзяць на гэту з..лёную з..млю новыя людзі. Прыходзяць шанаваць і берагчы тое, што в..ло па жыццёвай дарозе дз..доў.

Літоўцы пачалі тварыць сваю малітву. Далібор стаяў збоку, таксама зняўшы шапку. У ягоным хрысціянскім Навагародку св..шчэнным дрэвам улюбёным дрэвам Багародзіцы св..тары аб’..вілі белую б..розу. З дуба ж кпліва см..яліся здзекаваліся. Дуб быў дрэвам старой паганскай веры. А паганскае дурное і цёмнае. Той, хто верыць старым багам, таксама дурны і цёмны мае на пл..чах дубовую галаву. Але стаіць побач Міндоўг і кажа, што дуб ахова ўсяго народа. І Далібор верыць яму. Гараць вочы ў літоўцаў. Якія прасветленыя ў іх твары! Літовец ніколі не сс..чэ дуба. Лепш руку сабе адс..чэ ці нагу.

Далібор нахіліўся і ў абл..целай дубовай лістоце ўбачыў жолуд. Ён паспеў ужо прарасці. Моцным белым карэньчыкам жолуд намацаў з..млю. Ён быў падобны да крывулькі. Ягоныя ружовыя тоўстыя с..м..долі рассунуліся расчыніліся. На белы свет асц..рожна зірнула маленькая почачка. Жолуду яшчэ трэба перазімаваць. Калі не закасцянее ён ад марозу, то будучай в..сною шпарка пойдзе ў рост. Але колькі н..спадз..ванак чакае ягонага сынка! (255 слоў)

Паводле Л. Дайнекі

**130. Запішыце прыслоўі і прыназоўнікі асобна, разам ці праз злучок. Расстаўце знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі, параўнальнымі зваротамі і пабочнымі словамі.**

Трава, зялёнаю купінкаю вытыркаючыся з белага снегу, уважліва насцярожана і трывожна глядзела на яго. І ён так(сама) глядзеў на траву. Глядзеў (абы)якава, глядзеў і не бачыў нічога перад сабою але нечакана перахапіў яе зацікаўлены позірк.

Яго ж позірк (да)сюль быў невідушчы. У ім нібы замарожаная сляза стаяў толькі захаладалы сум ад безвыходнасці ад крыўды і знявагі. Яму, гэтаму суму, нават аднаму было цесна ў вачах.

Ён сядзеў на пагорку, падбіўшы пад сябе нагамі цэлую гурбу снегу. Каля яго (сюды)туды хадзілі людзі. Паланёны, седзячы, бачыў толькі іхнія ногі. Яны тапталі снег, таптаалі траву. Траве так(сама) мусіць было і холадна і балюча.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

І ён, як нешта зразумеўшы, моўчкі загаварыў з травою.

Трава такая ж як і людзі. Яна – жывая. І ёй зноў жа баліць. Колькі пакаленняў травы прайшло (па)перадзе вось гэтай купінкі! Кожную вясну нараджаліся травінкі і радаваліся свайму з’яўленню і квітнелі і цягнуліся да сонца а (ў)восень ціха паміралі. Часам і (з)пад сумётаў на марозы і завеі настойліва як і цяпер вось вытыркаліся зялёныя каснічкі.

Паміралі яны. Паміралі іх дзеці. Паміралі ўнукі. Паміралі праўнукі. Колькі ж іх, зніклых (на)заўсёды, ляжыць вось зараз пад снегам у зямлі пад кожнаю травінкаю? Іх, што адцвілі і завялі пасохлі і зрабіліся такімі ж па колеры як і сама зямля...

Яму захацелася паказаць траве, што ён убачыў і зразумеў яе погляд яе ўвагу да сябе. І ён ірвануў да купіны свае рукі. Хацеў пагладзіць траву ці развітацца з ёю а можа і з самім сабою але тут жа застагнаў ад крыўды. Рукі яго былі звязаныя...

Якое ж пакаленне травы жыло тады на зямлі? (257 словы)

Паводле Я. Сіпакова

**131. Запішыце прыслоўі і спалучэнні, блізкія да іх, асобна, разам ці праз злучок. Устаўце, дзе трэба, звонкія або глухія зычныя. Расстаўце знакі прыпынку пры ўстаўных і пабочных словах і сказах, параўнальных зваротах, пры аднародных членах сказа.**

Сонца было ўжо (на)палову за лесам. Промні яго не дасягалі зямлі білі верхам, амаль так як і фары машыны, калі тая (ў)ночы ўзбіраецца з ла..чыны на пагорак.

Антон мусіў адзін ставіць палатку. Рабіў ён гэта з захапленнем, нібы будаваў сапраўдную хату, у якой ім жыць ды жыць.

Ужо добра змяркалася. Яўгеніі ўсё не было. Ён ведаў часта праводзіў ночы ў лугах памагаў бацьку пасвіць коней, як наступае летняя ноч – непрыкметна-хутка маўкліва. Ён бачыў, як нараджаецца золак: пасля поўначы на ўсходзе квола шарэе ву..кая як сту..ка паласа. Праз нейкі час яна (ўсё)роўна як тлее дыміцца, пашыраючыся і даўжэючы, затым проста на вачах вырастае ў барвовае зарыва. Цёплы веер сонечных промняў буйна зіхціць, пераліваючыся ўсімі колерамі вясёлкі.

Ён стаяў ля палаткі зачаравана глядзеў на прыціхлую раку і вельмі хацеў, каб ху..чэй мінала ноч і наступаў жаданы золак. І ён паклонам прывітае яго і нарэшце-такі! пойдзе росным берагам і будзе дыхаць на ўсе грудзі глядзець на ўсе вочы слухаць чуйную цішу лугоў і радавацца.

Антон нарыхтаваў дроў хацеў ужо распальваць цяпельца ды ўспомніў, як яшчэ ў маленстве, гасцюючы з маці ў дзеда Мікіты на Сожы, лавіў плотак проста рукамі. Доўга не раздумваючы, рашыў праверыць сваё рыбацкае шчасце. Балазе цёмна ўжо. Рыба ў такі час падаецца з глыбіні бліжэй да берага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ён (да)волі шумна праплыў сярэдзінай ракі, каб прымусіць акунёў хавацца. Гарбатыя драпежнікі, пачуўшы яго, зашыюцца ў берагавыя шчыліны, ра..віхраць свае іголчатыя грабяні. Паспрабуй тады ўхапіць каторага, не пакалоўшы рукі.

Яўгенія тым часам пракралася да палаткі агледзела ўсё (як)след і засталася задаволеная. Антон нават не забыў прыкалоць да пала..кі яе здымак. (260 слоў)

Паводле А. Масарэнкі

**132. Запішыце словы і часціцу *не* (*ня*) асобна, разам ці праз злучок. Расстаўце знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі, пабочнымі словамі і сказамі.**

Яшчэ ў першыя паездкі свае па раёне Апейка заўважыў, што людзі ў розных месцах жылі (не)аднолькава. Тыя, хто жыў далей ад ракі, між балот ды лясоў, багата чым розніліся ад яго знаёмых (з)малку землякоў – жыхароў пясчанай надпрыпяцкай вёсачкі. Розніліся (не)каторымі звычаямі, розніліся гаворкаю. У блізкіх можна сказаць суседніх сёлах (па)рознаму вымаўлялі адны і тыя ж словы. Здавалася гаварылі на розных мовах! Дзіўна ўсё гэта было чуць. Дзядзькі ці хлопцы аднаго сяла пацяшаюцца з гаворкі жыхароў з другога боку яго! Пацяшаліся, хоць у саміх гаворка была дзіўная. Тыя, з другога боку, так(сама) падсмейваліся з іх! Апейка дабіраўся да разгадкі такога дзіва. Гэта была мабыць памяць далёкай даўніны. Тады вёсачкі на сваіх выспах між багнішч жылі яшчэ больш асобна.

Дзе(ні)дзе сярод палешукоў траплялiся палякі і яўрэі. Палякі прыкмеціў Апейка трымаліся купкамі каля мястэчка, у засценку. Яўрэі ж, акрамя тых, што аселі ў мястэчку, жылі па адным па два ледзь не ў кожным большым сяле, блізка ад дарогі. Палякі корпаліся ў зямлі. Яўрэі так(сама) (н..)рэдка аралі і малацілі. Большасць кармілася розным рамяством – (най)часцей кавальствам ды шытвом. Там(сям) спрабавалі гандляваць. Любілі зямлю гэтую і цыганы. (Н..)дзіва было Апейку бачыць ці калёсы-буданы на грэблях ці шумлівыя табары на выганах. (Н..)раз самога якая-небудзь прычэплівая смуглявая маладзіца хапала на дарозе за руку дабівалася што(сьці) расказаць.

Палякі і яўрэі і цыганы былі тут свае людзі. Палякі часта радніліся з тутэйшымі. Яўрэі мірна курылі на прызбах разам з палешукамі. Амаль у кожным сяле знаходзілася хата, якая давала цыганам цяпло і прытулак на ўсю доўгую зіму. Яны ўсе былі як ручаінкі. Ручаінкі ўліваліся ў вялікую раку і самі станавіліся той жа ракою. (265 слоў)

Паводле І. Мележа

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**133. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары на правапіс канчаткаў і суфіксаў розных часцін мовы і дзеяслоўных формаў. Расстаўце знакі прыпынку пры аднародных членах сказа і пабочных словах.**

Часта, седз..чы за гулкай машынаю роб..чы даўно вядомую работу, Надзя як бы забывалася, дзе яна сядзіць. Перад вачыма паўставала маленькае спякотнае сонца ў надзвычай высокім глыбокім небе блакітнае ўспененае мора. Надзя зноў і зноў чула рытмічны шум хваль шоргат прыбярэжнай галькі, калі з яе збягала ўспенен..ая вада, чула тую мелодыю, якую вечарамі гралі на танцавальнай пляцоўц.., абсаджанай высокімі стромкімі кіпарысамі. Надзя ўсміхалася. Збоку відаць было дзіўна бачыць, як невядома чаму, гледз..чы на цёмную матэрыю, сярод стук.. і ляскат.. машын усміхаецца загарэлая да чарнаты жанчына.

Там, на поўдн.., перад самым ад’ездам у Надзі адбылося знаёмства з адным чалавекам. Ён толькі-толькі прыехаў адпачываць. І хоць яшчэ нічога не было сказана, але Надзя разумела адчувала, што калі б яшчэ які тыдзень пасустракалася з тым чалавекам, то і невядома, чым і як закончылася б тое знаёмства. У іх яшчэ ўсё было на самым пачатку. Многае было няясным і ад таго можа нават і залішне прыгожым загадкавым. Але трэба было ехаць дадом.. пара выходзіць на работу. Надзі было нават крыўдна думалася, што тады, як нешта добрае наладжваецца ў жыцці, ад яго прыходзіцца адракацца, і часта не па сваёй вол... У яе жыцці ўжо неаднойчы было такое. У гэтым Надзі бачылася несправядлівая заканамернасць жыцця. Не можна ведаць, але супраць нічога не паробіш.

Спачатку, у першыя дні пасля водпуск.., Надзя ўсё думала пра таго чалавека. Ёй усё ніяк не верылася, што ніколі з ім не сустрэн..цца. Але мінуў тыдзень другі. Нешта забылася згладз..лася. Ды і твар таго чалавека размыўся ў памяці. Але затое болей яркім зрабілася адчуванне белага спякотнага сонца гарачыні шум.. хвалі. Яны, пабліскваючы пенаю ў святле месяца, набягаюць і набягаюць на цёмны бераг. (268 слоў)

Паводле В. Гігевіча

**134. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары *е, ё, я* або *о, э, а*. Запішыце лічэбнікі словамі. Расстаўце знакі прыпынку пры аднародных членах сказа і абагульняльных словах, пабочных і ўстаўных канструкцыях, параўнаннях.**

Маё маленства дый ці толькі маё прайшло на акопах. Напачатку мы збіралі на іх розныя “трафеі” медныя гільзы алюмініевыя кац..лкі ды іншы вайсковы скарб. Калі на паверхні ўсё было выбрана ды вызбірана, пачалі раскопкі. Капалі ўсё запар і на выбар. Знаходзілі тр..хгранёвыя штыкі н..мецкія ц..сакі розны порах – трубчаты як макароны і кругл..чкаваты падк..вападобны ў шоўкавых м..шэчках. Гэты порах меў якісь с..ладкаваты прысмак. Мы яго часам нават лізалі замест цукерак. Знаходзілі і іншыя трафеі лампадкі сцізорыкі відэльцы струхлелыя н..мецкія часопісы пр..цівагазы. Часам знаходзілі і больш

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

важкія рэчы р..вальверы наганы пісталеты. Вінтоўкі і аўтаматы лічыліся самай звычайнай знаходкай.

Аднаго разу я ўзяў з сабою на тыя акопы і сваіх дзяцей. Мы ішлі на ўскрайку амаль засыпанай п..ском і часам траншэі. Дзе-нідзе нам траплялiся на вочы рэшткі колішніх баёў пан..вечаныя цынкавыя скрынкі з-пад патронаў кручаныя згужавелыя р..мяні асколкі снарадаў вінтовачныя і аўтаматныя гільзы крылатыя хвасты мінаў абцасы пакурчаныя падэшвы. У адным месц..йку мы натрапілі на свежы раскоп. Мяне прывабіла грудка н..рассыпанай зямлі. З яе як мне падалося тырчаў такім м..с..цовым с..рпочкам краёчак кольца з гранаты. Я нахіліўся, каб падняць яго і паказаць гэтае кольца дзецям. Расціснуў грудку – п..сочак асыпаўся і ў маёй руцэ зіхатнуў залаты п..рсцёнак.

В..лікаватага памеру вузенькі 333-й пробы. Проба гэтая не дужа в..лікая, але каштоўнасць п..рсцёнка была не ў ёй. П..рсцёнак меў ініцы..лы Е.І. і дату 30.07.1939. Гэта пэўна ж быў шлюбны п..рсцёнак. Пра гэта сведчыць акуратненькі абрыс сэрца ўнутры п..рсцёнка, прастрэлены анёльскай стр..лой. Гэты п..рсцёнак паводле яго пробы належаў якомусь небагатаму і невысокага рангу г..рманцу.

Гэтыя ініцы..лы і іншыя звесткі на п..рсцёнку даюць мажлівасць адпаведнай н..мецкай службе знайсці больш дакладныя звесткі пра свайго суайчынніка.

Час нашай знаходкі – лета 1972 года. (283 словы)

Паводле У. Содаля

**135. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары на правапіс галосных *е, ё, я,* падоўжаных і падвоеных зычных. Расстаўце знакі прыпынку пры аднародных членах сказа і зваротках.**

За акном вагона ўжо ад самых Баранавіч замільгалі знаёмыя ўзгоркі чэзлыя ўздоўж чыгункі пакурчаныя хвоі мізэрныя сваёй беднасцю пасёлачкі тых, яшчэ першых, дачнікаў густа зарослае чаратамі рэчышча ціхаплын..ай Шчары. Але чым далей, то ўсё выразней прыкметы сапраўднага Палесся. Абапал двухпуткі часцей і часцей трапляюц..а белыя б..рэзнікі адзінокія ў полі дубы н..асушан..ыя гразкія балац..віны. А ў прамежку паміж імі на сухіх пагорках вабяць зрок гонкія грыбныя ды ягадныя бары. Прыгарадны дызель-цягнік, мерна пастукваючы коламі на стыках рэек, пачынае замаруджваць імклівы бег і нарэшце спыняец..а на б..злюдным паўстанку ў в..домай мне змалку вёсцы, чыгуначным палатном раздзелен..ай на дзве неаднолькавыя палавіны.

Дзень добры Цельшына! Пас..ажыры, найбольш хлопцы і дзяўчаты, выкульваюцца на пясчаны насып (ён служыць тут п..р..онам) б..гуць на пераезд. А мне чамусьці мроіцца: у іхнім гаманкім в..сёлым натоўпе матлянуўся на момант і знакаміты паношаны “лапс..рдак” маладога настаўніка Андрэя Лабановіча. Але раптоўная мроя знікла, як і прыйшла. Вочы паступова звыкаюц..а з даўно н..бачан..ымі палес..кімі малюнкамі. Яны набываюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

першапачатковы сэнс. Так, гэта не Цельшына. Гэта славутая вёска Люсіна. Тут у м..сцовай школцы працаваў Якуб Колас. І нават цяпер, на размеж..ы двух стаго..дзяў, яго тут любяць і помняць. Вось і сціплы паўстанак ужо даўным-даўно носіць імя народнага п..сн..ра Беларусі.

Што ні кажы, а ўсё ж прыемна сам-насам прайсціся па любімых сцежках і дарожках. Па іх у такой жа скрушнай адзіноце калісьці блукаў галоўны г..рой трылогіі “На ростанях”, вялікі праўдашукальнік і рамантык Андрэй Лабановіч. У першай частцы твора – аповесці “У палескай глушы” – Якуб Колас надзвычай маляўніча і сакавіта апісаў побыт і звычкі палешукоў іх гаротнае жыц..ё ў часы царызму. Многія жыхары Люсіна сталі прататыпамі непаўторных персанажаў кнігі – тутэйшай інтэлігенцыі і с..лян. Даўнія з’явы і малюнкі выразна паўсталі ў вачах. Ужо на пераездзе нешта змушае прыцішыць крок азірнуц..а вакол сябе. (284 словы)

Паводле В. Гардзея

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**136. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары на правапіс прыстаўных і ўстаўных зычных, галосных *е*, *ё*, *я*, канчаткаў назоўнікаў першага і другога скланенняў. Запішыце неразвітыя прыдаткі са словамі асобна ці праз злучок. Расстаўце знакі прыпынку пры аднародных членах сказа і параўнаннях.**

На..аколле было скрозь залітае белай смуг.. зац..рушанае першым зазімкам. Край неба за ..Оcлікам залаціўся ружавеў. Ад яго залаціліся в..рхі далёкіх дрэў і кустоў. Ц..пленчыя плямы л..жалі па срэбр.. ..Осліка плылі, разам са срэбрам, па вадзе. Пунсавеў чуб самага блізкага і в..лікага куст.. на тым бера.., на круч.., таксама белага, на ўсю шырын.. ..Осліка адбіваўся ў вадзе. Гэты адбітак з кожнае хвіліны ..рчэў ц..плеў. На цёплы тон усюды ў рац.. і ў небе прачынаўся блакіт, прабіваючыся праз срэбра, які ў гэтай настылай раніц.. здаваўся таксама цёплым. Срэбра ўсюды пакрысе та..ла. Я стаяў пад жоўтым курганом цяпер як усё на..окал б..лявым гл..дзеў на ўсход за ..Ослік, чакаючы сон..йк... А думкі былі пра тыя дубы, якіх бачыць ужо не мог пра курганы пад дубамі, якія мог адно ў..віць. Які (асілак)дуб стаяў над жоўта-залацістым волатам! Месца дуб.. было на курган.. чырвоным. Якая б гэта была гармонія колераў! Чырвонае золата зверху і ўнізе. І як бы здорава гл..дзелася пад дубамі папараць, хоць чырвона-..охрыстая хоць з..л..на-кобальтавая ці верас пад ..асеннім дубам ці нават сіва-палыновы курган нават курганчык(ракавінка)! Як утульна адчуў бы с..бе пад дубам, ці той, голы, з п..счанай лысінай – як бы прыгрэлася на лысіне дубовая лісцін... Я пайшоў у бок вёскі. Адышоўшы, спыніўся пагл..дзеў назад адным позіркам акінуў усе курганы разам з дубамі. Дух зан..ло! Ах, Вітольд Ка..танавіч! Вы хораша даводзілі ў сваім лісц.. Антону Бархаткову, што такое сапраўдная жывапісная карціна, колькі чаго ў ёй павінна быць, колькі душы любові пачуцц..! Як я шкадую, што вы не загл..нулі сюды, у гэты куточак свае радзімы, якую так любілі, на ..Ослік у Дз..вашычы на

крывіцка-радзім..цкія курганы пад шмат разоў стагадовымі дубамі. Як бы вы тады адчулі радзіму не толькі ў кантэкс.. жывапіс.. але і ў кантэкс.. тыс..чагадовай гісторыі з..млі вады і неба! Ах і ах, Вітольд Ка..танавіч!.. (292 словы)

Паводле В. Карамазава

**137. Запішыце прыслоўі і складаныя прыметнікі асобна, разам ці праз злучок. Ад складаных прыметнікаў адрознівайце спалучэнні прыслоўяў і прыметнікаў (дзеепрыметнікаў). Расстаўце знакі прыпынку паміж аднароднымі членамі і пры параўнальных зваротах.**

Касачэўскі пайшоў з горада і накіраваўся ў дзюны.

Ноч плыла над халодным морам. Цягнуліся рэдкія перыстыя аблокі. Мора шырокае як душа чалавечая каціла на пясок лянівыя хвалі. Ах мора, мора! Хіба не на гэтых бедных берагах, на якія і дагэтуль выкідваюць хвалі абломкі бурштынавага палаца, зарадзілася казка? Хіба не тут ёй жыць? На гэтыя берагі выходзілі калі(сьці) легіёны паўдзённых воінаў у медных шаломах. Адкуль з'явіліся ў муміях фараонаў вочы з тваіх бурштынаў, мора? Ты ляжала спакойнае (бутэлечна)зялёнае шапацела лёгкімі хвалямі.

Бягуць (быстра)ногія коні марэй. Плывуць па іх незвычайныя караблі. Мора, мора! Ранкам туман укрывае твае воды. Можа, сам лятучы галандзец, карабель, асуджаны вечна вандраваць, імчыць у тваім тумане. Вецер надзімае ружовыя ветразі, падобныя да дзявочых грудзей. Капітан стаіць пад мачтай. Стаяць на пастах нерухомыя маракі. Раз у год, калі ад зямлі павее вецер, з карабля спускаюць шлюпку. Капітан аддае самотнаму рыбаку сумку з лістамі. Лісты нельга даставіць на адрас. Людзі даўно памерлі. Але над прывідамі не імчыць час. І зноў яны раз у год, сумуючы па цёплай зямлі, перадаюць лісты да бацькоў да сёстраў да (з..лата)косых нявест. Бацькі не дачакаліся з мора разудалых сыноў. Сёстры і нявесты выплакалі ўсе вочы.

Мора як люстра. Зноў то прыходзіць, то знікае нячутны сон. Ноч (толькі)толькі пачала святлець. Лёгкі перадранішні туман вісіць над морам. Ён адлівае шэрым (попельна)жамчужным (слаба)блакітным плыве куды(сьці) над чоўнам хістаецца зваецца ў пасмы і ляціць у неба.

І човен пагойдваецца. У такі час прыходзяць сны і здані.

І таму Касачэўскі ў першую хвіліну амаль не здзівіўся, калі непадалёку ад яго амаль зусім нябачны за туманам праплыў сілуэт карабля. Стройны, выцягнуты, з прыгожымі абводамі, з трыма мачтамі, ён плыў (павольна)павольна. На мачтах былі (слаба)напятыя ветразі. Карабель здаваўся б сном, калі б не лёгкія вусы пены. Яны беглі ад яго ў бакі, ледзь бачныя ў тумане. (296 слоў)

Паводле У. Караткевіча

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Адасабленне даданых членаў сказа

**138. Устаўце, дзе трэба, мяккі знак ці апостраф. Расстаўце знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі членамі.**

Ён успомніў пра гэтую паваротку, пра гэты свой лес, пра гэтую дарогу вузен..кую напаўзарослую. Яна аб..ехаўшы пару сасонак хаваецца нібы ратуючыся ад с..пёкі пад густыя і зялёныя шаты дрэў. Сён..ня па старой дарозе каліс..ці дужа бойкай мала хто ез..дзіць. Крыху вышэй прабілі асфал..таваную. Там вось і зараз гудуць машыны. А гэтая ўтравела і, нібы луг, узялася зелянінаю. А ў гады яго маладос..ці гэтая вузен..кая дарожка была адзіным парадным уваходам у лес. Ён ведаў тады кожнае дрэва каля яе. Цяпер жа, калі ён разам з дарогаю ўвайшоў пад шаты, лес, які за гэты час павышэў і пастарэў, здаўся яму чужым. Здавалася, што ў ім ён не ведаў ні дрэў, ні кустоў ля іх, ні с..цежак. С..цежкі пратапталіся ўжо без яго.

Заняты сваімі гарадскімі клопатамі ён рэдка наведваўся ў сваю родную вёску. Там у вёсцы жыў з сям..ёю яго брат. Гос..цю ў любы час было куды прыхінуцца. Відаць, і зараз не выбраўся б ён, не выкруціўся са штодзённай гарадской мітус..ні, калі б не такая важная і прыемная нагода. Сёлета якраз спаўнялася дваццаць год, як яны раз..віталіся са школаю. Увесь іхні клас горача падтрымаў думку сабрацца разам у роднай школе. (187 слоў)

Паводле Я. Сіпакова

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**139. Запішыце часціцы *не (ня), ні* са словамі асобна ці разам. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары на правапіс зычных *д – дз, т – ц*, звонкіх і глухіх, свісцячых і шыпячых, прыстаўнога *в*, падвоеных зычных. Расстаўце знакі прыпынку пры адасобленых азначэннях і акалічнасцях.**

Пры ўвахо..е ў лес дарога раздвойвалася, разбягалася на ..ве дарогі. Адна ву..кая, калёсная спадала ў ла..чыну і прабіралася нізам, праз кусты як бы апаясваючы сабой (не)шырокі чысты лужок. Другая была больш кружная, байчэйшая і ішла верхам па сасновым бары. Карані спрэс павыпіналіся з зямлі цэлымі ..узламі ababітыя, абадран..ыя. На іх усюды выступіла, пазападала пяском і аж запяклася на сонцы смала. Была тут яшчэ і сцяжынка ле..ь прыкметная, ус..лан..ая сасновымі іголкамі і калючымі, бы вожыкі, шышкамі. Яна праставала ..ераз лужок і далей па лесе ўжо віляла між ..вюх даро.. то аддаляючыся то набліжаючыся ад адной да другой. Юля збочыла на гэтую сцяжынку.

Лужок быў (н..)даўна скошан..ы. Яшчэ нават (н..)адрасла атава. Скрозь толькі тырчала густою ш..откаю ..острая пакоша. Сухая, жоўтая на пракосах і зялёная, ядран..ая там, дзе ляжалі рады. Відаць, той, хто тут касіў, добра ведаў, што пакідаць сена ля дарогі нельга. Кожны, хто будзе сюдою ехаць, ускубе ці каню, ці сабе пад бок, каб (н..)мулка было трэсціся на голых драбінах. Таму перавё.. яго дахаты, бо (н..)ста..ка, (н..)коп ні..е паблізу (н..)было віда..ь. Трава

ўсюды была скошан..а чыста, роўна. Нават паабкошван..а была дарога. Толькі ў адным месцы рыжэла (н..)вялічкая лапінка. (192 словы)

Паводле Б. Сачанкі

**140. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары на правапіс мяккага знака, падоўжаных і падвоеных зычных. Расстаўце знакі прыпынку пры адасобленых членах сказа.**

Два хлапчукі качаліся ў пыле вясковай вуліцы весела, сардэчна смеючыся.

Была нядзеля. Па вёсцы хадзіла моладз.. парамі, груп..амі, з пес..нямі, так сабе.

Два пажылыя кавалеры, што пабывалі трохі на с..веце і мнагавата думалі пра сябе, ішлі асобна пра штос..ці важна гаворачы. У ботах-дудках па модзе, у мя..кіх капялюшыках званком. У аднаго за стужку капялюшыка была заткнута хвос..цікам вялікая цёмна-чырвоная вяргіня.

Яны пераступілі цераз вясёлых хлопчыкаў, як пераступаюц.. цераз лужыну, цераз палена або яшчэ што-небудз.. горшае. Хоц.. і маглі абыс..ці іх або, прынамсі, заўважыц.. пад ботамі.

Бол..ш за сорак гадоў прайшло з таго летняга адвячорка. Я забыўся, з кім тады радасна с..мяяўся ў пыле роднай вуліцы. А крыўду нашу вос.. памятаю. Яна ўжо неаднойчы ўсплывае ў маёй памяці жыва і ярка, як тая вялікая, налітая густой крывавай чырван..ю вяргіня. Я ўжо даўно магу з упэўненас..цю меркавац.., што не было ў гутарцы тых двух надз..мутых задавакаў такой глыбіні, якая давала б ім права на пагарду да нас дзяцей пад нагамі. Ды дзе яны такія думкі, што могуц.. мец.. такое права? І я не проста памятаю гэты факт, я не сваю асабістую крыўдачку ўспамінаю, – мне хочацца сказац..:

– Не наступайце на дзіцячы с..мех! Гэтая крыўда не забываецца. (194 словы)

Паводле Янкі Брыля

**141. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары на правапіс падоўжаных і падвоеных, звонкіх і глухіх зычных, галосных *о, э, а*. Расстаўце знакі прыпынку пры адасобленых азначэннях і прыдатках.**

Пагартаем архіт..ктурны “летапіс” еўрапейскай ц..вілізацыі і засяродзімся на яго найбольш яскравых старонках. Дрэва як самы даступны, тан..ы і зру..ны ў апрацоўцы будаўнічы мат..рыял з’яўлялася асноўным у ..тнаграфічным дойлі..стве і на ран..іх ..тапах развіц..я прафесійнай архіт..ктуры многіх еўрапейскіх краін. З яго пачыналася класічнае дойлі..ства Старажытнай Грэцыі. Аднак да нашага часу дайшлі толькі больш трывалыя пабудовы з прыроднага камен..ю. На Балканскім п..ўвостраве і астравах Эгейскага мора, дзе месціліся маленькія дзяржаўныя ўтварэнні Старажытнай Эл..ады, за шмат вякоў да нашай



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

эры было вынайдзена найбольш выдатнае дасягнен..е архіт..ктуры антычнага свету, якое паўплывала на ўсё далейшае развіц..ё еўрапейскай культуры, так зван..ая орд..рная сістэма.

Слова “орд..р” азначае парадак. Так завецца архіт..ктурная мастацка-т..хнічная сістэма ап..рнабэлькавых канструкцый зафіксаван..ых у дакладным парадку і гарманічных суадносінах паміж сабою. Аснову сістэмы складаюць вертыкальныя апоры – калон..ы. Яны па..трымліваюць бэлькавае перакрыц..е прамавугольнага памяшка..ня. З суадносінаў ..лементаў орд..ра відавочны антр..паметрычны характ..р антычнай архіт..ктуры і той факт, што першапачаткова ён склаўся ў драўлян..ых канструкцыях.

Самы архаічны дарычны орд..р мае мас..іўныя калон..ы, невялікія інт..рвалы паміж імі, строгі і просты малюнак д..таляў і з гэтай прычыны выглядае дастаткова сурова. Яго прапорцыі нагадваюць прапорцыі му..чынскага цела, якое трымае цяжар. Па сутнасці, гэта “му..чынскі” орд..р. Таму ён звычайна выкарыстоўваўся старажытнымі грэкамі пры будаўні..тве храмаў прысвечан..ых багам му..чынскага полу. (198 слоў)

Паводле Т. Габрусь

**142. Устаўце патрэбныя літары на правапіс *е*, *ё*, *я*, суфіксаў назоўнікаў, прыметнікаў, дзеясловаў і дзеепрыслоўяў. Расстаўце знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі акалічнасцямі і азначэннямі.**

Гэтым ранкам туман досыць доўга не пакідаў ракі.

Туман парадзеў, разве..ўся. Пачалі выступаць контуры далёкіх дрэў на пагорку за ракой. Раптам я заўважыў лася. Выйшаў ён з прыбярэжнага кустоўя і ўбачыўшы перад сабою раку спыніўся. Пастаяў колькі хвілін, агледз..ўся і рушыў далей. Ішоў ён паважна не сп..шаючыся галаву трымаў высока, ганарліва, быццам баяўся згубіць сваю дарагую карону.

Вось ён наблізіўся да берага і не вагаючыся рашуча ўвайшоў у цёплую ваду. Тыцнуўся ў яе пысай і прагна стаў піць.

Што і казаць, вельмі мал..ўнічая карціна: задумен..ая туман..ая раніца, спакойная роўн..дзь санлівай ракі і вось гэты л..сны волат у ёй.

Аднекуль здалёк дал..цеў стрэл. Лось спалохана скалануўся, н..рвова ўскінуў угору рагатую галаву і, нібы статуя, застыў на месцы гатовы ў любую хвіліну знікнуць у хмызн..ку.

У гэты момант з-за шэрага кустоўя чырвоным колам выкацілася жнівеньскае сонца в..лізнае, яркае. На нейкае імгненне яно апынулася на галінастых рагах жывёлы, заліло іх яркай чырванню.

Якое ж гэта было непаўторнае відовішча! Такое чалавеку суджана, мусіць, убачыць толькі раз у жыцці. Здаецца, гл..дзеў бы на гэты цуд не адводз..чы вачэй і гл..дзеў...

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Нарэшце лось выйшаў з вады. Пастаяў з хвіліну задуменна, энергічна страсянуўся і спакваля пайшоў сваёй дарогай далей. А неўзабаве знік у зарэчным зарасніку. (198 слоў)

Паводле Р. Ігнаценкі

**143. Запішыце прыслоўі асобна, разам ці праз злучок. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары на правапіс звонкіх і глухіх зычных. Расстаўце знакі прыпынку пры адасобленых прыдатках, азначэннях і акалічнасцях.**

Веласіпед у нашым пасёлку быў як для цыгана конь. Моду гэтую, дарэчы, завяла цётка Броня і дзя..ька Альфонс, якія пераехалі да нас аднекуль з Заходняй Беларусі. Нават іх дачка мая равесніца Зойка спрытна круціла педалі. І на яе загарэлых но..ках крута ўздымаліся мы..цы ды калыхалася-гайдалася кароценькая спа..нічка ў такт рухам.

І вось пасля прыезду Ермашкевічаў на веласіпед (па)троху сталі перасядаць дарослыя і дзеці. Адным з апошніх купіў бліскучы нікеліраваны “дарожнік” дзя..ька Іван Чарнічэнка, што пасвіў лю..скіх кароў ды вартаваў на канюшні.

А вось у нашай сям’і веласіпеда не было. Ба..ька не мог ездзіць з адной рукой. На маю про..ьбу купіць мне хаця б “Школьнік” адказваў, што грошай не хапае. Хлопцы і мало..шыя, і старэйшыя за мяне цяпер (што)вечар выпісвалі кругі па нашым завулку. Тыя, хто не даставаў да рамы, (не)як спрытна прыла..каваліся круціць педалі падсунуўшыся (з)боку пад яе віртуозна віхляючыся і выклікаючы шчырае захапленне дарослых.

Мне ж давалі пакатацца, калі хто стаміўся або калі я выйграваў якую(небудзь) гульню. Гулялі ж цяпер толькі на веласіпед. Памятаю першае адчуванне сало..кага палёту, калі мя..ка гудуць па гравійцы тонкія шыны, ногі толькі кончыкамі пальцаў дастаюць да педаляў, паслухмяна вібрыруе пад рукамі руль, а вецер тоненька пасвістае ў вушах ствараючы гэты дзіўны імклівы палёт… (200 слоў)

Паводле Н. Гальпяровіча

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**144. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары на правапіс прыставак, зычных *д – дз, т – ц*, звонкіх і глухіх зычных, прыстаўнога *в*, галосных *е, ё, я*. Расстаўце знакі прыпынку пры адасобленых акалічнасцях і развітых прыдатках.**

Тады гос..ь наш ра..вітаўся і памалу пайшоў на ..уліцу. В..чарэла. Сонца ні..ка стаяла над горадам і лена, холадна біла ў ..окны, у бл..шаныя дахі дамоў зала..іста-барвовым, безуважным св..тлом. Трамвай звінеў не..е. Пах астываючы нагрэты за дзень ас..альт. Пахла, можа, чуйней за ўсё прапыленай ..эглай і фарбай. Была пустою ..уліца. Ён ішоў. Даўгалыгі ..ень лажыўся на дарогу і

соўгаўся паволі нібы папіхаючы с..бе. Раптам побач ці не за драўляным плотам у гаро..чыку кора..ка і жаласна ..іўкнула птушанё. Гэта як бы знак нейкі быў. Ён спыніўся і пагля..еў туды. Халаднаватая чырвань аблівала бэ... Павеў скразн..ковага ветру калыхнуў ліс..е. ..ені ад яго затрап..таліся на жоўтай с..яне. Зноў пры..ішна-жаласна ..іўкала птушанё. Тады ён прыгле..еўся і ўбачыў яго. Ён бачыў яго блі..ка тое сумна натапыранае, шэрае птушанё гэтак б..сконца, н..зразумела а..інокае ў зна..май яму і, мусіць, не першы раз а..любаванай зас..ні па..в..чаровага куста. На с..яне, на ліс..і, на в..лікіх прас..ягах горада памірала сонца. Што а..чуваў, каму і на што жаліўся ён гэты жывы маленькі кам..чок натомлены за ..ень нейкім сваім, зразумелым яму, а мо і зусім н..зразумелым клопатам? Што гэта было: страх, нату..нае чаканне н..пасільнага празарэння ці чуйна, вусцішна і раптоўна а..чутая адасобленас..ь ад усяго і разла.. з усім? І ці не так трывожыць, гняце н..зразумелым нейкім сэнсам і самога чалавека ту..лівая палоска ра..хінутай на заха..е в..чаровай зары? (213 слоў)

Паводле М. Стральцова

**145. Устаўце прапушчаныя літары на правапіс галосных *е, ё, я,* падоўжаных зычных. Запішыце прыслоўі і вытворныя прыназоўнікі асобна, разам ці праз злучок. Расстаўце знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі членамі.**

Зіма абгоніць вос..нь? І няхай абганяе. Павінна ж ад краю да краю зямлі разліцца цішыня! Марозная, чыстая, звонкая яна скуе пагоркі і рачулкі, раскіслыя палі і дарогі. На першы хрусткі л..док іх зацярушыцца, пасыплецца св..тло само н..беснае св..тло кранутае дыханнем б..зме..жа. (У)момант усё пачысцее, зменіцца. Толькі і чакай самых н..в..рагодных дзівосаў! То зачэпіш галінку – і асыпле плечы зіхоткае ад сонца срэбра. То правалішся некуды ніжэй сц..жыны і ўгрузнеш у мя..кім пухавіку разгл..даючы дзівосных снежных матылёў. То паслізнешся на л..дку і спужаеш яркагрудага сн..гіра з мерзлаю ягадкаю каліны ў дзюбцы. То не надзівішся на надыханыя н..бачнымі н..беснымі гасцямі узоры на аконным шкле спрабуючы разгадаць іх малюнак. То змушана ўслухоўваешся ў чароўныя гукі не адразу і ўразумеўшы, што гэта вецер іграе на сваім граб..нцы кранаючы, выцягваючы з-пад снежнага насцілу на страсе празрыста-блакітныя л..дз..шы... Ды ці мала дзівосаў (у)зімку!

Пра в..сну ж і казаць няма чаго! Кожнае імгне..не здараецца хоць н..в..лічкі, але цуд. Цуд першага ручайка, цуд першае праталінкі, цуд першага кволага парастка, першага лісціка, першай пралескі. Цуд абуджэ..ня магутнай ракі, калі ц..мнее, набухае, лопаецца (ў)здоўж па хрыбце і пачынае рвацца, рваць зімовыя ковы лёд узрываючы, ссоўваючы, крышачы аграмадныя крыгі. Яны напаўзаючы адна на адну сунуцца, плывуць за акрыялаю плы..ню да сцен Сафійскага сабора і далей (у)бок далёкага халоднага мора на поўначы. На тое і дадзена жы..цё, каб любіць усё вакол, любіць усім сэрцам адчуваючы кожнае імгне..не радасць і ўдзячнасць за яе. (230 слоў)

Паводле Т. Бондар

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**146. Запішыце прыслоўі, вытворныя прыназоўнікі і часціцы асобна, разам ці праз злучок. Расстаўце знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі членамі.**

Нашы Аўсянікі, калі глядзець на іх (з)боку з гасцінца, тырчалі і яшчэ тырчаць у неба высокімі, (у)летку густымі, зімой бязлістымі кронамі рэдкіх, вышэйшых за будынкі дрэў. Сярод дрэў найвышэйшыя тры магутныя, (не)смяротныя ліпы. Пад адной з іх жыла мая Тоня Латышка. У зямлю наша вёска ўваходзіць умацоўваючыся ствaламі калодзежаў, (не)бачнымі (з)боку слупамі чыстай, сцюдзёнай вады. Адны з гэтых ствалоў даўжэйшыя, ідуць глыбей. (Не)каторыя нават і вельмі глыбока. Два найкарацейшыя называюцца крыніцамі. З іх драўляных нізкіх зрубікаў ваду чэрпаюць проста вядром. Над тым калодзежам, што на вуліцы перад Суботавай хатай, вялікім крукам тырчыць у неба журавель адзін на ўсю нашу вёску.

Гэта рыплівае, калі цягнуць ваду, а то ўсё больш маўклівае шэрае збудаванне было для нас малых і велічным, і таямнічым. Нашу сталасць і сілу яно выпрабоўвала сурова і бязлітасна. (С)пачатку паспрабуй дацягнуцца рукой да вялікага драўлянага вядра, што вісіць на смыку. А ўчапіўшыся за тоўсты край вядра часцей за ўсё мокры ад (не)даўняга акунання трэба(ж) перацягнуць вядро ў свой бок. Потым ужо натужна хапаючыся лапкамі за гладкі і таксама (не)тонкі для хлапечай жмені смык прымусіць усю тую механізацыю задраць (у)гару цяжэйшы канец вагі. Ён самым задам камля ляжыць на перакладзіне. А той канец, які танчэйшы і тырчыць у неба, трэба прыгнуць носам да зруба. Вядро дойдзе да вады і зачэрпне хоць(бы) (на)палавіну. Ну, а (на)верх дастаць? Над зрубам (не)нахілішся: (усё)(такі) страшна. Нас ганялі ад калодзежа амаль усе, хто большы. (233 словы)

Паводле Янкі Брыля

**147. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары на правапіс падоўжаных зычных. Запішыце словы на ўжыванне вялікай літары правільна. Расстаўце знакі прыпынку пры адасобленых членах сказа.**

(У)летку (У, у)сяслаў на чале невялікай сотня дзідаў дружыны выправіўся на (П, п)аўднёвы рубеж саджаць (Г, г)леба на (М, м)енскі сталец.

Ад (П, п)олацка плылі ўверх па (Дз, дз)віне на ла..дзях. Над ветразем пралятaлі з прарэзлівымі крыкамі кнігаўкі, бакасы. Пад аблокамі лунaлі ледзьве варушачы крыламі буслы. З (Дз, дз)віны скіравалі лодкі ў (В, в)улу, грэблі вёсламі ўздоўж абрывістых берагоў, дзе часта чарнелі ямкамі-пячорамі (С, с)трыжыныя гнёзды. З (В, в)улы павярнулі ва (У, у)свейку, нізкія берагі якой парaслі лазняком ды ракітнікам. Ля вытокаў (У, у)свейкі выцягнулі лодкі на бераг, падклалі пад іх восі з коламі, валаклі да (Д, д)руці. За поймай (Д, д)руці цягнуліся сасновыя бары, цёмныя альша..нікі. Хуткаплынная (Д, д)руць прынесла дружыну ў буйны (Д, д)руцк. Тут жыла амаль тысяча месцічаў. Ля сцен горада віравала буйное торжышча, дзе гандлявалі нявольнікамі не толькі з

усёй (П, п)ола..чыны. У (Д, д)руцку князі і старэйшыя кметы пераселі на коней, малодшыя пайшлі пе..шу.

Прасечаны ў гушчарах тракт, па якім дзве павозкі ледзьве маглі размінуцца, вёў на захад да замка на выспе пасярод (Б, б)ярозы-ракі да (Л, л)агожска схаванага ў нізіне між лясных гор да замка (Н, н)яміга на высокай гары на беразе (С, с)віслачы. Ад (Н, н)ямігі зусім блізка ў дзённым пераходзе ляжаў (М, м)енск на ра..цэ (М, м)енка.

**124.** Матылькі – легкакрылыя хуткаплынныя імгненні, расквечаныя сонечнымі промнямі і водсветамі летняй поўні… Іх можна не заўважаць. Так большасць людзей і робіць (падумаеш, пырхае штосьці бязважкае і бескарыснае побач!). Можна высочваць, лавіць і наколваць на тоўсты аркуш паперы, каб потым выхваляцца перад сябрамі іх харastвом і сваёй спрытнасцю. Можна проста дзівіцца на матылькоў, на іх лёгкія рознакаляровыя іскаркі і потым сам-насам з сабой разважаць пра вечную вабнасць і нявытлумачанасць цуду Прыроды. Гэтага ці любога. Тут ужо хто на што здатны. Цуд можа адбывацца штоміг на вачах, ды не заўважацца нямногімі. Тымі, каго сучаснікі звычайна не разумеюць, міжволі ці свядома пазбягаючы. У лепшым выпадку… Дзівакі! Ды калі прыгледзецца, паназіраць за нараджэннем яркага, дзівосна прыгожага матылька з брыдкай няўклюды-вусеніцы, то не толькі думка сягне за межы дакладна акрэсленай рэальнасці, выяўляючы, малюючы новыя яе глыбіні, але і душа. Так, так, душа (што б ні называлі людзі душою!). Яна ведала разгадкі ўсіх на свеце таямніц, таму што была несмяротнаю. Несмяротнаю не ў тым сэнсе, што магла абмінуць і абмінала смерць, а ў тым, што заўжды адраджалася. Уваскрасала, здавалася, з нічога – з малой іскаркі святла ці змроку, – уваскрасала ў новым целе, пад новым імем. Хто б, акрамя некалькіх вучоных, назваў імя хоць двух-трох з тысяч і тысяч матылькоў, якія нараджаюцца штовесну? (205 слоў)

Паводле Т. Бондар

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**125.** Ля агароджы парку Гіта ўбачыла каменне, размаляванае чорнай і чырвонай фарбаю, і ўголас здзівілася. Таксіст ахвотна растлумачыў: здымалі, маўляў, нядаўна фільм пра вайну. Ён нават удзельнічаў у масавай сцэнцы і, спадзяецца, здымацца будзе яшчэ. У яго, на думку рэжысёра, вельмі каларытны твар.

– Твар – гэта вельмі важна ў кіно, але галоўнае праца, – запярэчыў Сушко.

Таксіст змоўк, потым пачаў насвістваць, даючы зразумець, што ў яго ёсць і свой погляд на акцёрскую працу, і свой клопат і пасажыры яго зусім не цікавяць. Гэта ўзрадавала Сушко. Ён мог ціха размаўляць з Гітай, глядзець на яе, хвалюючыся ад блізкасці з жанчынай. Яна ж зусім нядаўна – гадзіна нейкая не мінула! – была зусім невядомая і недасягальная. Недасягальнасць захавалася, асталася, але цяпер яна не турбавала, мала яго непакоіла.

Сушко шмат расказваў Гіце пра свой горад на Дзвіне, пра сваю працу. Яна слухала з увагаю. Размаўлялі і пра артыстаў і кінафільмы. Гіта глядзела многія фільмы, мела сваю думку пра іх, магла абараніць яе, рабіла гэта часам вельмі ўдала і добра. Яна спрачаецца не дзеля простай спрэчкі, а імкнецца пераканаць яго, Сушко, у правільнасці сваіх высноў. Ён знарок, у душы не пагаджаючыся з некаторымі яе меркаваннямі, пярэчыў, падахвочваў Гіту кароткімі пытаннямі.

Таксіст першым выбраўся з машыны, стаў на ўзбочыне, аглядаў узорчатыя палі, скрыжаваўшы рукі на грудзях. (206 слоў)

Паводле А. Савіцкага

**126.** Усё мокрае выглядала шэрым, халодным, непрыветным: возера, хаты на ўзгорку, неба над вёскаю ды возерам. Яшчэ і вецер даймаў да костачак, хоць і надзею даваў. Можа, разгоніць шэры лямец на небе ці прарве ў ім дзірку для сонейка, каб хоць адзін прамень зямлю знайшоў, аблашчыў на ёй душу жывую. Антон Стафанавіч туліўся ў лёгкай, ветрам падшытай куртачцы, глыбей хаваў шыю ў настаўлены каўнер, пераступаў з нагі на нагу, грэючыся, і дрыжаў ад холаду. На плячы ён трымаў эцюднік, а ў руках – вялізнае белае палатно для будучага шэдэўра. Вецер бухаў у палатно, нібы ў бубен, вырываў з рук. Стары ледзь утрымліваў яго, прыціскаючы аберуч да каленяў.

На гэтым беразе ў Васільках, крыху далей, як мы цяпер стаялі, я ўчора нагледзеў лазеньку-векавушку з вышчарбленымі, нібы зубы ў бабулі, вугламі, з латаным-пералатаным дахам і закураным акенцам. Выгляд лазенька мела ўбогі. Ніжні вянец і дзверы паўрасталі ў зямлю. Сама па сабе яна не магла прывабіць маё вока. Але над ёй узвышаўся стары клён, можа, такога самага веку, як лазенька. Яго старасць глядзелася ў шыкоўнай красе ды сіле. Клён абгарнуў дамочак сонечна-жаўталістым цяплом, добрую ношку зачырванелага золата высыпаў на дах, жаўтлява-залаценькі вяночак накінуў на чорны комін, падаслаў, не шкадуючы, золатам вытканы дыван пад акенцам, дзвярыма,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сценамі, нават і неба пазалаціў. І я далей не пайшоў – [,] паставіў эцюднік ды ўзяўся пісаць няхітры пейзажык на невялічкай памерам кардонцы. (222 словы)

Паводле В. Карамазава

**127.** Цяпер у Вязынцы – цэнтр мемарыяльна-літаратурнага купалаўскага запаведніка. Вязынка ўключана ў міжнародны турысцкі маршрут. Праўда, большасць турыстаў звычайна абмяжоўваюцца знаёмствам з філіялам Літаратурнага музея Янкі Купалы. Ён размясціўся ў хаце народнага песняра. І усё ж не менш можа даць знаёмства з мясцовасцю вакол Вязынкі.

Хораша ісці лесам, хораша проста быць у ім, [-] вязынкаўскім лесе. Прыслухацца да голасу птушак, прыпыніцца і дакрануцца да жаўтлявай ці блюткай галоўкі кветкі. І зноў ідзеш сабе паціху, нібы захмялелы і ад паху леташняй ігліцы, і ад зляжалага лісця, і ад жывіцы. Яна выступае на ствалах сасонніку бурштынавымі кроплямі-слязінкамі.

Ні з чым не параўнальная вязынкаўская вясна! Калыска народнага песняра – гэта і своеасаблівая калыска ўсёй беларускай паэзіі. Ды ці толькі беларускай?! Уплыў купалаўскага генія сёння моцна адчувальны на ўкраінскую і латышскую, літоўскую і эстонскую – бадай, на ўсе літаратуры народаў былога СССР. А хочаш зразумець песняра – пабывай на яго радзіме. І нягледзячы на тое, што ў Вязынцы жыў Яська Луцэвіч зусім мала, гэты запаветны куточак роднай зямлі быў з паэтам у думках і марах, здзяйсненнях і спадзяваннях усё жыццё.

Непаўторная вязынкаўская вясна! Дзіўная гэта ясная пара. Сонца ўсё шчадрэй пачынае саграваць зямлю, дорачы ёй сваю ласку і цеплыню. Усё наваколле запалымнее мноствам фарбаў, ператворыцца ледзь не ў суцэльны казачны дыван. У ім дзіўна пераплятаюцца самыя розныя колеры і адценні. А крыху пазней ля бюста песняра ў Вязынцы, непадалёку ад ягонай хаты, зацвітуць ружы. (225 слоў)

Паводле А. Марціновіча

**128.** Ён іграў пра каханне. Толькі вось пра якое – былое ці будучае, – Андрэй не ведаў. І ведаць нават у гэтыя хвіліны не хацеў. Падпёршы далонню шырокі лоб, уздыбіўшы цёмныя віхрастыя валасы з прыкметнай сівізной, ён слухаў музыку. У гуках яе спляталіся чаканні і стрэчы, абдымкі і прызнанні, яшчэ і сваркі, і надзеі, і крыўды, і дараванні…

Музыка, то спакойная і плаўная, то выбуховая і вірлівая, сцінала душу, вырывала яе з грудзей, спрабавала аднесці кудысь далёка-далёка і зноў вяртала назад, у тленнае цела, быццам пераконваючы, што яна служыць чалавеку, але не заўжды падуладная яго жаданням і летуценням. Нават самым запаветным, ужо амаль спраўджаным.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Прыжмурваючыся, хаваючы вільготную павалоку зеленаватых вачэй, Андрэй слухаў захапляльную музыку з асалодаю і цікавасцю, з прагай узляцець. Усё роўна як, на чым, але ўзляцець… Ды нечакана ўсё змянялася разгубленасцю і няўцямнай, амаль адчайнай тугою, безвыходнасцю, нібы пад ім пачынала раз’язджацца падлога, расці бяздонная чорная яма, у якую вось-вось праваляцца ўсе і ўсё.

Андрэй слухаў доўга. Наколькі доўга – [,] не ведаў. Час неяк неўпрыкмет растварыўся і перастаў існаваць.

Над старым польскім горадам Быдгашчам займаўся красавіцкі непрацяглы вечар. Па небакраі каціўся вялікі сонечны шар. Ён напалову закрываў ад людскіх вачэй высокія шпілі старадаўніх касцёлаў і зіхатлівае шкло паверхаў сучасных высотных будынкаў. Яго няяркія промні пагойдваліся на вадзе, барванелі на стагадовых цагляных будынках уздоўж набярэжнай, паблісквалі на голым жалезным чалавеку, што на адной назе прысеў на бясконца доўгім канаце. (226 слоў)

Паводле А. Разановіча

**129.** Алка – гэта свяшчэнны дубовы лес, гэта цвярдыня прадзедаўскай веры. Дуб, а не якое іншае зямное дрэва абралі багі. У шуме ягонай вечнай лістоты добра пасылаць свае вітанні і свае загады ўсім тым, хто пакланяецца Пяркунасу. Дуб не баіцца маланак. Ён [–] сын маланкі. Тысячагадовы і непарушны, глядзіць са сваіх вышынь на пакаленні людзей. Немаўляты спалі ў калысках, падвешаных да ягоных галін, ахінутых ягоным ценем. Зараз яны растуць, дужэюць, робяцца воямі, потым робяцца дзядамі з белымі, як снег, барадамі. Дзяды паміраюць, кладуцца лёгкім прысакам на памінальных жоглішчах. Як жалуды, прыходзяць на гэту зялёную зямлю новыя людзі. Прыходзяць шанаваць і берагчы тое, што вяло па жыццёвай дарозе дзядоў.

Літоўцы пачалі тварыць сваю малітву. Далібор стаяў збоку, таксама зняўшы шапку. У ягоным хрысціянскім Новагародку свяшчэнным дрэвам, улюбёным дрэвам Багародзіцы святары аб’явілі белую бярозу. З дуба ж кпліва смяяліся, здзекаваліся. Дуб быў дрэвам старой паганскай веры. А паганскае [–] дурное і цёмнае. Той, хто верыць старым багам, таксама дурны і цёмны, мае на плячах дубовую галаву. Але стаіць побач Міндоўг і кажа, што дуб – ахова ўсяго народа. І Далібор верыць яму. Гарадь вочы ў літоўцаў. Якія прасветленыя ў іх твары! Літовец ніколі не ссячэ дуба. Лепш руку сабе адсячэ ці нагу.

Далібор нахіліўся і ў абляцелай дубовай лістоце ўбачыў жолуд. Ён паспеў ужо прарасці. Моцным белым карэньчыкам жолуд намацаў зямлю. Ён быў падобны да крывулькі. Ягоныя ружовыя тоўстыя семядолі рассунуліся, расчыніліся. На белы свет асцярожна зірнула маленькая почачка. Жолуду яшчэ трэба перазімаваць. Калі не закасцянее ён ад марозу, то будучай вясною шпарка пойдзе ў рост. Але колькі неспадзяванак чакае ягонага сынка! (255 слоў)

Паводле Л. Дайнекі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**130.** Трава, зялёнаю купінкаю вытыркаючыся з белага снегу, уважліва, насцярожана і трывожна глядзела на яго. І ён таксама глядзеў на траву. Глядзеў абыякава, глядзеў і не бачыў нічога перад сабою, але нечакана перахапіў яе зацікаўлены позірк.

Яго ж позірк дасюль быў невідушчы. У ім, нібы замарожаная сляза, стаяў толькі захаладалы сум ад безвыходнасці, ад крыўды і знявагі. Яму, гэтаму суму, нават аднаму было цесна ў вачах.

Ён сядзеў на пагорку, падбіўшы пад сябе нагамі цэлую гурбу снегу. Каля яго сюды-туды хадзілі людзі. Паланёны, седзячы, бачыў толькі іхнія ногі. Яны таптаді снег, таптаді траву. Траве таксама, мусіць, было і холадна, і балюча.

І ён, як нешта зразумеўшы, моўчкі загаварыў з травою.

Трава такая ж, як і людзі. Яна [–] жывая. І ёй зноў жа баліць. Колькі пакаленняў травы прайшло паперадзе вось гэтай купінкі! Кожную вясну нараджаліся травінкі, і радаваліся свайму з’яўленню, і квітнелі, і цягнуліся да сонца, а ўвосень ціха паміралі. Часам і з-пад сумётаў на марозы і завеі настойліва, як і цяпер вось, вытыркаліся зялёныя каснічкі.

Паміралі яны. Паміралі іх дзеці. Паміралі ўнукі. Паміралі праўнукі. Колькі ж іх, зніклых назаўсёды, ляжыць вось зараз пад снегам, у зямлі пад кожнаю травінкаю? Іх, што адцвілі і завялі, пасохлі і зрабіліся такімі ж па колеры, як і сама зямля...

Яму захацелася паказаць траве, што ён убачыў і зразумеў яе погляд, яе ўвагу да сябе. І ён ірвануў да купіны свае рукі. Хацеў пагладзіць траву ці развітацца з ёю, а можа, і з самім сабою, але тут жа застагнаў ад крыўды. Рукі яго былі звязаныя...

Якое ж пакаленне травы жыло тады на зямлі? (257 слоў)

Паводле Я. Сіпакова

**131.** Сонца было ўжо напалову за лесам. Промні яго не дасягалі зямлі, білі верхам, амаль так, як і фары машыны, калі тая ўночы ўзбіраецца з лагчыны на пагорак.

Антон мусіў адзін ставіць палатку. Рабіў ён гэта з захапленнем, нібы будаваў сапраўдную хату, у якой ім жыць ды жыць.

Ужо добра змяркалася. Яўгеніі ўсё не было. Ён ведаў (часта праводзіў ночы ў лугах, памагаў бацьку пасвіць коней), як наступае летняя ноч – непрыкметна-хутка, маўкліва. Ён бачыў, як нараджаецца золак: пасля поўначы на ўсходзе квола шарэе вузкая, як стужка, паласа. Праз нейкі час яна ўсё роўна як тлее, дыміцца, пашыраючыся і даўжэючы, затым проста на вачах вырастае ў барвовае зарыва. Цёплы веер сонечных промняў буйна зіхціць, пераліваючыся ўсімі колерамі вясёлкі.

Ён стаяў ля палаткі, зачаравана глядзеў на прыціхлую раку і вельмі хацеў, каб хутчэй мінала ноч і наступаў жаданы золак. І ён паклонам прывітае яго, і [(

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

] – нарэшце-такі! – [ )] пойдзе росным берагам, і будзе дыхаць на ўсе грудзі, глядзець на ўсе вочы, слухаць чуйную цішу лугоў і радавацца.

Антон нарыхтаваў дроў, хацеў ужо распальваць цяпельца, ды ўспомніў, як яшчэ ў маленстве, гасцюючы з маці ў дзеда Мікіты на Сожы, лавіў плотак проста рукамі. Доўга не раздумваючы, рашыў праверыць сваё рыбацкае шчасце. Балазе цёмна ўжо. Рыба ў такі час падаецца з глыбіні бліжэй да берага.

Ён даволі шумна праплыў сярэдзінай ракі, каб прымусіць акунёў хавацца. Гарбатыя драпежнікі, пачуўшы яго, зашыюцца ў берагавыя шчыліны, развіхраць свае ігольчатыя грабяні. Паспрабуй тады ўхапіць каторага, не пакалоўшы рукі.

Яўгенія тым часам пракралася да палаткі, агледзела ўсё як след і засталася задаволеная. Антон нават не забыў прыкалоць да палаткі яе здымак. (260 слоў)

Паводле А. Масарэнкі

**132.** Яшчэ ў першыя паездкі свае па раёне Апейка заўважыў, што людзі ў розных месцах жылі неаднолькава. Тыя, хто жыў далей ад ракі, між балот ды лясоў, багата чым розніліся ад яго знаёмых змалку землякоў – [,] жыхароў пясчанай надпрыпяцкай вёсачкі. Розніліся некаторымі звычаямі, розніліся гаворкаю. У блізкіх, можна сказаць, суседніх сёлах па-рознаму вымаўлялі адны і тыя ж словы. Здавалася, гаварылі на розных мовах! Дзіўна ўсё гэта было чуць. Дзядзькі ці хлопцы аднаго сяла пацяшаюцца з гаворкі з другога боку яго! Пацяшаліся, хоць у саміх гаворка была дзіўная. Тыя, з другога боку, таксама падсмейваліся з іх! Апейка дабіраўся да разгадкі такога дзіва. Гэта была, мабыць, памяць далёкай даўніны. Тады вёсачкі на сваіх выспах між багнішч жылі яшчэ больш асобна.

Дзе-нідзе сярод палешукоў трапляліся палякі і яўрэі. Палякі, прыкмеціў Апейка, трымаліся купкамі каля мястэчка, у засценку. Яўрэі ж, акрамя тых, што аселі ў мястэчку, жылі па адным, па два ледзь не ў кожным большым сяле, блізка ад дарогі. Палякі корпаліся ў зямлі. Яўрэі таксама нярэдка аралі і малацілі. Большасць кармілася розным рамяством – [,] найчасцей кавальствам ды шытвом. Там-сям спрабавалі гандляваць. Любілі зямлю гэтую і цыганы. Не дзіва было Апейку бачыць ці калёсы-буданы на грэблях, ці шумлівыя табары на выганах. Не раз самога якая-небудзь прычэплівая смуглявая маладзіца хапала на дарозе за руку, дабівалася пра штосьці расказаць.

Палякі, і яўрэі, і цыганы былі тут свае людзі. Палякі часта радніліся з тутэйшымі. Яўрэі мірна курылі на прызбах разам з палешукамі. Амаль у кожным сяле знаходзілася хата, якая давала цыганам цяпло і прытулак на ўсю доўгую зіму. Яны ўсе былі як ручаінкі. Ручаінкі ўліваліся ў вялікую раку і самі станавіліся той жа ракою. (265 слоў)

Паводле І. Мележа

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**133.** Часта, седзячы за гулкай машынаю, робячы даўно вядомую работу, Надзя як бы забывалася, дзе яна сядзіць. Перад вачыма паўставала маленькае спякотнае сонца ў надзвычай высокім глыбокім небе, блакітнае ўспененае мора. Надзя зноў і зноў чула рытмічны шум хваль, шоргат прыбярэжнай галькі, калі з яе збягала ўспененая вада, чула тую мелодыю, якую вечарамі гралі на танцавальнай пляцоўцы, абсаджанай высокімі стромкімі кіпарысамі. Надзя ўсміхалася. Збоку, відаць, было дзіўна бачыць, як невядома чаму, гледзячы на цёмную матэрыю, сярод стуку і ляскату машын усміхаецца загарэлая да чарнаты жанчына.

Там, на поўдні, перад самым ад’ездам у Надзі адбылося знаёмства з адным чалавекам. Ён толькі-толькі прыехаў адпачываць. І хоць яшчэ нічога не было сказана, але Надзя разумела, адчувала, што калі б яшчэ які тыдзень пасустракалася з тым чалавекам, то і невядома, чым і як закончылася б тое знаёмства. У іх яшчэ ўсё было на самым пачатку. Многае было няясным і ад таго, можа, нават і залішне прыгожым, загадкавым. Але трэба было ехаць дадому, пара выходзіць на работу. Надзі было нават крыўдна, [:] думалася, што тады, як нешта добрае наладжваецца ў жыцці, ад яго прыходзіцца адракацца, і часта не па сваёй волі. У яе жыцці ўжо неаднойчы было такое. У гэтым Надзі бачылася несправядлівая заканамернасць жыцця. Яе можна ведаць, але супраць нічога не паробіш.

Спачатку, у першыя дні пасля водпуску, Надзя ўсё думала пра таго чалавека. Ёй усё ніяк не верылася, што ніколі з ім не сустрэнецца. Але мінуў тыдзень, другі. Нешта забылася, згладзілася. Ды і твар таго чалавека размыўся ў памяці. Але затое болей яркім зрабілася адчуванне белага спякотнага сонца, гарачыні, шуму хваль. Яны, паблісквваючы пенаю ў святле месяца, набягаюць і набягаюць на цёмны бераг. (268 слоў)

Паводле В. Гігевіча

**134.** Маё маленства [–] (дый ці толькі маё) [–] прайшло на акопах. Напачатку мы збіралі на іх розныя “трафеі”: медныя гільзы, алюмініевыя кацялкі ды іншы вайсковы скарб. Калі на паверхні ўсё было выбрана ды вызбірана, пачалі раскопкі. Капалі ўсё запар і на выбар. Знаходзілі трохгранёвыя штыкі, нямецкія цесакі, розны порах – [,] трубчаты, як макароны, і круглячкаваты, падковападобны ў шоўкавых мяшэчках. Гэты порах меў якісь саладкаваты прысмак. Мы яго часам нават лізалі замест цукерак. Знаходзілі і іншыя трафеі: лампадкі, сцізорыкі, відэльцы, струхлелыя нямецкія часопісы, процівагазы. Часам знаходзілі і больш важкія рэчы: рэвальверы, наганы, пісталеты. Вінтоўкі і аўтаматы лічыліся самай звычайнай знаходкай.

Аднаго разу я ўзяў з сабою на тыя акопы і сваіх дзяцей. Мы ішлі на ўскрайку амаль засыпанай пяском і часам траншэі. Дзе-нідзе нам трапляліся на вочы рэшткі колішніх баёў: панявечаныя цынкавыя скрынкі з-пад патронаў, кручаныя, згужавелыя рамяні, асколкі снарадаў, вінтовачныя і аўтаматныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гільзы, крылатыя хвасты мінаў, абцасы, пакручаныя падэшвы. У адным месцейку мы натрапілі на свежы раскоп. Мяне прывабіла грудка нерассыпанай зямлі. З яе, як мне падалося, тырчаў такім месяцовым сярпочкам краёчак кольца з гранаты. Я нахіліўся, каб падняць яго і паказаць гэтае кольца дзецям. Расціснуў грудку – пясочак асыпаўся і ў маёй руцэ зіхатнуў пярсцёнак залаты.

Велікаватага памеру, вузенькі, 333-й (трыста трыццаць трэцяй) пробы. Проба гэтая не дужа вялікая, але каштоўнасць пярсцёнка была не ў ёй. Пярсцёнак меў ініцыялы: Е.І. і дату: 30.07.1939 (трыццатага ліпеня тысяча дзевяцьсот трыццаць дзявятага года). Гэта, пэўна ж, быў шлюбны пярсцёнак. Пра гэта сведчыць акуратненькі абрыс сэрца ўнутры пярсцёнка, прастрэлены анёльскай стралой. Гэты пярсцёнак [,] паводле яго пробы [,] належаў якомусь небагатаму і невысокага рангу германцу.

Гэтыя ініцыялы і іншыя звесткі на пярсцёнку даюць магчымасць адпаведнай нямецкай службе знайсці больш дакладныя звесткі пра свайго суайчынніка.

Час нашай знаходкі – лета 1972 (тысяча дзевяцьсот семдзесят другога) года. (283 словы)

Паводле У. Содаля

**135.** За акном вагона ўжо ад самых Баранавіч замільгалі знаёмыя ўзгоркі, чэзлыя ўздоўж чыгункі, пакурчаныя хвоі, мізэрныя сваёй беднасцю пасёлачкі тых, яшчэ першых, дачнікаў, густа зарослае чаратамі рэчышча ціхаплыннай Шчары. Але чым далей, то ўсё выразней прыкметы сапраўднага Палесся. Абапал двухпуткі часцей і часцей трапляюцца белыя бярэзнікі, адзінокія ў полі дубы, неасушаныя гразкія балацявіны. У прамежку паміж імі на сухіх пагорках вабяць зрок гонкія грыбныя ды ягадныя бары. Прыгарадны дызель-цягнік, мерна пастукваючы коламі на стыках рэек, пачынае замаруджваць імклівы бег і нарэшце спыняецца на бязлюдным паўстанку ў вядомай мне змалку вёсцы, чыгуначным палатном раздзеленай на дзве неаднолькавыя палавіны.

Дзень добры, Цельшына! Пасажыры, найбольш хлопцы і дзяўчаты, выкульваюцца на пясчаны насып (ён служыць тут перонам), бягуць на пераезд. А мне чамусьці мроіцца: у іхнім гаманкім, вясёлым натоўпе матлянуўся на момант і знакаміты паношаны “лапсярдак” маладога настаўніка Андрэя Лабановіча. Але раптоўная мроя знікла, як і прыйшла. Вочы паступова звыкаюцца з даўно не бачанымі палескімі малюнкамі. Яны набываюць першапачатковы сэнс. Так, гэта не Цельшына. Гэта славутая вёска Люсіна. Тут у мясцовай школцы працаваў Якуб Колас. І нават цяпер, на размежжы двух стагоддзяў, яго тут любяць і помняць. Вось і сціплы паўстанак ужо даўным-даўно носіць імя народнага песняра Беларусі.

Што ні кажы, а ўсё ж прыемна сам-насам прайсціся па любімых сцежках і дарожках. Па іх у такой жа скрушнай адзіноце калісьці блукаў галоўны герой трылогіі “На ростанях”, [–] вялікі праўдашукальнік і рамантык Андрэй

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Лабановіч. У першай частцы твора – [,] аповесці “У палескай глушы” – [,] Якуб Колас надзвычай маляўніча і сакавіта апісаў побыт і звычкі палешукоў, іх гаротнае жыццё ў часы царызму. Многія жыхары Люсіна сталі прататыпамі непаўторных персанажаў кнігі – тутэйшай інтэлігенцыі і сялян. Даўнія з’явы і малюнкі выразна паўсталі ў вачах. Ужо на пераездзе нешта змушае прыцішыць крок, азірнуцца вакол сябе. (284 словы)

Паводле В. Гардзея

**136.** Наваколле было скрозь залітае белай смугою(ой), зацярушанае першым зазімкам. Край неба за Ослікам залаціўся, ружавеў. Ад яго залаціліся вярхі далёкіх дрэў і кустоў. Цяплейшыя плямы ляжалі па срэбры Осліка, плылі, [] разам са срэбрам, [] па вадзе. Пунсавеў чуб самага блізкага і вялікага куста на тым беразе, на кручы, таксама белага, на ўсю шырыню Осліка адбіваўся ў вадзе. Гэты адбітак з кожнае хвіліны ярчэў, цяплеў. На цёплы тон усюды: у рацэ і ў небе – прачынаўся блакіт, прабіваючыся праз срэбра, які ў гэтай настылай раніцы здаваўся таксама цёплым. Срэбра ўсюды пакрысе таяла. Я стаяў пад жоўтым курганом, цяпер, як усё навокал, бялявым, глядзеў на ўсход за Ослік, чакаючы сонейка. А думкі былі пра тыя дубы, якіх бачыць ужо не мог, пра курганы пад дубамі, якія мог адно ўявіць. Які асілак-дуб стаяў над жоўта-залацістым волатам! Месца дуба было на кургане чырвоным. Якая б гэта была гармонія колераў! Чырвонае золата зверху і ўнізе. І як бы здорава глядзелася пад дубамі папараць, хоць чырвона-вохрыстая, хоць зялёна-кобальтавая, ці верас пад асеннім дубам, ці нават сіва-палыновы курган, нават курганчык-ракавінка! Як утульна адчуў бы сябе пад дубам, ці той, голы, з пясчанай лысінай – [,] як бы прыгрэлася на лысіне дубовая лісціна. Я пайшоў у бок вёскі. Адышоўшы, спыніўся, паглядзеў назад, адным позіркам акінуў усе курганы разам з дубамі. Дух заняло! Ах, Вітольд Каятанавіч! Вы хораша даводзілі ў сваім лісце Антону Бархаткову, што такое сапраўдная жывапісная карціна, колькі чаго ў ёй павінна быць, колькі душы, любові, пачуцця! Як я шкадую, што вы не заглянулі сюды, у гэты куточак свае радзімы, якую так любілі, на Ослік у Дзевашычы, на крывіцка-радзіміцкія курганы пад шмат разоў стагадовымі дубамі. Як бы вы тады адчулі радзіму не толькі ў кантэксце жывапісу, але і ў кантэксце тысячагадовай гісторыі зямлі, вады і неба! Ах і ах, Вітольд Каятанавіч!.. (292 словы)

Паводле В. Карамазава

**137.** Касачэўскі пайшоў з горада і накіраваўся ў дзюны.

Ноч плыла над халодным морам. Цягнуліся рэдкія перыстыя аблокі. Мора шырокае, як душа чалавечая, каціла на пясок лянівыя хвалі. Ах, мора, мора! Хіба не на гэтых бедных берагах, на якія і дагэтуль выкідваюць хвалі абломкі бурштынавага палаца, зарадзілася казка? Хіба не тут ёй жыць? На гэтыя берагі

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

выходзілі калісьці легіёны паўдзённых воінаў у медных шаломах. Адкуль з’явіліся ў муміях фараонаў вочы з тваіх бурштынаў, мора? Ты ляжала спакойнае, бутэлечна-зялёнае, шапацела лёгкімі хвалямі.

Бягуць быстраногія коні марэй. Плывуць па іх незвычайныя караблі. Мора, мора! Ранкам туман укрывае твае воды. Можа, сам лятучы галандзец, [–] карабель, асуджаны вечна вандраваць, [–] імчыцца ў тваім тумане. Вецер надзімае ружовыя ветразі, падобныя да дзявочых грудзей. Капітан стаіць пад мачтай. Стаяць на пастах нерухомыя маракі. Раз у год, калі ад зямлі павее вецер, з карабля спускаюць шлюпку. Капітан аддае самотнаму рыбаку сумку з лістамі. Лісты нельга даставіць на адрас. Людзі даўно памерлі. Але над прывідамі не імчыць час. І зноў яны раз у год, сумуючы па цёплай зямлі, перадаюць лісты да бацькоў, да сёстраў, да залатакосых нявест. Бацькі не дачакаліся з мора разудалых сыноў. Сёстры і нявесты выплакалі ўсе вочы.

Мора як люстра. Зноў то прыходзіць, то знікае нячутны сон. Ноч толькі-толькі пачала святлець. Лёгкі перадранішні туман вісіць над морам. Ён адлівае шэрым, попельна-жамчужным, слаба блакітным, плыве кудысьці над чоўнам, хістаецца, звіваецца ў пасмы і ляціць у неба.

І човен пагойдваецца. У такі час прыходзяць сны і здані.

І таму Касачэўскі ў першую хвіліну амаль не здзівіўся, калі непадалёку ад яго амаль зусім нябачны за туманам праплыў сілуэт карабля. Стройны, выцягнуты, з прыгожымі абводамі, з трыма мачтамі, ён плыў павольна-павольна. На мачтах былі слаба напятыя ветразі. Карабель здаваўся б сном, калі б не лёгкія вусы пены. Яны беглі ад яго ў бакі, ледзь бачныя ў тумане. (296 слоў)

Паводле У. Караткевіча

## Адасабленне даданых членаў сказа

**138.** Ён успомніў пра гэтую паваротку, пра гэты свой лес, пра гэтую дарогу, вузенькую, напаўзарослую. Яна, аб’ехаўшы пару сасонак, хаваецца, нібы ратуючыся ад спёкі, пад густыя і зялёныя шаты дрэў. Сёння па старой дарозе, калісьці дужа бойкай, мала хто ездзіць. Крыху вышэй прабілі асфальтаваную. Там вось і зараз гудуць машыны. А гэтая ўтравела і, нібы луг, узялася зялянінаю. А ў гады яго маладосці гэтая вузенькая дарожка была адзіным парадным уваходам у лес. Ён ведаў тады кожнае дрэва каля яе. Цяпер жа, калі ён разам з дарогаю ўвайшоў пад шаты, лес, які за гэты час павышэў і пастарэў, здаўся яму чужым. Здавалася, што ў ім ён не ведаў ні дрэў, ні кустоў ля іх, ні сцежак. Сцежкі пратапталіся ўжо без яго.

Заняты сваімі гарадскімі клопатамі, ён рэдка наведваўся ў сваю родную вёску. Там, у вёсцы, жыў з сям’ёю яго брат. Госцю ў любы час было куды прыхінуцца. Відаць, і зараз не выбраўся б ён, не выкруціўся са штодзённай гарадской мітусні, калі б не такая важная і прыемная нагода. Сёлета якраз

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

спаўнялася дваццаць год, як яны развіталіся са школаю. Увесь іхні клас горача падтрымаў думку сабрацца разам у роднай школе. (187 слоў)

Паводле Я. Сіпакова

**139.** Пры ўваходзе ў лес дарога раздвойвалася, разбягалася на дзве дарогі. Адна, вузкая, калёсная, спадала ў лагчыну і прабіралася нізам, праз кусты, як бы апаясваючы сабой нешырокі чысты лужок. Другая была больш кружная, байчэйшая і ішла верхам па сасновым бары. Карані спрэс павыпіналіся з зямлі цэлымі вузламі, абабітыя, абадраныя. На іх усюды выступіла, пазападала пяском і аж запяклася на сонцы смала.

Была тут яшчэ і сцяжынка – [,] ледзь прыкметная, усланая сасновымі іголкамі і калючымі, бы вожыкі, шышкамі. Яна праставала цераз лужок і далей па лесе ўжо віляла між дзвюх дарог, то аддаляючыся, то набліжаючыся ад адной да другой. Юля збочыла на гэтую сцяжынку.

Лужок быў нядаўна скошаны. Яшчэ нават не адрасла атава. Скрозь толькі тырчала густою шчоткаю вострая пакоша. Сухая, жоўтая на пракосах і зялёная, ядраная там, дзе ляжалі рады. Відаць, той, хто тут касіў, добра ведаў, што пакідаць сена ля дарогі нельга. Кожны, хто будзе сюдою ехаць, ускубе ці каню, ці сабе пад бок, каб не мулка было трэсціся на голых драбінах. Таму перавёз яго дахаты, бо ні стажка, ні коп нідзе паблізу не было відаць. Трава ўсюды была скошана чыста, роўна. Нават паабкошвана была дарога. Толькі ў адным месцы рыжэла невялічкая лапінка. (192 словы)

Паводле Б. Сачанкі

**140.** Два хлапчукі качаліся ў пыле вясковай вуліцы, весела, сардэчна смеючыся.

Была нядзеля. Па вёсцы хадзіла моладзь – [] парамі, групамі, з песнямі, так сабе.

Два пажылыя кавалеры, што пабывалі трохі на свеце і мнагавата думалі пра сябе, ішлі асобна, пра штосьці важна гаворачы. У ботах-дудках па модзе, у мяккіх капялюшыках званком. У аднаго за стужку капялюшыка была заткнута хвосцікам вялікая цёмна-чырвоная вяргіня.

Яны пераступілі цераз вясёлых хлопчыкаў, як пераступаюць цераз лужыну, цераз палена або яшчэ што-небудзь горшае. Хоць і маглі абысці іх або, прынамсі, заўважыць пад ботамі.

Больш за сорак гадоў прайшло з таго летняга адвячорка. Я забыўся, з кім тады радасна смяяўся ў пыле роднай вуліцы. А крыўду нашу вось памятаю. Яна ўжо неаднойчы ўсплывае ў маёй памяці, [] жыва і ярка, як тая вялікая, налітая густой крывавай чырванню вяргіня. Я ўжо даўно магу з упэўненасцю меркаваць, што не было ў гутарцы тых двух надзьмутых задавакаў такой глыбіні, якая давала б ім права на пагарду да нас, дзяцей пад нагамі. Ды дзе



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

яны, такія думкі, што могуць мець такое права? І я не проста памятаю гэты факт, я не сваю асабістую крыўдачку ўспамінаю, [] – мне хочацца сказаць:

– Не наступайце на дзіцячы смех! Гэтая крыўда не забываецца. (194 словы)

Паводле Янкі Брыля

**141.** Пагартаем архітэктурны "летапіс" еўрапейскай цывілізацыі і засяродзімся на яго найбольш яскравых старонках. Дрэва як самы даступны, танны і зручны ў апрацоўцы будаўнічы матэрыял з'яўлялася асноўным у этнаграфічным дойлідстве і на ранніх этапах развіцця прафесійнай архітэктуры многіх еўрапейскіх краін. З яго пачыналася класічнае дойлідства Старажытнай Грэцыі. Аднак да нашага часу дайшлі толькі больш трывалыя пабудовы з прыроднага каменю. На Балканскім паўвостраве і астравах Эгейскага мора, дзе месціліся маленькія дзяржаўныя ўтварэнні Старажытнай Элады, за шмат вякоў да нашай эры было вынайдзена найбольш выдатнае дасягненне архітэктуры антычнага свету, якое паўплывала на ўсё далейшае развіццё еўрапейскай культуры, – так званая ордарная сістэма.

Слова "ордар" азначае парадак. Так завецца архітэктурная мастацка-тэхнічная сістэма апорнабэлькавых канструкцый, зафіксаваных у дакладным парадку і гарманічных суадносінах паміж сабою. Аснову сістэмы складаюць вертыкальныя апоры – калоны. Яны падтрымліваюць бэлькавае перакрыцце прамавугольнага памяшкання. У суадносінаў элементаў ордара відавочны антрапаметрычны характар антычнай архітэктуры і той факт, што першапачаткова ён склаўся ў драўляных канструкцыях.

Самы архаічны дарычны ордар мае масіўныя калоны, невялікія інтэрвалы паміж імі, строгі і просты малюнак дэталяў і з гэтай прычыны выглядае дастаткова сурова. Яго прапорцыі нагадваюць прапорцыі мужчынскага цела, якое трымае цяжар. Па сутнасці, гэта "мужчынскі" ордар. Таму ён звычайна выкарыстоўваўся старажытнымі грэкамі пры будаўніцтве храмаў, прысвечаных багам мужчынскага полу. (198 слоў)

Паводле Т. Габрусь

**142.** Гэтым ранкам туман досыць доўга не пакідаў ракі.

Туман парадзеў, развеяўся. Пачалі выступаць контуры далёкіх дрэў на пагорку за ракой. Раптам я заўважыў лася. Выйшаў ён з прыбярэжнага кустоўя і, убачыўшы перад сабою раку, спыніўся. Пастаяў колькі хвілін, агледзеўся і рушыў далей. Ішоў ён паважна, не спяшаючыся, галаву трымаў высока, ганарліва, быццам баяўся згубіць сваю дарагую карону.

Вось ён наблізіўся да берага і, не вагаючыся, рашуча ўвайшоў у цёплую ваду. Тыцнуўся ў яе пысай і прагна стаў піць.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Што і казаць, вельмі маляўнічая карціна: задуменная туманная раніца, спакойная роўнядзь санлівай ракі і вось гэты лясны волат у ёй.

Аднекуль здалёк даляцеў стрэл. Лось спалохана скалануўся, нервова ўскінуў угору рагатую галаву і, нібы статуя, застыў на месцы, гатовы ў любую хвіліну знікнуць у хмызняку.

У гэты момант з-за шэрага кустоўя чырвоным колам выкацілася жнівеньскае сонца – [,] вялізнае, яркае. На нейкае імгненне яно апынулася на галінастых рагах жывёлы, заліло іх яркай чырванню.

Якое ж гэта было непаўторнае відовішча! Такое чалавеку суджана, мусіць, убачыць толькі раз у жыцці. Здаецца, глядзеў бы на гэты цуд, не адводзячы вачэй, і глядзеў...

Нарэшце лось выйшаў з вады. Пастаяў з хвіліну задуменна, энергічна страсянуўся і спакваля пайшоў сваёй дарогай далей. А неўзабаве знік у зарэчным зарасніку. (198 слоў)

Паводле Р. Ігнаценкі

**143.** Веласіпед у нашым пасёлку быў як для цыгана конь. Моду гэтую, дарэчы, завяла цётка Броня і дзядзька Альфонс, якія пераехалі да нас аднекуль з Заходняй Беларусі. Нават іх дачка, [–] мая равесніца Зойка, [–] спрытна круціла педалі. І на яе загарэлых ножках крутыя ўздымаліся мышцы ды калыхалася-гайдалася кароценькая спаднічка ў такт рухам.

І вось пасля прыезду Ермашкевічаў на веласіпед патроху сталі перасядаць дарослыя і дзеці. Адным з апошніх купіў бліскучы нікеліраваны “дарожнік” дзядзька Іван Чарнічэнка, што пасвіў людскіх кароў ды вартаваў на канюшні.

А вось у нашай сям’і веласіпеда не было. Бацька не мог ездзіць з адной рукой. На маю просьбу купіць мне хаця б “Школьнік” адказваў, што грошай не хапае. Хлопцы, [( ] і малодшыя, і старэйшыя за мяне, [ )] цяпер штовечар выпісвалі кругі па нашым завулку. Тыя, хто не даставаў да рамы, неяк спрытна прыладкаваліся круціць педалі, падсунуўшыся збоку пад яе, віртуозна віхляючыся і выклікаючы шчырае захапленне дарослых.

Мне ж давалі пакатацца, калі хто стаміўся або калі я выйграваў якую-небудзь гульню. Гулялі ж цяпер толькі на веласіпед. Памятаю першае адчуванне салодкага палёту, калі мякка гудуць па гравійцы тонкія шыны, ногі толькі кончыкамі пальцаў дастаюць да педаляў, паслухмяна вібрыруе пад рукамі руль, а вецер тоненька пасвіствае ў вушах, ствараючы гэты дзіўны імклівы палёт… (200 слоў)

Паводле Н. Гальпяровіча

**144.** Тады госць наш развітаўся і памалу пайшоў на вуліцу. Вечарэла. Сонца нізка стаяла над горадам і лена, холадна біла ў вокны, у бляшаныя дахі дамоў залаціста-барвовым, безуважным святлом. Трамвай звінеў недзе. Пах,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

астываючы, нагрэты за дзень асфальт. Пахла, можа, чуйней за ўсё прапыленай цэглай і фарбай. Была пустою вуліца. Ён ішоў. Даўгалыгі цень лажыўся на дарогу і соўгаўся паволі, нібы папіхаючы сябе. Раптам побач, ці не за драўляным плотам, у гародчыку, коратка і жаласна ціўкнула птушанё. Гэта як бы знак нейкі быў. Ён спыніўся і паглядзеў туды. Халаднаватая чырвань аблівала бэз. Павеў скразняковага ветру калыхнуў лісцё. Цені ад яго затрапяталіся на жоўтай сцяне. Зноў прыцішна-жаласна ціўкала птушанё. Тады ён прыгледзеўся і ўбачыў яго. Ён бачыў яго блізка, [–] тое сумна натапыранае, шэрае птушанё, гэтак бясконца, незразумела адзінокае ў знаёмай яму і, мусіць, не першы раз аблюбаванай засені падвечаровага куста. На сцяне, на лісці, на вялікіх прасцягах горада памірала сонца. Што адчуваў, каму і на што жаліўся ён, гэты жывы маленькі камячок, натомлены за дзень нейкім сваім, зразумелым яму, а мо і зусім незразумелым клопатам? Што гэта было: страх, натужнае чаканне непасільнага празарэння ці чуйна, вусцішна і раптоўна адчутая адасобленасць ад усяго і разлад з усім? І ці не так трывожыць, гняце незразумелым нейкім сэнсам і самога чалавека тужлівая палоска расхінутай на захадзе вечаровай зары? (213 слоў)

Паводле М. Стральцова

**145.** Зіма абгоніць восень? І няхай абганяе. Павінна ж ад краю да краю зямлі разліцца цішыня! Марозная, чыстая, звонкая, яна скуе пагоркі і рачулкі, раскіслыя палі і дарогі. На першы хрусткі лядок іх зацярушыцца, пасыплецца святло – [,] само нябеснае святло, кранутае дыханнем бязмежжа. Умомант усё пачысцее, зменіцца. Толькі і чакай самых неверагодных дзівосаў! То зачэпіш галінку – і асыпле плечы зіхоткае ад сонца срэбра. То правалішся некуды ніжэй сцяжыны і ўгрузнеш у мяккім пухавіку, разглядаючы дзівосных снежных матылёў. То паслізнешся на лядку і спужаеш яркагрудага снегіра з мерзлаю ягадкаю каліны ў дзюбцы. То не надзівішся на надыханыя нябачнымі нябеснымі гасцямі узоры на аконным шкле, спрабуючы разгадаць іх малюнак. То змушана ўслухоўваешся ў чароўныя гукі, не адразу і ўразумеўшы, што гэта вецер іграе на сваім грабянцы, кранаючы, выцягваючы з-пад снежнага насцілу на страсе празрыста-блакітныя ледзяшы... Ды ці мала дзівосаў узімку!

Пра вясну ж і казаць няма чаго! Кожнае імгненне здараецца хоць невялічкі, але цуд. Цуд першага ручайка, цуд першае праталінкі, цуд першага кволага парастка, першага лісціка, першай пралескі. Цуд абуджэння магутнай ракі, калі цямнее, набухае, лопаецца ўздоўж па хрыбце і пачынае рвацца, ірваць зімовыя ковы лёд, узрываючы, ссоўваючы, крышачы аграмадныя крыгі. Яны, напаўзаючы адна на адну, сунуцца, плывуць за акрыялаю плынню да сцен Сафійскага сабора і далей, у бок далёкага халоднага мора на поўначы. На тое і дадзена жыццё, каб любіць усё вакол, любіць усім сэрцам, адчуваючы кожнае імгненне радасць і ўдзячнасць за яе. (230 слоў)

Паводле Т. Бондар

**146.** Нашы Аўсянікі, калі глядзець на іх збоку, з гасцінца, тырчалі і яшчэ тырчаць у неба высокімі, улетку густымі, зімой бязлістымі кронамі рэдкіх, вышэйшых за будынкі дрэў. Сярод дрэў найвышэйшыя тры магутныя, несмяротныя ліпы. Пад адной з іх жыла мая Тоня Латышка. У зямлю наша вёска ўваходзіць, умацоўваючыся ствaламі калодзежаў, нябачнымі збоку слупамі чыстай, сцюдзёнай вады. Адны з гэтых ствалоў даўжэйшыя, ідуць глыбей. Некаторыя нават і вельмі глыбока. Два найкарацейшыя называюцца крыніцамі. З іх драўляных нізкіх зрубікаў ваду чэрпаюць проста вядром. Над тым калодзежам, што на вуліцы, перад Суботавай хатай, вялікім крукам тырчыць у неба журавель, адзін на ўсю нашу вёску.

Гэта рыплівае, калі цягнуць ваду, а то ўсё больш маўклівае шэрае збудаванне было для нас, малых, і велічным, і таямнічым. Нашу сталасць і сілу яно выпрабоўвала сурова і бязлітасна. Спачатку паспрабуй дацягнуцца рукой да вялікага драўлянага вядра, што вісіць на смыку. А ўхапіўшыся за тоўсты край вядра, часцей за ўсё мокры ад нядаўняга акунання, трэба ж перацягнуць вядро ў свой бок. Потым ужо, натужна хапаючыся лапкамі за гладкі і таксама не тонкі для хлапечай жмені смык, прымусіць усю тую механізацыю задраць угару цяжэйшы канец вагі. Ён самым задам камля ляжыць на перакладзіне. А той канец, які танчэйшы і тырчыць у неба, трэба прыгнуць носам да зруба. Вядро дойдзе да вады і зачэрпне хоць бы напалавіну. Ну, а наверх дастаць? Над зрубам не нахілішся: усё-такі страшна. Нас ганялі ад калодзежа амаль усе, хто большы. (233 словы)

Паводле Янкі Брыля

**147.** Улетку Усяслаў на чале невялікай, сотня дзідаў, дружыны выправіўся на паўднёвы рубеж саджаць Глеба на менскі сталец.

Ад Полацка плылі ўверх па Дзвіне на ладдзях. Над ветразем пралятали з прарэзлівымі крыкамі кнігаўкі, бакасы. Пад аблокамі лунaлі, ледзьве варушачы крыламі, буслы. З Дзвіны скіравалі лодкі ў Вулу, грэблі вёсламі ўздоўж абрывістых берагоў, дзе часта чарнелі ямкамі-пячорамі стрыжыныя гнёзды. З Вулы павярнулі ва Усвейку, нізкія берагі якой параслі лазняком ды ракітнікам. Ля вытокаў Усвейкі выцягнулі лодкі на бераг, падклалі пад іх восі з коламі, валаклі да Друці. За поймай Друці цягнуліся сасновыя бары, цёмныя альшаннікі. Хуткаплынная Друць прынесла дружыну ў буйны Друцк. Тут жыла амаль тысяча месцічаў. Ля сцен горада віравала буйное торжышча, дзе гандлявалі нявольнікамі не толькі з усёй Полаччыны. У Друцку князі і старэйшыя кметы пераселі на коней, малодшыя пайшлі пешшу.

Прасечаны ў гушчарах тракт, па якім дзве павозкі ледзьве маглі размінуцца, вёў на захад – [,] да замка на выспе пасярод Бярозы-ракі, да Лагожска, схаванага ў нізіне між лясных гор, да замка Няміга на высокай гары

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

на беразе Свіслачы. Ад Нямігі зусім блізка, у дзённым пераходзе, ляжаў Менск на рацэ Менка.

Паўсюль полацкаму валадару і яго дружыне ладзілі шчодры пачастунак. Усяслаў найперш аглядаў умацаванні. Калі меркаваў, што сцены нетрывалыя, біў намесніка па вуху. Калі лічыў, што горад аблогу вытрымае, моўчкі задаволена ківаў.

Глеб суправаджаў бацьку, моўчкі слухаў, пазіраў, а ў самога перад вачыма стаяла матуля. Як жа яна плакала, бедавала, галасіла па ім, калі з'язджаў з Бельчыц! Нібы не на княжанне, а на новую вайну праводзіла… Як жа не хацелася Глебу пакідаць бацькоўскі дом!.. (235 слоў)

Паводле Я. Конева

**148.** У старажытнай Рэчы Паспалітай, часткай якой з'яўлялася наша старажытная дзяржава Вялікае Княства Літоўскае, важным саслоўем была шляхта. Менавіта шляхціцы валодалі асноўнымі дэмакратычнымі свабодамі – [:] правам абіраць і быць абранымі ў органы дзяржаўнага кіравання, вызначаць унутраную і знешнюю палітыку. Іх лад жыцця, стыль паводзінаў былі мадэльнымі для гараджан, местачкоўцаў, заможных сялян. Галоўнымі адметнымі рысамі шляхты, акрамя, зразумела, наяўнасці дваранства, было права мець уласны герб і насіць зброю.

Сярод старашляхецкай зброі Рэчы Паспалітай шабля займала выключнае месца. Гэты від халоднай зброі ператварыўся ў сімвал шляхецкага саслоўя.

Пра вялікае значэнне шаблі ў светапогляднай сістэме шляхты, сарматызме сведчыць яе ўваходжанне ў рытуалы, у тым ліку і сакральныя, каталіцкія, узнікненне досыць спецыфічных звычаяў, такіх, як выманне шаблі да паловы з ножнаў перад Евангеллем падчас службы ці праслухоўванне імшы ў поўным узбраенні з узнятай шабляй. Пры пахаванні знакамітага нябожчыка, які, на думку грамадскасці, не адпавядаў паняццям гонару, годнасці, разам з сімваламі ўлады пячаткай ламалі і яго зброю. Увогуле, вялікае значэнне шаблі для шляхты звязана з тым, што яна ўвасабляла ваенную справу, а таксама асабістую свабоду і недатыкальнасць – асноўныя пастулаты шляхецкага менталітэту.

Вялікай павагай ва ўсім свеце карысталася турэцкая шабля з дамаскай сталі. На ёй звычайна былі выгрывіраваны цытаты з Карана. Найбольш крывая шабля называлася серпентына.

Ніколі не выкарыстоўвалася ў баі і вельмі рэдка ўжывалася ў паядынках парадная карабэла, імпартаваная з-пад Багдада ці мясцовай вытворчасці. Гэта была лёгкая, вузкая зброя з багата аздобленай ручкай з агату, аметысту, замацаваная залатымі цвікамі. Карабэла досыць часта сустракаецца на парадных магнацкіх партрэтах. (240 слоў)

Паводле І. Вугліка

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**149.** Пакуль горад захоўвае хоць адну адмету сваёй маладосці, ён не скарыўся ўзросту. Таму і выглядае Нясвіж юнаком, нягледзячы на стагоддзі.

З гэткаю супярэчлівасцю мусіш-такі згадзіцца і, уважаны неспадзяванай высновай, пачынаеш лепш узірацца ў абрысы ацалелай тут старасветчыны. Яна – [( ] зноў жа парадокс! – [ )] сведчыць пра пару малалецтва і сталасці горада.

Жыхары Нясвіжа заўсёды любілі казаць – [] трохі з гумарам, трохі з іроніяй: “У Нясвіжы, як у Парыжы”.

Я не быў у Парыжы, таму зрэдзьчас еду ў Нясвіж – [] дабраць нязбытных уражанняў, адчуць цеплатворную плынь часу і быццам скінуць з сябе вагу стагоддзяў.

Калі першы раз трапляеш сюды і калі твая душа прагне прыемных эмоцый, падбадзёрыцца ўражаннямі нязведанага, зазвычай лёгка, без экскурсавода зарыентуешся, куды павярнуць, каб патрапіць у самае сэрца Нясвіжа. І замак, і задумлівы парк, і люстэркі азёраў прыцягваюць, як магніт, як праява.

З першага кроку жывеш прадчуваннем цуду. Хроніка Нясвіжа тоіць у сабе незлічонае мноства падзей, здарэнняў, сведчанняў, фактаў. Можа, таму і гістарычныя вулкі ў атачэнні знакамітых муроў, і сцежкі слыннага парку, падуладныя ўражліваму слыху, ажываюць з гукамі даўніны. А насустрач выходзяць, нібы павітацца з табою, постаці-здані. Тысячы таямніц чакаюць людскіх дакрананняў да гісторыі. Тысячы лампадак гатовыя ўспыхнуць у памяці нашчадкаў.

У Нясвіжы створаны нацыянальны гісторыка-культурны запаведнік “Нясвіж”. Ён будзе ўяўляць сабою самавітую структуру музейнага тыпу. Мяркуецца зрабіць “маленькі Парыж” цэнтрам айчыннага і міжнароднага турызму з цэлым шэрагам новаўтвораных аб’ектаў: галерэяй нацыянальнага мастацтва, тэатрам драмы, оперы, балета, архівам, бібліятэкай, музейнымі экспазіцыямі.

Нясвіж сілкуе творчай энергіяй не толькі сваіх жыхароў, але ўсіх, хто едзе сюды дакрануцца да спадчыны, пабыць сам-насам з красамоўнай гісторыяй. У Нясвіжа [–] годная будучыня. Гэты горад заслужыў у нашчадкаў пашану. (250 слоў)

Паводле В. Дранчука

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**150.** Лось раптам падагнуў пад сябе пярэднія ногі, крутнуўся на бок, падняўшы галаву з рагамі, і ўстаў на заднія. Пярэднія ў яго былі цяпер сагнутыя. Ён, дрыжучы, апіраўся на калені. Пастаяўшы на каленях, задзёр яшчэ вышэй галаву, паклаўшы на спіну рогі, што дзве шырокія лапаты, зарыкаў моцна, як толькі мог, балюча і жаласна, што карова, калі ад яе адсаджваюць цяля, пасля ціха, задыхаючыся і круцячы галавой у бакі. Тады раптам асеў, грукнуўшы грудзьмі на карэнне і ўдарыўшы пысай аб зямлю, і сціх, лежачы на жываце і на падкурчаных пярэдніх нагах. Пасля ўсхапіўся зноў на заднія ногі і

скочыў уперад, дзе не было людзей, неяк піхнуў сябе аднымі заднімі нагамі. Пярэднія ў яго былі сагнутыя ў каленях і цягнуліся па зямлі. Лось адразу ўпаў на траву ў свежым месцы і стаў біць нагамі па зямлі. З-пад яго паляцеў мокры мох і дзёран, сыпанула шорсткім жвірам...

Пасля лось зноў стаў на заднія ногі і, ужо не могучы падняць ад зямлі пярэднія, пачаў круціцца на адным месцы, як ушчаміўшы ў што галаву. Абваліўшыся на зямлю, ён качаўся з боку на бок і страсаўся, як ад вады. З-пад яго зноў паляцела зямля і пырскі ад крыві. Біў заднімі нагамі, рвучы з карэннем малады сасоннік і рыючы ля сябе яму. Ён ляжаў ужо на адным баку, не пераварочваючыся, і біў нагамі толькі ля сябе пад бокам. Ногі ў яго дрыжалі і выпросталіся, як ад сутаргі... Пасля ён зноў ірвануўся з зямлі, хочучы ўстаць на ногі, і ссунуўся ў яму, якую вырыў нагамі збоку... Застагнаў ціха і цяжка, што чалавек. (253 словы)

Паводле І. Пташнікава

**151.** Ната, адклаўшы падручнікі, якія перагартала больш па звычцы, чым з нейкай асаблівай патрэбы [(] – і так усё пройдзенае ў школе памятала [)], – пазірала ў сцемненае, зацягнутае смугою акно нядоўга. Думаць лепш пра дзень светлы, зусім па-вясноваму сонечны! Там жылі яе мары. Там расквечвала мары сонца, аблепленае яркімі матылькамі самых розных памераў і колераў, [–] нават такіх, якіх ніколі не страчала, нават такіх, якіх проста не бывае ў прыродзе.

Сонца, аблепленае матылькамі, выклікала ўсмешку – [( ] трэба ж такое ўявіць! [ ).] Але вобраз спадабаўся. Наце захацелася яго намаляваць, пакінуць на паперы. І яна пацягнула да сябе альбом для чарчэння, пашукала паглядам алоўкі ці фламастары. Знайшоўшы, задумалася. Убачыць да самай тонкай павуцінкі сонечнага промня на крылцах матылька, убачыць уяўленую карціну душою, з дапамогай уяўлення – адно, выказаць, занатаваць – другое. Тут ці майстэрства неймавернае патрабавалася, ці подых натхнення Божага. Калі не рука, а душа маляваць стане. Вось калі не паддавацца сумненням, а паспрабаваць…

Ната згрэбла свае няхітрыя прылады і, прыціскаючы іх да сябе, пайшла да кушэткі – [,] далей ад акна, якое не-не і прыцягвала ўвагу. Залезла на кушэтку з нагамі, паёрзала, усаджваючыся на падкручаных нагах зручней, і паспрабавала аднавіць у памяці ўбачанае з дапамогаю ўяўлення сонца, [–] дзівоснае і па яркасці, і па незвычайнай злагоджанасці. Быццам не яно толькі што выпальвала, выпякала дзесьці пустыню, быццам не ім справакаваная спёка да донца выпіла апошнюю ручаінку жыцця там, далёка адсюль, неўявіма далёка ад бясснежнага сцюдзёнага сакавіка. Мяжою паміж далёкай гарачай пустыняю і сцюдзёным вечарам за акном служыла толькі яе думка. Ната разумела і ўсё ж памкнулася рассунуць, пашырыць азначаны прагал, каб даць месца мары і асвятліць яе лагодным, аплеценым шматкаляровымі матылькамі сонцам. (258 слоў)

Паводле Т. Бондар

**152.** Даўней на гэтым месцы, мабыць, было возера. Назва лугу засталася незямная – Возера. Пачынаўся луг адразу ў канец вёскі шырока і роўна. Толькі два ўзгорачкі высіліся над ім – палянкі.

Дні тады стаялі цёплыя, нават душнаватыя. Не толькі луг, але і ўся вёска пахла прывялаю атаваю, а потым і сухім сенам. Сена, каб схаваць у хлявы да дажджу, вазілі цэлы дзень. Вазілі нават познім вечарам, калі стала цёмна і ўзышоў вялікі месяц.

Ад лёгкае расы памякчэла пад нагамі кароткая тугая пакоша. Зажурыўся белаватым смуткам нешырокі начны далягляд з рэдка пастаўленымі копамі і адзінокімі кустамі, што раслі бліжэй да рэчкі.

Якраз тут, на Возеры, была глыбокая завоіна – шырокі плёс, дзе і конь мусіў плысці. Вакол завоіны раслі кусты. Нізкі бераг быў выслізганы і вытаптаны мокрымі нагамі.

Каляда пастаяў, дзівячыся спакойнаму густому водсвету восеньскае вады, потым асцярожна, мацаючы нагамі хрумсткае, з тугога мыльцу дно, ступіў у ваду, густую ўжо, восеньскую. Сцепануўся ад холаду, але ішоў наперад, туды, дзе роўна, як шкло, ляжаў водсвет поўні. Нейкая слодыч была ў жаданні паплысці, парушыць гэтую спакойнасць. Забіла белая месячная сцяжына на вадзе. І Каляда, як толькі пачуў, што лізнула нагу слізкая пасма водарасцяў, плашчаком упаў на ваду і паплыў шырокімі моцнымі сажонкамі, прыслухоўваючыся толькі да вады і да свайго здаровага кожным мускулам цела.

Калі вярнуўся назад, стаў на беразе, не адчуваючы холаду. Горача і молада звінела ў целе кроў. Радасна было глядзець, як хвалюецца і не можа супакоіцца і застыць вада.

І толькі калі адзеўся, расчасаў валасы, адчуў, што над рэчкаю выплывае туман. Сцепануў плячыма і пайшоў да вёскі. Чым далей адыходзіў ад рэчкі, тым больш здавалася, што зноў уваходзіў у ваду, толькі цёплую і нячутна мяккую. (270 слоў)

Паводле А. Жука

**153.** Колькі сябе помніць, Альяс рос у старой прадзіраўленай каструлі. Эмаль на ёй месцамі абабілася, адвалілася адно вушка. Але гэта мала турбавала Альяс: на такія дробязі ён не зважаў. Галоўнае, у каструлі ўтульна было яго карэньчыкам. Яны вольна пачуваліся тут, з часам першапілі-аблыталі ком зямлі і ўраслі б у сценкі, ды гэтага ўжо не дазволіў метал, з якога каструля была зроблена.

Спрабуючы яго на трываласць, упартыя карэньчыкі ўсё роўна што ёсць моцы налягалі на сценкі. Прабіць іх не прабілі, але ж так упёрліся, што сталі

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

ледзь не адным цэлым са сваім вазонам. Захацеў бы хто парушыць гэту еднасць – прыйшлося б пакалечыць карэнне, выдзіраючы кветку.

Альясу было ўсё міла, што рабілася за акном: і зіма з крыштальнымі ледзяшамі, і вясновы капеж з падстрэшша, і летняя спёка, калі гаспадыня мусіла даставаць з вокнаў адну з падвойных рам… Але найбольш Альяс усё ж любіў восень. Калі лісце на клёнах мяняла зялёны колер на золата і барву, Альясу здавалася, што гэта зоркі, асыпаючыся на зямлю, заблыталіся ў галінах дрэў…

Гаспадыня шанавала Альяс і пеставала ўвагай. З яго лісця яна рабіла лекі і сцвярджала, што лепшага сродку для любых хвароб, чым сок з Альяса, запараны з мёдам, не бывае. А яшчэ, справіўшыся, яна любіла сесці ля акна і глядзець на двор, ціхенька разважаючы ўслых. І, бывала, разам са стоенай скрухай-жальбай капалі на лісце Альяса ціхія, прыхаваныя ад староннiх вачэй слёзы.

Альяс любіў сваю гаспадыню і не перажыў бы расстання з ёй. І таму ён шчыра радаваўся, калі гаспадыня брала флянсы, [–] яго гадаванцаў, [–] перасаджвала іх у невялікія гаршчочкі і, крыху падрасціўшы, адвозіла на кірмаш прадаваць. Альясу было ўсцешна ад думак, што дзеці яго пабачаць свет. І, магчыма, у патрэбную хвіліну прыдадуцца са сваімі гаючымі сіламі новым гаспадарам. (283 словы)

Паводле А. Масла

**154.** Папаўненню слоўнікавага складу беларускай мовы за кошт лексікі іншамоўнага паходжання садзейнічала і распаўсюджанне на Беларусі ідэй Рэфармацыі. Успрыняцце гэтай перадавой для таго часу гуманістычнай плыні, цесна звязанай з заходнееўрапейскімі і польскімі рэфармацыйнымі плынямі, было падрыхтавана ўсім ходам сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця Вялікага Княства Літоўскага. Знаходзячы на беларускіх землях усё больш сваіх прыхільнікаў, Рэфармацыя садзейнічала развіццю асветы, навукі, кнігадрукавання, павышала цікавасць адукаваных колаў да антычнай культуры і культурнай спадчыны еўрапейскага Адраджэння. Дзякуючы перакладчыцкай дзейнасці прадстаўнікоў беларускай культуры [,] чытачам Беларусі сталі даступнымі многія творы заходнееўрапейскай мастацкай, навуковай і гістарычнай літаратуры.

Культурны ўздым на Беларусі, выкліканы рэфармацыйным рухам, павялічыў імкненне мяшчанскай і шляхецкай моладзі да набыцця вышэйшай адукацыі. Паколькі ўласных вышэйшых навучальных устаноў у Вялікім Княстве Літоўскім да другой палавіны шаснаццатага стагоддзя не было – [(] першы ўніверсітэт быў адкрыты ў тысяча пяцьсот семдзесят восьмым годзе ў Вільні, на базе езуіцкай калегіі [)], – маладыя людзі накіроўваліся па ўніверсітэцкія веды ў заходнія краіны. Гэта падтрымлівалася і тагачасным заканадаўствам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Традыцыйнымі цэнтрамі навучання ўраджэнцаў Вялікага Княства Літоўскага былі Кракаўскі, Падуанскі, Пражскі, Балонскі, пазней Вітэнбергскі, Лейпцыгскі, Кёнігсбергскі, Лейдэнскі, Нюрнбергскі і іншыя ўніверсітэты Еўропы. Большая частка беларусаў атрымлівала ўніверсітэцкую адукацыю ў Кракаве. Там, па архіўных даных, толькі зарэгістраваных студэнтаў з Літвы і Беларусі налічвалася дзвесце дваццаць дзевяць чалавек.

Універсітэцкая адукацыя, якую беларусы атрымлівалі за мяжой, пастаянныя кантакты з прадстаўнікамі заходнееўрапейскай культуры і навукі павышалі інтэлектуальны ўзровень грамадства, павялічвалі ў краіне колькасць знаўцаў замежных моў. Гэта спрыяла пранікненню іншамоўнай лексікі ў беларускую мову.

Беларусы на працягу сваёй гісторыі сутыкаліся з прадстаўнікамі іншых народаў. Зносіны насельніцтва беларускіх зямель, як і рускіх, і ўкраінскіх, з цюркскімі народамі пачаліся ўжо ў старажытнарускую эпоху ў выніку сутыкнення з мангола-татарскімі ордамі. Праўда, на раннім этапе цюркска-ўсходнеславянскіх моўных кантактаў цюркскі лексічны ўплыў адбіўся ў першую чаргу на старажытнарускіх дыялектах. Яны ляглі пасля ў аснову старарускай мовы. (288 слоў)

Паводле А. Булыкі

**155.** Не магу без хвалявання глядзець на жнівеньскія лугі. Надта шмат у іх нейкай неразгаданай і прыціхлай задуменнасці і красы.

Буйныя травы скошаны. На месцы шырокіх пракосаў па ўсёй пройме ракі, наколькі можна ахапіць вокам, узняліся стагі духмянага сена. І кожны па-свойму адметны, як майстар, што скідаў яго.

Вось адзін. Паглядзіш на яго збоку, а ён высокі, зграбны, быццам з бронзы статуэтка на зялёным аксаміце лугу стаіць. А гэты чамусьці нагадвае стройную маладую дзяўчыну з капрызна падціснутымі вуснамі. Побач – [] стог-волат – [,] дзябёлы, статны, з па-заліхвацку насунутай набакір шапкай. А вось стог-дзядок – [,] нізенькі, каржакаваты, з маленькай гарбінкай на спіне.

Надзвычай шмат на жнівеньскіх лугах розных птушак. Ці то, глядзіш, шэрая варона сядзіць на жэрдцы стога, пра штосьці задумаўшыся, або ястрабок мышэй высочвае з вышыні. Даверлівы канюк ціха насвіствае сабе пад нос, пазіраючы па баках.

Тут, на лузе, можна сустрэць шпакоў, галак, улікоў, кнігавак, качак, балотных плісак і іншую крылатую драбязу. Шпакі, гракі, галкі вялікімі чародамі пералятаюць з аднаго месца на другое, адшукваючы ў мяккай глебе лічынкі розных насякомых і чарвякоў. Так яны ўвесь дзень трымаюцца на лузе.

Тут жа, на больш нізкіх месцах, нярэдка можна ўбачыць і белых буслоў. З году ў год яны перад адлётам у вырай з усіх навакольных вёсак і сёл збіраюцца на прыбярэзінскія лугі. Іх часам досыць-такі шмат. Аднойчы я іх памылкова палічыў за жанчын, якія зграбалі сена. І як жа быў здзіўлены, калі гэтыя ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

белых кофтачках “жанчыны” раптам разам узмахнулі крыламі і ўзняліся ў паветра...

Перад вялікай і адказнай дарогай на поўдзень буслы нагульваюць на лугах тлушч, трэніруюць маладыя крылы. Дзеля гэтага яны збіраюцца цёплымі поўднямі пад самыя аблокі і там, раскінуўшы пругкія крылы, вялікімі кругамі лунаюць над парыжэлымі лугамі і пожнямі, углядаючыся з вышыні ў родную сэрцу зямельку. Яе ім хутка давядзецца пакінуць. (289 слоў)

Паводле Р. Ігнаценкі

**156.** Каля самага берага было гразка. Праз метры два дно цвярдзела і, здавалася, пахруствала пад нагамі. Не было тут здрадлівых ямак, у якія можна было боўтнуцца з галавой, са дна, падціскаючы пальцы на назе, можна было браць цвёрдыя і калючыя, бы шрот, пясчынкі і дробныя каменьчыкі. Купаліся доўга і весела, але няўмела, баючыся заплываць на глыбокае, хоць кожнае лета бавіліся толькі вось гэтым возерам. Яно ляжала сярод высокіх берагоў вялізнай блакітна-хвалістай хусткай. Па гэтай дрогкай азёрнай хустцы, няроўна зарубленай цёмнымі лазнякамі, пазначанай вузламі старых вербаў, плаўна і бясшумна, амаль не пакідаючы за сабою слядоў, праплывалі чаўны. Нават ямачка ад кінутага каменьчыка хутка знікала. Веры здавалася, быццам пад гэтым бліскучым, як напятым у ціхае надвор’е, шоўкам вады павольна і важка круціцца вакол сваёй восі нейкае вялікае кола. Варочаецца, бы ў яме, зацягвае ў свай калаўрот усё жывое і ў сваім няспынным руху ў адзін момант сцірае з паверхні возера глыбокія раны ад вёслаў, кругі і шырокія палосы ад нагружаных чаўноў.

Азёрнае кола пачынала шалець толькі ў навальніцу. Яно быццам сілілася вырвацца з глыбіні, рыпуча паварочвалася з боку на бок, гнала да берага вялікія хвалі. У дзявочую душу ўрывалася нешта трывожнае. Страх, аднак, не пускаў на бераг. Яна толькі назірала здалёк, як чаўны, прыкутыя ланцугамі да калоды, то грозна падымаліся, то імгненна апускаліся на хвалях, моцна стукаліся, церліся бартамі, павольна запаўняліся вадой і нават тапіліся.

Але аднаго разу вецер толькі пагнаў па возеры невялікія хвалі. Здавалася, навальніцы ўсё ж не будзе. Вера ўзяла сваю шчаслівую на ўдачу рыбацкую дарожку, нацягнула старую штапельную кофту з доўгімі рукавамі, каб не было холадна, і пайшла на бераг. Можа, і не варта цяпер ганяцца за тымі шчупакамі: не тая пара. Але потым адчайна махнула рукою, ускочыла ў човен і, прымасціўшыся зручней, пагнала яго на самую сярэдзіну. (289 слоў)

Паводле В. Коўтун

**157.** “Божа мой!..” – прашаптаў Янковіч, уражаны і ўзрушаны зусім іншай – [,] такой нечаканай – [,] знаходкаю. Ён, седзячы на падлозе, шукаў, перапоўнены творчым імпэтам, незавершаную сюіту сярод зваленых у схovах

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

секцыі нотных сшыткаў, рукапісных артыкулаў, лістоў да сяброў і лістоў-водгукаў ад прыхільнікаў яго таленту, а яшчэ між неабходнымі калісьці, ды надоўга занядбана-забытымі часопісамі, газетамі і выразкамі з розных выданняў [–] (ён адно збіраўся ўпарадкаваць свой "каштоўны хлам", але рукі да гэтага так і не даходзілі). Прашаптаў і ўздыхнуў, калі ўбачыў, што канверт з почыркам, да болю знаёмым, выпаў на падлогу з выпадкова разгорнутай газеты, не будучы ў свой час знойдзены і прачытаны. "Тры гады як Максіма не стала, – падумалася яму, – значыць, пісьмо праляжала яшчэ даўжэй".

"Дружа мой, дружа! – да яго, Янковіча, звяртаўся Максім Дзядкоўскі. – Цяпер, калі жыццё маё пайшло пад адхон, я спяшаюся сказаць табе дзякуй. За ўсё, за ўсё…"

"Пад наплывам пачуццяў, відаць, перабольшвае, – як пра жывога, падумаў Янковіч пра земляка. – Што я такое для яго зрабіў?.."

Але зямляк не перабольшваў, гэта Янковіч недаацэньваў свае якасці – рабіць дабро з такою лёгкасцю, з якою майстра-піяніст націскае на клавішы і адорвае людзей эстэтычнаю асалодаю.

Пісьмо ад Максіма Дзядкоўскага, калісьці ўкладзенае паштальёнкаю ў складзеную газету, а потым жонкаю Янковіча ўзятае з паштовае скрынкі і гэтак жа бесклапотна не заўважанае, кінутае разам з газетаю на стос яго папер, зараз раптоўна выклікала ва ўражлівай душы мноства ўспамінаў, звязаных з асобаю, у чыім лёсе так неверагодна кантрасна спалучаліся, так цесна перапляталіся творчыя ўзлёты, дасягненні і чалавечыя падзенні, няўдачы і жыццёвая драма. З аднаго боку – яркі дэбют і ранняя слава (яшчэ студэнтам Дзядкоўскі стаў вядомы ў кампазітарскіх колах), хуткі росквіт шчодрага таленту (ягоныя "Гімны каханню", "Снегавая рапсодыя", "Зорная саната", трыпціх "Краіна замкаў", араторыя "Нязскораная цытадэль" увайшлі ў залаты фонд нацыянальнага музычнага мастацтва), любоў публікі, а з другога боку – фіяска сямейнае, ранні развод, у выніку якога без бацькі гадаваліся дзве дачкі, працяглая неўладкаванасць, хваробы… (304 словы)

Паводле В. Жуковіча

**158.** Абсаджаная вербамі брукаваная грэбля перасекла вузкую, як раскручаны неадбелены сувой, бруднавата-шэрую, толькі дзе-нідзе акварэльна зазелянелую пойму. На спуску да рэчкі паважанага веку аўтобус завібраваў і забразгацеў на ўсе лады. Ён набіраў разгон, каб далей, за мастком, калі ўжо не выскачыць, дык хоць трохі жвавей выгазаваць з лагчыны. За ёй, злева ад шашы, важка падымаўся па-вясноваму набрынялы Заліп'янскі лес ([–] рэчка, над якой пракаціўся па драўляным мастку аўтобус, звалася Ліпаю). Справа, крыху з-за пагорка, паказаліся ўчарнелыя хаты і хлявы. Яны, здавалася, усцягвалі на гару яшчэ не прасохлыя агароды. Грабянцы – так звалася вёска. Недзе справа, уніз да лагчыны, спускалася папярочная вулка. За ёю віднеліся шэрыя купы высокіх дрэў – [,] колішні панскі парк ці, можа, цвінтар. А тут, дзе мы ўжо натужна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўз'ехалі на гару, галоўная вуліца ўпіралася ў шашу – гэта і быў мой прыпынак… Вылез з аўтобуса, пачакаў, пакуль ён рушыць далей, і перабрыў на другі бок дарогі… Паміж шашою і лесам пралегла шарavата-жоўтая, шырынёю метраў з трыццаць пясчаная паласа. І, як бывае вясною, першы раз выгнаная з хлявоў жывёла першароднa ўскапыціла сыры зляжалы пясок.

Глыбока выезджаныя машынамі каляіны вялі ў густы, з лускавата-чорнай карой сасоннік. Ён роўнымі радамі пасаджаны быў некалі таксама на пясчанай, амаль што ніякай глебе. Хоць і быў ён ужо стараваты, адно кучаравеў густым і дробным, з хваравіта-кароткай іглііцаю голлем. Далей пачынаўся рэдкі стары лес – [,] сасна папалам з бярозаю. Злева ж, [] ад поймы, усё бліжэй да дарогі, падступала густое чарналессе – малады дубняк, зеленавата падмешаны маладымі асінкамі. А дзе-нідзе з чорнага гушчару срэбна паблісквала і тонкая бярозка… А над дарогаю з чыстага неба пранізліва-ярка свяціла сонца. Асляпляльна ўспыхвала па краях бухматае сасновае голле. Пяшчотна свіцілася маладзенькае, толькі з клейкіх пупышак, бярозавае лісце. І такім жа пранізлівым, як сонечны прамень, здалося танюткае ценьканне сініцы. Напэўна, яна недалёка адляцела ад хат, каля якіх зімавала. Так і ёсць, [:] уперадзе спачатку засвяціўся шырокі ясны прагал, а потым у прасветах між дрэў паказаўся і сам прасёлак. (310 слоў)

Паводле М. Кусянкова

## Складаны сказ

**159.** З'яўляючыся часткай агромністага, неабдымнага жыцця прыроды і людзей, мастацкі свет Івана Пташнікава надзелены рэальнай і мастацкай непаўторнасцю. Гэта – мікракосм, які нясе, заключае ў сабе ўсё, што неабходна для яго існавання і жыццядзейнасці. У гэтым свеце [–] (мастацкі свет успрымаецца як свет рэальны) [–] няма, здаецца, нічога выпадковага ці непатрэбнага; кожная дэталь, падрабязнасць – гэта часцінка таго свету, у якім жыве чалавек, дзе ўсё для яго неабходна. Таму ўсе падрабязнасці, апісанні, карціны не толькі жывапісна-яркія, выразныя. Яны напоўнены чалавечымі пачуццямі; яны непасрэдна і неяк дужа асабіста звязаны з чалавекам, пастаянна на яго ўплываюць, у сваю чаргу пастаянна этычна, эмацыянальна адчуваючы на сабе чалавечае ўздзеянне; яны, нарэшце, падпарадкаваны адзінай стваральнай сіле, ёю сцэментаваны. Сіла гэтая – сіла чалавечай індывідуальнасці, унутраная сіла чалавечага характару. Творы пісьменніка пры ўсёй сваёй жыццепадобнасці строга падпарадкаваны пачатку ідэйна-мастацкай унутранай арганізаванасці.

Жыццё паказваецца не аб'ектыўна-нейтральна, а як жыццё пэўнага чалавека – [,] аднаго ці некалькіх. Гэты прынцып адлюстравання рэчаіснасці, калі навакольны свет – прырода, побыт, грамадска-сацыяльныя і асабістыя ўзаемаадносіны – падаецца праз прызму ўспрымання пэўнага героя, для Пташнікава з'яўляецца галоўным. Чалавек пры такім узнаўленні рэчаіснасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

становіцца своеасаблівым цэнтрам прыцягнення, тым магнітам, які ўсяму надае парадак, узаемаўзгодненасць, пэўную форму. (182 словы)

Паводле С. Андраюка

**160.** Рака шырокая, пакуль што трыснёг, лаза і асака абноўлена зялёныя, сонца зноў, як штогоду, грэе па-летняму, і ліпа ў самай квецені, [] гудзе ад цямна да цямна. Сяджу пад ёю ў халадку, і гуд пчаліны люба пяе ад высокай травы, да якое звісае духмянае голле, і ў самае неба, ажно тая ліпа варушыцца ўся. Пчол, паважаючы працу, баяцца не трэба. Можна зблізку паназіраць, як яны робяць сваё. Бясконцае, нястомнае і вельмі важнае.

Ліпа тут, над ракой, на ўзлессі, не адна. За палянай, дзе пачынаецца белая грэчка, стаяць яшчэ чатыры такія красуні, таксама ў шчодрай духмянасці і неабсяжна гудзяць.

На адной з дзвюх бліжэйшых ліп хаваецца ў кроне буслянка. Мноства разоў на дзень жыхары яе зверху абмахваюць бела-чорнымі крыламі зялёна-залацісты гуд, то асядаючы на гняздо, то зноў узлятаючы. Сям'я з трыма падлеткамі, што яшчэ чарнадзюба хекаюць ад спёкі і, стоячы ў гняздзе, з трывожнай цікаўнасцю разглядаюць бліжэйшае наваколле. Дрэвы, раку, траву, будынкі леснiковага двара, чырвоныя, сінія, жоўтыя скрыначкі вулляў – усё, над чым так добра і так яшчэ боязна планіраваць на няўпэўненых, радасных крылах. Далей за ракою – лугі, за імі каласіста-спелыя прасторы палёў, якія цяпер, амаль апоўдні, у парнай смузе. (187 слоў)

Паводле Янкі Брыля

**161**. І вось аднойчы, марозлівым зімовым днём, выбралася Ніна з сяброўкамі на лыжах і [,] заехалі ў лес. Дзень быў ветраны, а ў лесе ўладарыла цішыня. Ніна спынілася, пачуўшы перастук дзятла па звонкай сухастойцы. Дзяцел раптам сціх, быццам натыкнуўся дзюбаю(ай) на асколак снарада ці бомбы. Ніна ведала, што тут, пад Чавусамі, фронт стаяў з восені сорак трэцяга да чэрвеня сорак чацвёртага. Колькі палегла тут хлопцаў, мала старэйшых за яе...

Цішыня ў лесе. Вось, быццам камяк снегу з чорным пер'ем, прашмыгнула сарока: [,] нават чутно, як разразае яна крыллем настылае паветра. А паветра... О, якое паветра ў зімовым лесе! Удыхнеш – аж ноздры трапечуць і зліпаюцца і ўсё цела наліваецца бадзёрасцю. Сэрца весела тахкае ў грудзях, кроў мацней пульсуе ў жылах. А як хораша думаецца ў зімовым лесе! Дробязнае і нікчэмнае нібы асядае на сподзе душы, затое ўсплываюць думкі пра вечнае і высокае, пра мінулае і будучыню. Вядома ж, калі жыццё толькі пачынаецца, усе думкі пра будучыню.

А яшчэ зімовы лес уразіў Ніну бялюткаю чысцінёй(ёю). Усе пні, гнілыя, трухлявыя, стаялі пад снегавымі шапкамі, быццам малайцы-снегавікі. Усякае ламачча, гнілое прэлае лісце – усё прыхарошана, заслана бялюткай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

коўдрай(аю). Малая хвойка, нахіленая пад цяжарам снегу, падалася падобнай... да пінгвіна. (190 слоў)

Паводле Л. Левановіча

**162.** З самага рання гучыць у Віцькі ў вушах аднастайная песенька ластавак.

Птушкі зляпілі сабе гняздзечка пад страхою той прыгрэбкі, дзе Віцька сягоння начаваў. Яны шчабяталі раз-пораз. Спачатку Віцьку снілася, што нехта падвесіў над ім тыя глушакі, што некалі пан надзяваў свайму рысаку на шыю. Вісяць гэтыя глушакі над галавою ды ўсё шумяць і шумяць. Потым пачулася, што нібы гэта бабка гамоніць. Ды так хуценька, так дробна гамоніць, што аж нельга нічога разабраць.

Ад гэтага Віцька і прачнуўся. Праз вузкія шчыліны паміж дыль, з якіх былі складзены сцены прыгрэбкі, свяціў ранні прамень сонца. Над страхою шапацела асіна. Яна заўсёды нешта шэпча. Іншы раз, здаецца, і ветру няма, а яе лісце ўсё дрыжыць і дрыжыць.

Віцька глядзеў на праворных, вітлявых птушак. На іх сівое гняздзечка, падобнае да сухой грудкі зямлі, і ўспамінаў, як некалі бабка пераказвала яму гэтую песеньку і падладжвала свой голас пад ластаўчын. Мусіць, таму і саснілася цяпер, што гэта не птушкі пяюць, а гамоніць яго бабка.

І нават ідучы ў школу, Віцька думаў пра гэта. Бабкі ўжо даўно няма, памерла, а ластаўкі вясеннім раннем прынеслі ў прыгрэбку яе голас. Здаецца, і цяпер яшчэ чутна яе гаворка. Нібы ластаўчына, нібы яе. (191 слова)

Паводле А. Кулакоўскага

**163.** Пакуль развіднела, ён быў ужо ў лесе, раздумна плёўся па блытаных, пратаптаных жывёлай сцяжынках і думаў, дзе б яму прыткнуцца на дзень. Мусіць, сюды зноў прыгоняць кароў – яму тут месца няма. Тады дзе ж яно ёсць? Канешне, дзе далей ад жытла і людзей, ад поля і сенажацяў. Значыць, зноў трэба плесціся ў расцяробы ці ў той дальні змрочны ельнік, на балотныя імшарыны. Разважыўшы, усё ж вырашыў, што лепш – у расцяробы. Там, ведама, небяспечней, чым у ельніку, затое ў тым баку поле і бульбянішча, на якое яму трэба будзе схадзіць. Як заўжды, зранку пачало дужа смактаць пад грудзямі: хацелася есці. Журавіны ён амаль усе з'еў уначы, яны кепска спатольвалі голад, толькі праганялі смагу.

У лесе ўжо настаў дзень, было відно, навокал сцішана драмалі елкі, не варушыўся ніводзін лісцік у жаўтлявым веццы бяроз. Здаецца, усталявалася добрае, без дажджу надвор'е, можа, нават пачнуцца прымаразкі. Тады ўраз пачарнее лісце алешын, золатам зажаўцее бярэзнік, дружна пацярушыць лістапад. Праз нейкі нядоўгі час лісцвяны лес стане скразны для позірку – усё жывое ў ім будзе бачна здалёк. Мусіць, тады яму будзе горш... Але ён не хацеў думаць пра тое, што будзе, ён жыў адным днём, ягоныя клопаты не ішлі далей наступнага вечара. (194 словы)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паводле В. Быкава

**164.** Крайняй вуліцай мікраараён выходзіў на яр, [–] шырачэзны і пусты, разлеглы агромністай няроўнай лагчынай. Яго можна было палічыць зарослым кар’ерам, але не, [:] грунтавой выемкі тут ніколі не было, [–] гэтак ужо ўладкавалася прыродай. Вакол гэтага горада зямля перабучана і пералапачана на дзясяткі кіламетраў, [:] тут угваздалі ў рэчышча гіганцкую плаціну для электрычных турбін, пабудавалі велізарны алюмініевы завод, лесапрамысловы комплекс, з дзясятак іншых буйных заводаў, але і тут засталіся сям-там дзялянкі некранутай зямлі. Адной з іх быў гэты яр, зарослы сярод глiністых пралысін абскубаным кустоўем вольхі, асіннікам ды крапівой. Горад з двух бакоў паўкружжам падступіўся да яго і спыніўся. На трэцім, паўднёвым баку, дзе хадзіла сонца, супрацьлеглым мікраараёну, адразу за ярам цягнуўся ўгару сасоннік, паблізу горада здратаваны, спрэс са слядамі вогнішчаў і падпалаў, але ўсё-такі жывы, прыемна зялёны і зімой, і летам.

За колішнім часам, калі яшчэ рабіліся спробы ахарошваць жыццё, ля стромага берага яра, дзе мікраараён, змайстравалі спартыўны трамплін для скачкоў з лыжамі. І скакалі, спружыніста ўзлятаючы ў паветра, і ляцелі на птушынай вышыні выпнутымі ўперад фігуркамі, нанізанымі на лыжы, і, прызямляючыся, успорвалі снег і доўга каціліся ўніз па схіле. На трамплін з усяго горада збіраліся падшыванцы, [–] тут заўжды было шумна, весела і гармідарна. Пасля, калі жыццё агалілася суцэльнаю ранаю, трамплін закінулі, і ягоная металічная ферма цяпер тырчэла гола і мёртава, бы шкілет. (210 слоў)

Паводле В. Распуціна (пераклад М. Міхайлавай)

**165.** Адзін толькі бусел застаўся на зямлі. Бусел і Мацвей Роўда на пустой дарозе. Бусел з тугою ў вачах паглядвае, як з клёкатам знікае за даляглядам чарада, і сам спрабуе крыкнуць, але няма ў яго сілы на голас, як ён ні выструньваецца, ні напружвае цела, ні дапамагае крыламі прарвацца голасу. Няма голасу, [–] сіп толькі прастуджаны. Так прастуджана плача ўзімку на ветры зломленая, расшчэпленая хвоя. Бусел жа з апошняга зноў бяжыць, бяжыць і махае крыламі, і галава яго задзёрта, вось-вось, здаецца, адарвецца ад шыі, ён імкнецца ў неба, імкнецца адарваць сябе ад зямлі. І адрывае, і праразаецца голас. Бусел ляціць і крычыць, [] што мае моцы, змагаецца з паветрам, як той рыцар сумнага вобраза, змагаецца з травой, што гоніцца за ім, цягне да сябе, да зямлі, не дае выйсці ў неба. Губляе вышыню, але не верыць гэтаму, не выкідваючы ўперад ног, не збіваючы хуткасці парашутамі-крыламі, шэрым пер’ем, брудным камяком утыкаецца ў зямлю, падае грудзьмі, перакульваецца цераз галаву. Роўда спяшаецца, ідзе па лузе да птушкі, а тая галавой, кончыкам дзюбы, але цягнецца ў неба, [] за клінам, што ўжо растаў у вечаровым сонцы. Роўда бярэ бусла на рукі, нібыта дзіця на рукі бярэ, той квола б’ецца, усёй сваёй істотай, нават рухам крыві ў целе адхіляючы гэтае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чалавечае шкадаванне і спагадлівасць. Мацвей прыціскае бусла да грудзей, прыпадае тварам да яго цёплага бездапаможнага пер’я. (218 слоў)

Паводле В. Казько

**166.** Быў ціхі, мяккі вечар, адзін з тых, што бываюць толькі ў чэрвені, калі траскучыя навальнічныя дні змяняюцца яснымі, цёплымі, духмянымі, калі ўсё зялёнае расце дружна, як бы ўзахапкі.

Азярцо ляжала спакойнае і роўнае, бы шкло, ад цішыні, што навісла над ім і, здаецца, аж звінела. Ці, можа, гэта звінела ў Валодзькі ў вушах ад таго, што напружваў памяць, узнаўляў у ёй малюнкі дзіцячых гадоў? Тады на месцы азярца была звычайная сажалка, зарослая “пухоўкамі” – [( ] так дзеці называлі рагоз [ )]. Валодзька бегаў з сябрамі ламаць гэтыя “пухоўкі” – рудыя дзябёлыя таўкачыкі, падсушвалі іх, і тады з іх лёгка выскубваўся пух, гэты пух чаплялі адзін аднаму на спіны, у валасы, і ад яго доўга нельга было атрэсціся. Было гэта даўно. Тады і пагон быў сапраўдная пожня, якую касілі. На ёй вяліся кучамі чмялі, а цяпер іх са свечкаю не знойдзеш: патруціла хімія. Было многа гнёздаў жаўтапузкі – [( ] так называлі амялушку, якую Валодзька любіў слухаць пасля таго, як аднаго разу знайшоў у ягадах падлётка і выкарміў яго [ )].

Цяпер замест канавы [-] роўненькі канал з голымі берагамі, пясчаным дном, чыстаю, халоднаю крынічнаю вадою. Станеш – ногі імгненна нямеюць, а холад па жылах, здаецца, падымаецца да самых кончыкаў вушэй. Вось дзе загартоўка! У такой вадзе не толькі рыба ці ўюн, а нават звычайны жук-плывунец ці п’яўка ў спячку залягуць. А раней жа ў канаве, сажалцы столькі было карасёў, уюноў.

Цячэ, мяняецца не толькі вада, аказваецца... (225 слоў)

Паводле У. Рубанава

**167.** Той ноччу, пад раніцу, я прачнуўся сам, без Сярожавай дапамогі: ён яшчэ спаў. Расплюшчыўшы вочы, я разгледзеў над сабой месяц, убачыў на дзіва вузкія пёры воблакаў. Празрыстыя, быццам марлевыя, воблакі распаўзліся па ўсім небе, і яно нагадвала зямлю, такую белую ад туману. Нібыта і тут, вакол капы, і там, вакол месяца, слалася адна і тая ж стыхія, а берагі ў іх былі таксама адны: круг лесу. Гэтыя берагі ледзьве праглядваліся, але разам з тым, як і ўсе берагі для вандроўнікаў, сваім далёкім цяплом абяцалі штосьці ўжо страчанае і нешта яшчэ не набытае. Я ляжаў тварам да неба, і свежая глыбіня ночы скіроўвала мае думкі ўжо не назад, да сну, а да цвярозай развагі і пражытай рэальнасці: там, у малюнках пражытага, слаліся такія ж белыя ночы. Адна з іх як ружовы сон. У той ночы мы з бацькам ляжым на возе пад такім жа сцюдзёным асеннім небам, і мне гэтак жа, як і цяпер, цёпла ў ногі, але не таму, што яны ў ботах і сене – [(] нічога гэтага не было [)], – а таму, што бацька развязаў мех з хатнім рыззём і загадаў мне ўтачыць туды ногі. Мы вязём свае пажыткі на чыгунку, якой будзем вяртацца з бежанства. І другая ноч: паром у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тым жа восеньскім тумане, і мы ўсёй сям’ёй сядзім на мяккіх клунках, плывучы за Волгу. Бывалі і яшчэ не менш белыя ночы восені, але на ўспамін прыходзяць тыя дзве. (228 слоў)

Паводле В. Карамазава

**168.** Роў быў глыбозны, сцежка па дне віхляла вузкая, месцамі крута падымалася ўгару, як ведучы на неба. Унізе, дзе яна пачыналася, яшчэ быў змрок, хоць уверсе, па-над ровам, ужо гуляла ранішняе святло. Трава па схілах рова паспела прабіцца з-пад леташняга лямцу-дзёрну, і дзе-нідзе па зелянінцы жаўтлявымі плямкамі зацвіталі першыя дзьмухаўцы. Усё гэта: сцежка, малады мурог, сонечна-жаўтлявыя краскі – цешылася ў сінечы лёгкай зварушлівай смугі, якая не спяшала адарвацца ад зямлі, падняцца ўгару да сонца, каб там растаць, а заставалася ў рове.

Наперадзе, за сотню крокаў ад мяне, па дне рова ішоў чалавек. Ён быў таксама, як кожная былка ў рове, аблытаны вільготнай смугою, што размывала абрысы, постаць, хаду рабіла мяккай, плыўкай. На спіне ў яго свяцілася блакітнавата-жаўтлявая пляма – эцюднік мастака, і па той пляме, як яна пагойдвалася ў бакі, мне здавалася, нібыта мастак спяшаўся выбрацца з рова, хоць з ягоным хворым сэрцамісці трэба было цішэй. Хацелася спыніць, дагнаць. Колькі разоў я гукнуў:

– Антон Стахванавіч?!

Ён ані разу не азірнуўся.

Нарэшце галава, добра чарнявая і на дзявятым дзясятку гадоў, злавіла макаўкаю сонца, загарэлася жаўтлява-залацістым дзьмухаўцом, рассыпіста заварушыліся на лёгкім ветрыку срэбна-сонечныя валасы.

Плямы святла ляглі на плечы, на спіну, мацней, квадратам сонца, заблішчэў эцюднік, і цяпер ён мне ўбачыўся ці то палітраю мастака, ці то ягоным светлым пейзажыкам.

Спыніўшыся па-за ровам, стары павярнуўся да мяне тварам і глядзеў зверху, з-пад сонца, у роў, шукаў мяне. А я стаяў унізе і глядзеў угару, любуючыся сонечна-апантаным, шчаслівым у сваёй апантанасці чалавекам. (238 слоў)

Паводле В. Карамазава

**169.** Быў той час, калі краскі паскідалі ўжо ярка-святочныя ўборы, а на сцяблінках, якія яшчэ нядаўна аж ламаліся ад кветак, зараз будзённа і задумліва шуршалі поўныя каробачкі спелых зярнят, беражліва хаваючы ад дажджу і туману свой летні даробак.

Спакусіўшыся сонцам і цеплынёй(ёю), у другі раз зацвіталі брусніцы, суніцы, нават крушына. Зноў успомнілі вясну званкі, фіялкі, канюшына. Іх кветкі былі не такія яркія і не такія буйныя, як увесну, але ўсё ж і яны змушалі зірнуць на сябе, убачыць іх журботна-ціхую прыгажосць. На ранку лугі заўсёды

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

высцілаў густы туман, па якім, здавалася, можна было бегчы, як па палатне, і які сведчыў ужо, што ў прыродзе пачынаецца дужанне цеплыні і холаду. Цеплыня не хацела яшчэ здавацца, але і холад з кожным днём усё мацнеў: ён халадзіў цёплае дыханне зямлі, і яно выпадала росамі на пожні і туманамі вісела над атаваю. К абеду туман сыходзіў, і тады ў палях і лугах рабілася так празрыста і чыста, што выразна была бачна кожная капа сена і кожны крыжык ячменю, кожны кусцік і кожны гаёк, і нават здалёк можна было заўважыць, як на ўзлесках гарыць сіняватым агнём спелы верас.

А над гэтым верасам, над гэтай празрыстасцю, над палямі і лугамі недзе з абеду – [(] ён чамусьці ніколі не бачыў, каб птушкі ляцелі ў вырай з раніцы [)], – чарада за чарадою спяшаліся туды, куды сплывала цеплыня, пералётныя вандроўнікі.

Верасоўскі глядзеў на іх імклівы лёт, і яму чамусьці думалася, што яны, птушкі, мусіць, самыя шчаслівыя на свеце, бо і ў чарадзе, і на адзіноце яны заўсёды вясёлыя і маладыя. (248 слоў)

Паводле Я. Сіпакова

**170.** Дарога выводзіла мяне на дзялянку. Тонка і высока стаялі на ёй адзінокія сосны, цвіркалі недзе на маладых бярозках, садзіліся на зарослыя травой лаўжы разамлелыя аўсянкі. То падаючы ледзь не да зямлі, то сігаючы ўгору, праляцела чорная жаўна. Быў тут нейкі тужлівы прастор, як на старым, забытым дворышчы, і ўсё тут было, як бывае ў чалавечым жыцці.

Дайшоў я да напаўзаваленага нейкага бліндажа і нечакана для сябе ўбачыў у яго спадзінцы цэлую плойму жоўтых, як кветкі, і прысадзістых лісічак. Але я не спяшаўся іх браць: было і без таго за што тут зачапіцца воку.

Я ступіў да бліндажа, як раптам у цеглавіне нешта зашоргалася, затрапяталася, а потым ураз трывожна піснула, палахліва заценькала, забілася нейкая птушка. І як бы хто штурхнуў мяне ў грудзі – я падаўся назад, лес хіснуўся, і я чуў ужо адно толькі неба: яно кружылася, і адтуль плыў і плыў на мяне трывожны бясконцы шоргат. І вось ужо нібыта я ляжаў на зямлі. Не было ўжо ні выбуху, ні мяне, і змяркалася, і тарахцела па дарозе падвода, і галасіла ў лесе мая маці...

Было ціха ў лесе, і чуваць было, як там, у цеглавінцы, яшчэ нешта шоргалася, але гэта, мусіць, з патрывожанага дрэва падалі кроплі і выпроставаліся патрывожаныя галіны. І як бы нанава глянуў я на ўзгорачак, чысты, светлы, абсыпаны шыгаллем, праз якое прасвечвала сіняватая зямля, і, можа, ад таго ўзгорачак выдаваў не то фіялетавым, не то бэзавым. І мне было ўжо ніякавата за нядаўні спалох, і ўжо недзе далёка быў успамін пра тое, як сем гадоў назад падарваўся ў гэтым лесе на міне мой аднагодак-хлопец, [–] наш вясковец... (260 слоў)

Паводле М. Стральцова

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**171.** Крочыў Кірэй дамоў па лесе, [] убаку ад гасцінца, не губляючы, аднак, накірунку. Снегу наваліла шмат, [–] ісці было цяжка, спіна пад кажухом намокла. Валёнкі на нагах былі хаця і старыя, аднак падшытыя, цёплыя. Ішоў ноччу і днём, зрэдку адпачываў, ды і то нядоўга. Вогнішча распальваць баяўся, небяспечна, бо ў той зоне, дзе ён праходзіў, яшчэ немцы з паліцаямі гаспадарылі, а без агню прысесці і адпачыць зморанаму чалавеку рызыкоўна. На такім холадзе цябе ўмомант залюляе сон.

Ноччу было прасцей, [–] ён смела выходзіў на дарогу, ішоў лёгка, спружыніста, а калі, здаралася, падвода якая насустрач траплялася, то адыходзіў убок, прапускаў яе і працягваў тупаць далей. Буда, Чырвоная Слабада, Навасёлкі, Філіпавічы, Ванюжычы, Залессе, Бабунічы. Амаль усе вёскі разбураныя, спаленыя. “Няўжо і мая такая ж?” – падумалася само сабой, [–] і крывёю зайшлася душа. І чым бліжэй падыходзіў да сяла, тым гучней і трывожней калацілася сэрца: як яны там, мае родныя дзяўчаткі, жонка? Ён уяўляў, як дзеці ўзрадуюцца бацьку, кінуцца на шыю. Ад будучай сустрэчы салодка млела душа, да твару прылівала кроў, на вочы набягалі слёзы. “Даражэнькія вы мае, як я змаркоціўся без вас! Ці жывыя? Вайна ж!” – мільганула аднойчы нядобрая думка, аднак ён адразу яе адагнаў, як назойлівую муху…

Калі падышоў да Сялюцічаў, то не пазнаў вёскі: яе проста не было. За два гады, якія мінулі пасля аблавы, уцалелыя каркасы печаў размыла дажджамі, ад часу і непагадзі яны разбурыліся, aселі і нагадвалі пра сябе толькі кучкамі цэглы. А цяпер, зімой, наогул толькі глыбіста бялелі снежнымі гурбамі… І раптам з вачэй самі паліліся слёзы. Не знайшоўшы дзе прысесці, на аслабелых нагах падышоў да дрэва, абхапіў яго рукамі і, страшэнна сціскаючы зубы, захліпаўся ад рыданняў… (266 слоў)

Паводле В. Шабалтаса

**172.** Мусіць, таму, [] што пра многае не распытаў яго і многае недагаварыў, я не прыгадваю тых дзён з рыданнем рэквіема, шчымлівымі прамовамі, з бясконцай чарадою людзей, якія пакідалі цягнікі, вярталіся з падарожжаў, каб правесці яго, потым ішлі найдаўжэйшай і найпрацяглейшай дарогаю, каб лепш і больш нагледзецца перад тым, як развітацца.

Але я заўсёды помню дзень яго нараджэння. У гэты дзень, устаўшы на досвітку, выбіраюся ў поле, дзе павыскаквала ладная рунь, каб агледзець яе з усходам сонца, лапушную, кусцістую, у расе, а то і пад першай шэранню. Пасля перабіраюся ў лес і хаджу доўга, пакуль у кошыку не апынецца хоць дзясятак лісіц або самых позніх грыбоў – [,] таўсматых і сакаўных зялёнак. Так удаецца паразмаўляць са збажыной(ою) будучага лета, паслухаць перадзімовы шум ранішніх хвой і пасядзець паўгадзіны каля маленькага цяпельца, адаграваючы рукі і лусту захопленага з сабою хлеба. Словам, паўтарыць усё тое, што ён любіў і што прызвычаіўся рабіць у апошнія цеплаватыя дні, пакуль не наваліла снегу і не замкнула на ледзяныя замкі рэк і палявых шляхоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У такія часіны ён размаўляў са сваім сумленнем, думаў пра будучыню краіны, пасылаў вочы наперад, на далейшыя шляхі народа, зазіраў у глыбіню чалавечых лёсаў.

У пошуме дрэў, у павеве ранішняга ветру нязменна чуецца яго голас:

– Жывіце даўжэй , хлопцы! Дагледзьце на свае вочы ўсё, чаго не давялося мне, і заўсёды помніце: хай кожны дзень ваш сябруе ці з пачаткам, ці з заканчэннем якой-небудзь справы.

Гэтыя словы я чуў многа разоў ад добрага дзядзькі Якуба, светлага Канстанціна Міхайлавіча, мудрага Коласа. Будзяць яны поначы, гучаць у полі, у лесе, на гарадскіх плошчах – скрозь пад небам Бацькаўшчыны, якую любіў ён аддана і верна неабдымнай любоўю вялікага сына народа. (266 слоў)

Паводле М. Лужаніна

**173.** Не вытрымала, згарэла помпа на калгаснай вадакачцы, стаміўшыся шукаць ваду, што глыбока хавалася ў нетрах зямных. Не стала вады ў калонках, [–] і людзі ў роспачы кінуліся да студняў. Зразумела, трэба неяк жыць, гадаваць жывёлу, варыць есці сабе. Без вады няма жыцця. Успомнілі людзі пра студні, а тых у вёсцы, аказалася, кот наплакаў. Не хапіла ўсім вадзіцы, і павялі людзі між сабою войны. Паўспаміналі, хто і калі які калодзеж капаў, за чыім плотам ён стаіць, хто вядро навязваў, хто калі чысціў дно альбо латаў зруб. Нечуванае дасюль пачалося ў вёсцы: мацнейшыя праганялі слабейшых ад студняў, не давалі ім узяць вады, навешвалі на зрубы надзейныя пудовыя замкі, каб толькі сусед вады не набраў. Вадзіца стала каменем – каменем спатыкнення: сутыкнула лбамі суседзяў, пасеяла варожасць паміж сваякамі. Здаралася нават, што гаспадар, убачыўшы ля студні суседа ці, не дай Бог, каго з прышлых, і асабліва слабейшага, без папярэймы, выліваў яго вёдры, хоць сабе і на зямлю. Пудовыя замкі навесілі людзі і на душы свае, і ўжо баяліся хадзіць па ваду: а ці кралі яе па начах, а ці ўдзень прасілі, як міласціну.

І толькі старая студня не ведала, што такое замок. Была яна нічыйная. Капалі яе даўно, мо з паўвека таму, для школы капалі, глыбокую, на дзевяць метровых кольцаў. Удалае выбралі месца, акуратна склалі кольцы – спрытная атрымалася студня, і дагэтуль не было такога, нават самага засушлівага, лета, каб тут не пялёхалася сцюдзёная – [( ] ажно зводзіла сківіцы – [ )] крынічная вадзіца. Студня заўсёды ганарылася сваёй вадою(ой), радавалася, што яе, старую, шанавала і помніла ўся вёска. І нават цяпер, калі вада не паспявала набягаць і чвэрткі вядзерца нельга было зачэрпнуць, студня ўсё роўна радая была кожнаму, хто прыходзіў да яе пакланіцца. (271 слова)

Паводле У. Міхно

**174.** Стары нечакана заплакаў. І сам, пэўна, засаромеўся сваіх слёз, сеў на жэрдкі, рукавом пачаў выціраць вочы. І колькі ні выціраў, не мог выцерці. Слёзы наплывалі і наплывалі, [–] не буйныя, бляклыя, як вочы, у якіх яны нараджаліся. Стары хаваў свае вочы, пазіраў больш на неба, чымсьці на людзей,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нібы чакаў цяпер ужо адтуль дапамогі або адказу, а можа, слаў ён праклёны гэтаму небу, бачыў там таго, хто пакрыўдзіў яго. Бачыў і праклінаў нейк нязлосна, а хутчэй пакорна, з невялікім дакорам. І дакараў больш, падобна, сябе, чаму ён такі маленькі перад гэтым вялікім небам, перад гэтым спякотным сонцам. І глядзець на яго Мацвею было невыносна горка. Ён, здавалася, адчуваў у роце, на языку горыч мутных і бляклых слёз, яны перацiснулі яму горла, шчыпалі вочы, хілілі, гарнулі да дзеда, да яго рук, да яго твару, вачэй. І ён вачамі старога на імгненне азірнуўся вакол сябе, паглядзеў на зямлю, на неба, на сонца і на самога сябе. Смутак, што ўсё часцей і часцей ахопліваў яго, смутак і журба, з якімі ён пачаў ужо звыкацца, прымаць як нейкую існасць, як святло і змрок, адрынулі, [–] наваліўся жах, халодны і спапяляльны адначасова, жах за сябе і перад гэтай слязінкай старога, што плакаў у глыбі Палесся пасярод лета. Жах павялічваўся, мацнеў, бо слязінку гэтую старэчую як бы падтрымлівала само неба, сама зямля, само сонца. У небе і на сонцы таксама нешта ціхенька дрыжала, слёзнае і журботнае, нешта патаемнае і грознае, здаецца, крылася ў вусцішна аціхлай, маўклівай зямлі, што да далягляду была занята пшаніцаю, да далягляду, за якім ледзь-ледзь згадваўся вымушаны адступіць лес. Жах запасіўся ў Мацвею яшчэ і таму, што ён не разумеў, з-за чаго так нечакана расплакаўся гэты стары. (272 словы)

Паводле В. Казько

**175.** Калі вяртаўся ад Слаўкі дадому, сцежкаю сышоў да ручая і спыніўся пад магутнай прыгожай ліпаю: кара вакол ствала была знята сякераю, і белы ствол блішчаў на сонцы. Доўгае жыццё ліпы некаму таксама не давала спакою, [–] зрабілі так, каб засохла. Непадалёк стаяла старая жанчына, паглядала то на мяне, то на ліпу. Я падышоў, спытаў, хто і навошта ўчыніў здзек з дрэва. Яна не сказала – [] хто, сказала толькі, што наперадзе зіма, а дровы цяпер дарагія, шмат каму не па кішэні, [–] вось людзі і шукаюць дармавіну, валакуць усё, што без нагляду, хай і чужое, а нічыё, як гэтая ліпа, шмат каму вочы мазоліла, рукі развязвала.

Перайшоў па масточку ручай, спыніўся зноў пад магутнаю таполяю: стаяла таксама абчасаная сякерай наўкола, да смерці прыгавораная.

Размаўляючы са старою пад ліпай, звярнуў увагу на тое, што дрэва не толькі стаіць на беразе ручая, як бы і на скрыжаванні вуліц, што на яе з усіх бакоў, знізу і зверху, ад поймы і з пагоркаў, з вышыняў узгорыстай Ганчароўкі глядзяць вокны дамоў, а ў вокнах – твары знаёмыя. З-за ручая на ліпу амаль усё жыццё глядзіць крычаўскі мастак і рыбак Пятро Сцебехаў, з процілеглага берага – вокны Лазарава. А яшчэ бліжэй да ліпы, крокаў дзесяць ад яе, два акны Толі Мядзведзева, [–] былога майго аднакласніка. Алесь Адамовіч тут бываў, і калі ён сядзеў ці стаяў каля дома цешчы, то гэтую ліпу не мог не бачыць, а калі бачыў, то, напэўна, захапляўся яе магутнай прыгажосцю. Як тут было не падумаць, што ліпа жыла-расла на скрыжаванні пачуццяў і думак мастакоў

слова і пэндзля. І ці не за гэта яна пакараная той самай Вандэяй, якая не толькі ў сталіцы, але і ў правінцыі, не толькі ў палітыцы, але і ў побыце, – за тое, што натхняла мастакоў на вольныя думкі і вольныя пачуцці? (287 слоў)

Паводле В. Карамазава

**176.** Хата… Тут кожная рэч чакае, каб да яе дакрануліся. У ёй жывуць, пакуль не разбураць вятры дах і не прасочыцца святло між бярвенняў. Здараецца, і падлога праваліласяя, і печ не грэе, і грубка копціць, і цвіль на дзвярах і вокнах, і клямка злізалася, і стаяк не трымае скабу пад зашчапку, згніў увесь, і дах дзіравы, а людзі трываюць, бо будаўніцтва новай хаты ідзе марудна. Моды няма, каб святкаваць улазіны, калі сталярку не паставілі і падлога не панасціланая. Вось з вёсак нанеслі чарніц. Хочаш смачных пірагоў, [–] затапі печ. Хату даглядаюць, як нявесту, каб з вуліцы была, як лялечка, абмаляваная, пафарбаваная… Улетку ўсе сілы і час забірае агарод, а ўзімку затое і рукамі, і спінаю, і пятамі ля грубкі можна адагрэцца на цэлы год і нагаварыцца ўдосталь. Вочы зліпаюцца ад жадання сну, а ўсё слухаў бы і слухаў бы пра тое, што было, што будзе.

Печ і грубка не адпускаюць, [–] не хочацца ўзімку ехаць у вялікі свет, ды патрэба гоніць. Адна за адной жанчыны ходзяць паглядзець, што новага купілі ў хату. Усе хваляць.

На бягу ў хаце не п'юць і не ядуць. Толькі за сталом і толькі, каб усе селі. Здаецца, і невялікая хата, а вяселле на сто гасцей памесціцца, праўда, танцаваць выходзяць на вуліцу. У хаце свае дзівосы: нават ад гульні ценяў, якія дасылае, [] дзякуючы ветру, [] лямпачка пад абажурам на слупе, што ўкапаны перад вокнамі на вуліцы, час ад часу недзе пад падлогаю ці на вышках шкрабаюць спадарожнікі жыцця мышы, а на вуліцы мяўкае кошка, просіцца ў хату. Усе пад цёплымі коўдрамі спяць. Ідзе адчыняць дзверы, каб упусціць кошку, хіба бабуля. Госцю ўставаць не прынята. І боязна. Здаецца, што ў вокны глядзяць нябожчыкі, прыглядаюцца, што гэта за чалавек спіць на іх ложку. А ў сонечны дзень жывая казка. Церам-церамок. (289 слоў)

Паводле Г. Марчука

**177.** Яська і праўда адстаў-такі ад мужчын, мала ўжо і бачыў іх з-за высокай, яму, маломў, па пахі травы. Штосьці дзіўнае рабілася з ім у гэтую раніцу, ён і сам добра не разумеў сябе, адно пасміхаўся разгублена, слухаючы, як трапеча, шчасліва заходзіцца ў грудзях сэрца ад усяго, што бачаць вакол вочы.

З-за маладога алешніку ўставала сонца, а за ровам, за гэтым цыбатым алешнікам, чуў Яська, [:] прачыналася выспа. Недзе ў самым глухім куточку яе, у ельніку, таемна застагнаў лясны голуб; мусіць, абуджаная ім, нездаволена-рэзка затрашчала сарока, гулка пераклікнуліся між сабою дразды.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Востра пах валяр'яннік, сонца разам з расою ўзнімала, цадзіла над лугам церпкі, аж кружыла галаву, водар, з высокай травы, з-пад самых Яськавых ног шэрымі камячкамі пырхала, разляталася ў бакі дробнае птаства.

Асцярожна, аж баючыся парушыць цнатлівае хараство наваколля, апускаў Яська касу. Пакорліва паддаваліся, падалі ружовыя трапяткія маланкі, падатліва-мякка слаўся ў пракос духмяны аер, купчаста клалася густая, як сцягнуць касою, балаціна, пахла свежай рыбай, рачным глеем, водарасцямі.

У нейкі момант Яська са здзіўленнем адчуў, як нараджаецца, вырастае ў душы нязгода з настойлівым цягам Паўлавай мянташкі, што адбівала касу ўжо на другім канцы лугу, з няўмела-паспешлівым, прагавіта-жалобным гукам Вінцусёвай, якая пляскала недзе зусім блізка, за круглым лазовым кустом. З'явілася ў душы неадольнае жаданне спыніць іх, крыкнуць: "Чакайце, хлопцы, гляньце, хараство якое!"

Нечакана прыйшло і працяло ўсю істоту вострае адчуванне імгненнасці гэтай прыгажосці. Ён неяк бездапаможна азірнуўся, нібы хочучы знайсці абвяржэнне гэтаму адчуванню, убачыў доўгія роўныя стужкі пракоса. Тут жа ўсцешна падумалася, што так і павінна быць: выспелыя травы гінуць, каб даць месца новым, [–] так на зямлі ад веку, такі непарушны закон існасці ўсяго жывога на свеце. І ўсё ж здзіўлена заўважыў, што, зусім не супакоеная гэтай развагай, пачынае аціхаць, блякнуць у ім тая амаль дзіцячая радасць, якая так урачыста гучала ў душы цэлы ранак. (292 словы)

Паводле Х. Лялько

**178.** Мястэчка Круглае, можа, і сапраўды было круглым. Адсюль і назва. А тое, што яно гладкае, факт. З аднаго боку кароценькая вулачка [–] (цяпер Першамайская) [–] крута збягала з узвышша, на якім ляжала мястэчка, і ўпіралася ў самую Друць. Не было на гэтай вулачцы ні дашчанага тратуара, ні маставой. І калі ішоў дождж, раўчукі лёгка прабівалі сабе канаўкі ў жоўтым пясчаным грунце з вясёлым бульканнем збягалі ўніз і ўліваліся ў рэчку.

Калі ісці па гэтай вулачцы ўніз, па правы бок была сядзіба майго прадзеда. На ўзгорку стаяла хатка, тая самая, што дзед пабудаваў замест вялікай хаты, якую двойчы палілі яшчэ да майго нараджэння. (На гэтым месцы цяпер стаіць універмаг.) Мая памяць захавала хатку ў адзін пакой з сенцамі. Яна таксама пазірала вокнамі на захад, там, за рэчкай, садзілася сонца.

Памятаю высокую пуню, поўную духмянага сена аж да страхі, і вялікі яблыневы сад. Ён раскінуўся на самым высокім месцы сядзібы, у правым куце яго быў пограб, туды ссыпалі на зіму бульбу ды іншую гародніну, хавалі бочкі з засоленымі гуркамі і капустай. Побач з пограбам стаяў турнік, на якім гушкаўся, наліваў свае мышцы сілай мой стрыечны дзядзька Яўген, яшчэ школьнік. Гэта быў патайны куточак майго дзядзькі. Яўген хаваўся за пограбам, калі яго шукала цётка Насця, яго маці, каб адлупцаваць за якую-небудзь шкоду, ці калі адлыньваў ад працы, бо любіў маляваць і чытаць кнігі. Яўген прасіў мяне не выдаваць яго хованкі, і я не выдавала.

Сядзіба была вялікая. Перад самай хаткай зелянеў лужок, парослы мяккай гусінай траўкай, а за ім, бліжэй да рэчкі, стаяла яшчэ адна хата, вялікая, у ёй жыў Яўген са сваімі бацькамі, братам і сёстрамі. Раней побач з ёй стаяла трэцяя хата, у якой жылі браты прадзеда Васіль і Мікола. Чацвёртая хата – [( ] брата Восіпа – [ )] стаяла ў садзе. Усіх умяшчала сядзіба: і братоў, і сясцёр майго прадзеда, і яго сыноў, дачок. Жылі адным табарам. (300 слоў)

Паводле А. Кобец-Філімонавай

**179.** Кожнай не выдранай яшчэ з каранямі і не ссечанай лясінай, кожнай пакуль жывою галінкай і зялёным лісточкам, кожнай былінкай і зёлкай замаркочаны Крываліцкі Бор прадчуваў свой блізка-блізенькі скон. Зараз ён нервова пільнаваўся знявечанай шырокімі плугамі свае беражніцы, штораз углядаючыся ў яе праз змрочныя пусткі высечак, якія цягнуліся патрэсканымі, крывымі прагаламі слядоў-разораў па стаптаным, асветленым сонцам падзоле да парэзанага канавамі лугу. Тыя прарэхі нават за адну вясну на дзіва дружна пабраліся ўчэпіста-калючым жавіннікам, пазарасталі выжылістай, разлапістай крапівою, якая па-гаспадарску расселася тут і паспела ўжо ссільнічаць белавата-ружовыя атожылкі маладога маліннiку, абкруціла дрыготкія хлудзікі падлеску-самасейкі і нахабна пацягнулася за ім уверх, да самага сонца.

Каўтануўшы напоўніцу святла і раптоўна спазнаўшы асалоду зваблівай прывольнасці, адчуўшы выгоды неабмежаванай прасторы, імгненна і зусім бяздумна, быццам ап’янеўшы ад нечаканай свабоды, шугануў уверх і ўвесь карлікавы падрост, пажадліва забіраючы, упарта адваёўваючы ў той жа крапіве новую для сябе тэрыторыю.

Знясілены чаканнем наканаванага ліха, Крываліцкі Бор тужліва аглядаў беражніцу. І на тое скрушлівае віжаванне была ў яго важная прычына, ад якой самотна ўсхліпваў-скавытаў у вершаліне некранутых амаль дрэў паслабелы вей-вецярок: жалезныя пачвары ўжо і зляжалы вякамі дзірван лабатага ўзмошча неахайна ўспорвалі сваімі адпаліраванымі да сіняга бляску ікластымі лычамі. Дабіраліся-такі і да яго, [–] самога старасвецкага лесу.

Крываліцкі Бор задыхаўся ў густых хмарах пылу, шчодра здобранага атрутным смуродам, з дня на дзень чакаў спланаванай чалавечымі галовамі навалы, і, здавалася, у запале безвыходнасці ды злосці сам прыспешваў сваю бяду, адчайна клікаў яе, выставіўшы напаказ звабліва прыцягальную прыгажосць цудам ацалелых ад пілы і сякеры задумлівых, даспелых лясін.

Толькі гнуткія, таўшчынёй у дзявочую руку белакорыя бярозкі, якім было яшчэ вельмі далёка да ўсвядомленага спазнання радасці сваёй выспеленай, сталай прыгажосці, неспакойна круцілі вершалінамі, у самоце і трывозе прыпадалі плакуча доўгім веццем ледзь не да самай зямлі, як усё роўна прасілі ў яе парады, шукалі заступніцтва і абароны, нібыта стараліся намацаць пад сабой хоць нейкі, ды паратунак. (304 словы)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паводле М. Карпечанкі

## Кантрольныя дыктанты

**180.** Купала і Колас у пачатку стагоддзя стаялі каля вытокаў новай беларускай літаратуры, адроджанай паэзіі; Коласу, апрача таго, было наканавана значна пасунуць у сваім развіцці нацыянальную прозу, удыхнуць у яе жывое народнае жыццё, [–] нялёгкае жыццё беларускага селяніна, якім ён быў сам па нараджэнні і па сутнасці заставаўся на працягу ўсіх сваіх гадоў. Але, акрамя ўсяго, лёсу было патрэбна, каб гэты селянін стаў яшчэ і адным з першых беларускіх інтэлігентаў, і вось у гэтым двуадзінстве сапраўднай сялянскай сутнасці і нялёгка набытай духоўнасці сакрэт абаяльнасці коласаўскага таленту, [–] таленту надзвычай зямной сілы, якая спакваля завалодала свядомасцю рабочых, сялян, інтэлігенцыі.

Колас – наш нацыянальны геній, класік савецкай літаратуры, які шмат разумеў і бачыў далёка з вышыні свайго чалавечага вопыту і свайго цудоўнага таленту. І ў той жа час ён заставаўся чалавекам простым, да неверагоднага сціплым. Многа сіл аддаючы працы ў Акадэміі навук Беларусі ў якасці яе віцэ-прэзідэнта, ён адводзіў душу на сціплай дзялянцы жыта, якую вырошчваў на сваім гарадскім участку, пісаў мудрыя кнігі і з’яўляўся ініцыятарам такой надта земляробчай кампаніі, як барацьба з засмечанасцю глебы камянямі на палях рэспублікі.

Ён адышоў ад нас, пакінуўшы вялікую спадчыну свайго неспакойнага духу і шматлікія мастацкія старонкі народнага жыцця. (189 слоў)

Паводле В. Быкава

**181.** Бабоеў чуў, што Лавада пасылаў яго да старшага сяржанта Бабіча, але стома паваліла яго на край плашч-палаткі, што была паслана для кулямётчыка, а халодная, настылая зямля прымусіла салдата скруціцца абаранкам і прытуліцца да ног Лавады.

У сне Бабоеў часта ўздрыгваў. Можа, ад холаду, а можа, і нешта сніў. На вайне бывае так, што за кароткі салдацкі сон можна шмат чаго ўбачыць. Той сон як спакуслівае забыццё. За яго хвіліны чалавек не толькі адпачывае, набіраецца сіл, энергіі, але і мужнее. Так, мужнее. За нейкае імгненне паміж баямі [ – ] (а інакш тыя паўзы і не назавеш) [ – ] душу напаўняюць салодкія мроі. Яна паспявае злётаць на радзіму, парадавацца ўяўнай сустрэчы з самымі дарагімі і блізкімі сэрцу людзьмі: з бацькамі, з каханай, з сябрамі. Ад таго прыходзіць палёгка. Тады рукі мацней сціскаюць зброю, вочы робяцца зоркімі, а сэрца напаўняецца яшчэ люцейшай нянавісцю да ворага. У баі перамагае мацнейшы, спрытнейшы, больш кемлівы. Ён хутчэй возьме на макушку ворага, бо калі не ты яго, дык ён цябе абавязкова…

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мажліва, і Бабоеў бачыў у сне свой родны Душанбэ – [,] горад таполяў і сонца. Бачыў і радаваўся. Ад тае радасці сэрца напаўнялася цеплынёй, а яна разам з крывёй расцякалася па целе…(191 слова)

Паводле І. Сяргейчыка

**182.** Стомлены, здубянелы ад холаду або разамлелы ад гарачыні, зноў заходзіш у шумную, звонкую, напоўненую стукам посуду і пахам капусты сталоўку, як у куточак зямнога раю, дзе ты за міскай гарачай капусты ці буракоў можаш падумаць пра што хочаш: пра тое, што было ўчора ў кіно ці ў горадзе, пра дом, пра жонку, пра апошняе яе пісьмо, дзе яна піша, што нарадзіўся на свет сын, што яна хоча назваць яго Іванам, як завецца яго дзед, што ён добры і ціхі хлопчык і вельмі падобны да яго, да бацькі. На момант вочы засцеле сляза, праглынеш горкі камяк, які падступіў да горла, крадком глянеш на сяброў, каб часам яны не прыкмецілі, што ты разнюніўся і забыўся, што ты артылерыст, баец, гатовы кожную хвіліну выканаць загад самой Радзімы.

І зноў голас камандзіра. Гэты голас увесь час як бы вяртае цябе да рэчаіснасці, заклікае жыць сённяшнім днём, а табе гэтага мала, ты хочаш жыць як бы ў трох вымярэннях, у трох плоскасцях: учора, сёння, заўтра. Бо адно без другога – гэта як дзень без сонца, як лес без птушынай песні, як рака без вады.

Страявая песня па дарозе са сталовай трохі вяртае цябе да клопатаў сённяшняга дня. (191 слова)

Паводле У. Дамашэвіча

**183.** Спускаюся па набярэжнай міма Траецкага прадмесця паўз акуратныя, пад чырвонай чарапіцаю дамкі, але іх я не бачу, толькі падсвядома ўспрымаю збоку невыразныя ружаватыя цені. Быццам зусім няісны, лунае перада мною над белымі воблакамі такі ж белы, акварэльна-прывідны кафедральны сабор. Потым ён у мяне збоку, [–] гэта я ўжо іду, мабыць, па мосце над Свіслачу, каб неўзабаве павярнуць на праспект Машэрава. Тут, на праспекце, на мяне часцей, чым дзе-небудзь, находзіць нешта філасофскае: я думаю, як фатальна ўвайшоў у маё чалавечае існаванне гэты вялікі сталічны горад. Але ці не паспяшаўся я з такімі сваімі думкамі?.. Самы сучасны ў горадзе праспект з яго вышыннымі гмахамі, няйнакш, мой урбаністычны міраж, які плыве, прывідна зыбаецца ў мяне перад вачамі, а яго бясконцы, аднастайны гул чуецца мне ўсё больш і больш аддаленым. Горад не запаланіў мяне ўсяго, ён толькі паўрэальны мой антураж, а сапраўды рэальным у маім жыцці намнога раней стала тое, што найперш было мне наканавана. Суджана было мне калісьці адшукаць у лясным гушчары схаванае Богам ад усяго свету Заліп'е, а ў ім забрысці ў двор да Гаркушы, каб вось ужо чвэрць веку так кроўна, так

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

зацікаўлена быць далучаным то да адной, то да другой яго сямейнай гісторы! (192 словы)

Паводле М. Кусянкова

**184.** Якуб Колас – выдатны прыклад непарыўнай духоўнай сувязі са сваім родным кутком. Таму невыпадкова яго землякі, родныя сталі героямі паэм “Новая зямля” і “Сымон-музыка”.

Прырода ў жыцці роду Альбуцкіх і зараз займае немалое месца. Свае сялібы дзеці Міхала пабудавалі на ўзлессі або наводшыбе, каля Нёмана. Для іх лясы, крыніцы, азярыны, сенажаці – гэта Божы дар, які трэба аберагаць і карыстацца ім ашчадна, каб не парушыць, не спаганіць, не разбурыць святога дару чалавеку. Калісьці мая маці напамінала:

– Сынок, памый ногі, а пасля ўжо купайся ў рэчцы. Людзі чэрпаюць ваду для сваёй патрэбы, самі п’юць з Нёмана.

Гэты прыемны напамін і сёння стаіць у вушах.

Дзеці Міхала дакладна ведалі назвы кожнага дрэва, кустоўя, лекавыя травы, кожную лясную, палявую ці лугавую кветку. Распазнавалі галасы птушак, ведалі паводзіны і звычаі баброў, барсукоў, палахлівых зайцоў, лісіныя хітрыкі, воўчыя песні ў розную пару года, ласіныя вяселлі, лаўжы дзікіх свіней. З самага маленства дзяцей уладна клікаў лес, багатыя нерушы баравікоў, духмяныя маліны, суніцы, ажыны, чарніцы. Малыя выдатна чыталі лясную кнігу, асабліва, [] калі выпадаў снег. Умелі слухаць таямнічы гоман вастраверхіх елак, гул мядзяных соснаў, мудры спеў сівых сведак гісторыі Бацькаўшчыны – магутных дубоў-волатаў... Кожны з іх увабраў у сябе гэтую непаўторную сімфонію лясного жыцця, стаў шчырым сябрам маці-прыроды. (200 слоў)

Паводле С. Белага

**185.** Кастравіцкі прыехаў да возера ў канцы ліпеня, у гарачы, напоўнены сонечным бляскам дзень. Ён ніколі не быў тут раней, але многа наслухаўся пра даброты адпачынку ў тутэйшых мясцінах, ціхіх, мала кранутых з-за далечыні ўвагай дачнікаў і ўсіх тых, хто рвецца летам з мітусні гарадоў на прыроду. Возера сапраўды было цудоўнае – вялізнае сярэбранае люстра ў зялёнай аправе сасновых бароў. Але асаблівай цішыні не было, бо дачнікі і турысты на адлегласць, відаць, не зважалі. Па ўзбярэжжы пад соснамі стаялі палаткі, а найчасцей [–] проста машыны, у якіх спалі ноччу іх уладальнікі, з раніцы дымілі ў лесе кастры вясёлага, бесклапотнага табару гараджан.

Па дамоўленасці з навукова-даследчым інстытутам Кастравіцкаму далі пакойчык на біястанцыі, абсталяванай для назірання над рэжымам возера. Побач з біястанцыяй размяшчаўся спартыўны лагер студэнтаў, і яны, загарэлыя да колеру бронзы, цэлы дзень галёкалі на беразе, перакідваючыся мячом, у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

абдымку – [( ] [] хлопцы і дзяўчаты – [ )] [] вандравалі па прыбярэжным пяску ці купаліся, падскакваючы ў вадзе, як дэльфіны, і агалошваючы наваколле вясёлымі выгукамі.

З сабой Кастравіцкі прывёз цэлае бярэмя кніг, [–] добрых, чытаных яшчэ ў юнацкія гады і цяпер напаўзабытых, памятных толькі па тым пачуцці, якое некалі выклікалі. Толькі два ці тры разы на дзень ён падымаўся купацца, вада была халодная і празрыстая, як ранішняя раса; у возера ўпадала толькі маленькая рачулка, адна яна не магла яго напаіць, але ўзровень не паніжаўся нават у гэты спякотлівы месяц, калі мялеюць буйныя рэкі. (222 словы)

Паводле І. Навуменкі

**186.** Павольна, нясмела надыходзіла вясна. Уначы яшчэ задыхаліся ад сцюжы, а ўдзень сляпіла вочы зыркае сонца, звінелі капяжы, з-пад сумётаў выбіваліся каламутныя раўчукі. Біязінка злізвала апошнія закрайкі і набухала празрыстай крынічнаю вадою.

Сібірская вясна бурная, іскрыстая, сонечная, з шумнымі і віратлівымі паводкамі. Лажкі́ і нізіны становяцца азярынамі. Біязінка вырываецца з берагоў, а шырокая, зарослая чаромхаю, тальнікам і глогам Тара ломіць пабурэлы лёд, крышыць крыгі і залівае па самыя макаўкі ўсё наваколле. Мясцовыя рыбакі спускаюць на ваду лёгкія асінавыя чаўны, з дарожкамі, восцямі, “павукамі”, плывуць па разводдзі і вяртаюцца з чырванапёрымі акунямі, даўгарылымі шчупакамі і мноствам срабрыстых чабакоў. У затопленых кустах плёскаецца, гукае, крычыць і свішча ашалелае ад цяпла, вясны і шчасця мноства пералётнага птаства. А мне ўспамінаюцца вясна на Пцічы, набухлыя кусты бэзу, бухматыя жоўтыя коцікі на вербах, качыны гон над разводдзем і шчаслівыя, поўныя спадзяванняў гады майго юнацтва. І такі агортвае сум, такі боль гняце сэрца, што і выказаць нельга нікому.

Сышлі снягі, спалі паводкі, пасохлі груды, пацвярдзела густая, як асфальт, гразь на дарогах. Тайгу завалакла шыза-зеленаватая смуга. Пакуль не ўзняліся хмары гнусу, усе спяшаюцца на лясныя дзялянкі рэзаць на зіму дровы. За лета яны высыхаюць, як звон, і загараюцца ад аднае запалкі. Усе вялікія работы тут робяць талакою. Так косяць і стагуюць сена, ставяць дамы, садзяць і выбіраюць бульбу. Гэта самыя працавітыя таварыствы ўзаемнай дапамогі. Ідуць мужчыны, жанкі, старыя і дзеці, і работа кіпіць, пакуль не будзе ўсё зроблена. Суровая Сібір прадыктавала свае мудрыя законы. (236 слоў)

Паводле С. Грахоўскага

**187.** Максіму ўспомнілася, як у папярэдні прыезд – [( ] тады ён быў дужы – [ )] пайшлі яны з Купалам у поле, якое ляжала перад імі ўсё ў кветках. Дзівосны стракаты дыван, па якім праплывалі цені воблакаў і птахаў. Паэты ляглі сярод кветак, і над імі было неба, [–] сіняе ў белых воблачках. Купала

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

расказваў пра тое, якая прага ў вёсцы да беларускай кніжкі, якім поспехам карыстаецца газета. А потым Купала чытаў. Якія гэта былі вершы! Багдановіч добра разумеў, што Купала – лідар. Творы былі кавалкамі жыцця, цяжкага, гаротнага жыцця, крыху сумныя часам, а больш з сонечнай надзеяй. Было прыемна, што Купала цэніць яго водгукі і заўвагі, верыць ягонаму шчыраму захапленню гэтымі велічна-скупымі вершамі. І тады ўпершыню – [( ] настолькі былі моцныя пачуцці, выкліканыя вершамі, – [ )] Багдановіч зразумеў, што трэба, абавязкова трэба пакінуць свой утульны пакой, застацца тут, на Беларусі, каб слухаць біццё сэрца яе.

На пляцы спыніўся рух ценяў, што спыніла стомлены поступ думак і прымусіла ўвагу зноў уключыцца ў навакольнае. Перасякаючы пляц, ад сабора ішло чалавек дваццаць салдат, у накінутых шынялях, без рамянёў, няголеныя, брудныя, а вакол гэтых дваццаці ўдвая больш ішоў канвой, узброены, маўклівы, і крокі гучалі барабанным россыпам.

Але Максім бачыў стомленыя няголеныя твары, простыя салдацкія твары, вельмі шэрыя на яркім сонцы, такія ж, як і шынялі. Твары былі спакойныя, але ў іх паэт чытаў не абыякавасць і безнадзейнасць, што ўразілі яго тады, пры спатканні з уцекачамі, а стрыманую суровасць і ўпэўненасць. Людзі з гэткім выразам на твары бачылі ўсё: і холад, і голад, і смерць. (240 слоў)

Паводле Б. Мікуліча

**188.** Зямля шырокая, бяскрайняя, здольная будзіць вялікія імкненні пачуццяў і думак. Адчуваецца яна цвёрдасцю пад нагамі і вострым пахам сваім ад вільгаці летняй ночы.

Цяжкія хмары нізка валакуцца над ёю і прабуюць сеяць на яе цёплую імглу, а пасля адпаўзаюць на далёкую мяжу неба і поля і варушацца там дзівоснымі абрысамі ў густой сваёй чарнаце.

Канца-краю зямлі не відаць, як і неба над ёю. Зямля як чорная прастора, прыціснутая хмарамі і маўклівая ад іх. У цемені палёў прытаіліся ціхія вёскі і слухаюць: з самага вечара дзьмуў вецер, над полем плылі ціхія песні травы, а пасля, як нагнаў вецер хмар і адышоў, адно слухаць засталося вёскам шырокую маўклівасць глыбокай ночы.

На зямлі дарога, як само жыццё, відна толькі каля ног, але ж і завезазывае яна ўдаль. Усё едзеш і едзеш па ёй, з кожным крокам яна ўсё новая праходзіць пад нагамі, і здаецца, што наперадзе там, за нечым няясным, дзівосным і далёкім, будзе нешта надзвычайнае.

І ўяўляецца, што гэта хмары ўсё больш пачынаюць збірацца там, куды ідзе дарога, што іх ужо там многа, усё там чарней, як усюды, і няма туды ходу. А як дабярэшся туды, [–] зямля там родная, шырока-вольная, хмары адпаўзлі наперад і зноў можна ісці з радасцю ў бяскрайніх прасторах.

Вільготная зямля глуха аддае стукам пад калёсамі і капытамі коней, са стукам мяшаюцца дробныя званы жалеза ці бляхі вазоў, і яшчэ чуваць галасы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

людской гаворкі ды крыкі на коней, як зыкі кропель вады з дзіравага вядра ў ціхую ноч пры студні. (242 словы)

Паводле Кузьмы Чорнага

**189.** Мінулі грамніцы – падаўжэў слепаваты зімовы дзень. Зіма павярнулася на вясну. Перапальваючы чорнае галлё дрэў, ужо на другі бок Верасава вялікім чырвоным векам выкочвалася сонца, хадзіла вышэй у небе, не заглядваючы ў далёкія куткі верасаўскіх хат. Расплавіўшы снег, падпарвала мокрыя саламяныя стрэхі. З капяжоў звісалі густыя восці ледзяных, вытачаных, нібы верацёны, таўкачоў. Пацеў, абліваючыся расою, наздраваты снег. На аселых курганах, пад дзіравымі карункамі лёду дрыжала і налівалася белаватымі перламутравымі гузічкамі вада.

Адбіваючыся ад снегу, рэзала ў вочы сляпучая яснасць. Ачысціўшыся ад лёду, у хатах сохлі і сівелі ад закурэлага бруду вокны.

Учуўшы цяпло і акрыяўшы, у бутэльках з вадою, што стаялі на стале, распускаліся растапыраныя лапкі бярэзніку, з зярняткаў пупышак лезлі карабатыя смолкія лісткі.

Сярод хаты, чапляючыся доўгімі крыламі за косы слупок сонца, у якім вірыў пыл, вішчала, прымацаваная да бэлькі, тачылася ў гліняны ток сноўніца. Папіхаючы адною рукою, другою дзяўчына вяла па ёй зверху ўніз і знізу ўверх выфарбаваную нітку.

Адсунуўшыся далей ад акна, ад сонца, што ўжо напякло ў плечы, на лаве пасопвалі, сагнуўшыся над хамутом, мужчыны, аглядалі вупраж, [–] гатаваліся да блізкае вясны.

Там-сям у адчыненых насцеж гумнах быў чуваць адзінокі ляск і грук цэпа: нехта яшчэ дамалочваў насенны хрумсткі лубін. Яго, не баючыся, што сточаць мышы, верасаўцы пакідалі на астатнюю пару малацьбы.

На шырокім пляцы перад хлявом храпла, задзірала галаву, фыркала, як перад доўгай дарогай, ідучы рыссю па крузе, маладая танклявая жарабіца. Пад капытамі шахкаў сыры, сцукраваны снег.

Шахкалі па сцукраваным, падточаным сонцам снезе, шмыгалі з хаты ў хату, каб зірнуць, хто ў які колер фарбуе, а хто ўжо і снуе на кросны пражу, верасаўскія маладзіцы і дзеўкі. (260 слоў)

Паводле В. Адамчыка

**190**. І матчыны словы, і ласка яе, і такі прыемны дамашні пах печанага сала з каўбасой зноў вярнулі Івану адчуванне радасці жыцця, радасці, што ён зноў дома і бачыць клопатную немітуслівую матчыну работу і што сама яна ёсць, жывая, усё такая ж руплівая, эканомная, з заціснутымі пад хустку валасамі. І ён успомніў пра той страх, што часам накочвае на яго там, у Мінску, калі доўга няма ад яе пісем, і парадаваўся гэтаму страху, таму што гэты страх

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ёсць і што ён гоніць Івана на вакзал, у цягнік, а пасля – гэтыя дзесяць кіламетраў, калі бяжыш усё хутчэй і хутчэй, баючыся, каб хаця з ёй усё было добра, і не верыш у сваю боязь, [;] і потым на двары, пастукаўшы ў шыбу, напружана чакаеш, калі пачуецца лёгкі шоргат і жывое варушэнне на печы, і з плячэй быццам гара зваліцца. Блісне святло, [–] і вось ён ужо абнімае яе, цёплую ад печы, маленькую, бездапаможна зажмураную ад яркага святла, у спехам надзетай прасторнай сукенцы, адчувае шурпатасць яе разагрэтай сном мяккай шчакі і пакатасць вузкіх прыгорбленых плячэй.

Пасля снедання пайшлі ў хлеў. Іван уздзіраў віламі гной, накідаў на насілкі, стараўся навальваць на свой край болей, каб маці было лягчэй.

Зямля на сотках падсохла, і толькі ў лагчынцы, за хатай, у барознах цвіла шэрай плесняю вада, і ногі грузлі ў цягучай, як цеста, хліпкай мякаці.

Гаварылі мала, спакойна, суладна думкам і настрою. Іван як быццам разагрэўся, скінуў пінжак. Маці таксама зачырванелася тварам. І накідваючы гной, і несучы яго, і гаворачы, ён жыў у сабе. Ён думаў пра сон, што прысніўся сёння ноччу, узбударажыў яго. Ці не сон прынёс з сабой гэтую незразумелую трывогу? (264 словы)

Паводле А. Кудраўца

**191.** Вобраз збіральніка вуснай народнай творчасці ўзнік у мяне невыпадкова, асабліва калі я пазнаёміўся з жыццём і тытанічнай, самаадданай працай такіх збіральнікаў, як Сербаў, Федароўскі, Раманаў, Шэйн, Сержпутоўскі... Якія гэта былі апантаныя людзі! На спадарожных фурманках, пяшком, дзе па чоўне, а дзе і па кладках дабіраліся яны ў самыя аддаленыя, глухія куточкі Беларусі і збіралі, запісвалі ўсё, што толькі здавалася ім вартым, уяўляла каштоўнасць. Дзякуючы гэтым людзям, [] мы маем сёння такое багацце, якога не мае ні адзін народ. І мне хацелася ў вобразе Несмяловіча паказаць гэтых людзей, іх шчырую і неацэнную працу дзеля будучыні Радзімы. Хацелася паказаць і даўнія нашы беларускія вёскі, якія жылі, асабліва на Палессі, аддзеленыя адна ад адной балотамі, лясамі, рэкамі, нібы самастойныя дзяржавы, кожная са сваім жыццём, кожная са сваёй мовай, сваімі песнямі, казкамі, звычаямі. Словам, чым больш я думаў пра Несмяловіча, тым больш упэўніваўся, верыў: такі вобраз павінна мець наша літаратура, павінна стварыць яго. І я ствараў, праўда, найбольш, калі можна так сказаць, у чарнавым пакуль што варыянце – [,] у галаве. За прывабнай, прыгожай знешнасцю паступова вымалёўвалася не менш прывабная ўнутраная сутнасць гэтага чалавека, яго страсная любоў да Беларусі, тых людзей, што насяляюць гэты край. Набываў Несмяловіч і чыста чалавечыя рысы. Я ўжо бачыў, як ён заходзіць у вясковую хату – [,] не брудную, непадмеценую, закопчаную і задымленую [–] (такія на Палессі калі і сустракаліся, дык толькі ў неахайных гаспадароў), [–] а чыстую, светлую, з пабеленымі сценамі, моцнай смалістай падлогай. Бачыў, як ён вітаецца,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гаворыць, пра што распытвае, што хоча ведаць. Я чуў яго голас – [,] лагодны, мяккі, з крышку нетутэйшым слуцкім вымаўленнем, адзначаў для сябе характэрныя выразы твару, рухі... Словам, Несмяловіч паступова рабіўся жывым чалавекам, набываў тое, што ўласціва асобе, індывідуальнасці. (270 слоў)

Паводле Б. Сачанкі

**192.** Едучы ў педінстытут, у надпрыпяцкі горад, дзе жыў і працаваў, калі быў малады, Высоцкі лічыў, што адпачне. Прачытаць за месяц спецкурс на трыццаць гадзін – не надта вялікая цяжкасць для яго, спакушанага ў такім чытанні за доўгія гады выкладчыцкай работы.

Зрэшты, ён мог дазволіць сабе адпачыць пасля корпання ў бібліятэках, архівах, праўкі карэктур, розных патрэбных і непатрэбных пасяджэнняў, нарад, вучоных і рэдакцыйных саветаў, што аднімалі тыдзень за тыднем і месяц за месяцам. Ён любіў ездзіць, але паездкі ў яго жыцці былі не частыя, і ён мог іх пералічыць на пальцах. Найбольш было будзённай аднастайнасці: на факультэт ці ў бібліятэку хадзіў адной і той жа вуліцай, бачыў знаёмыя будынкі, дрэвы, сустракаў добра знаёмых людзей і, пачынаючы з позняй восені, калі ў лесе канчаюцца грыбы, настройваўся на хвалю трызненняў пра новае лета, калі хоць на дзень можна выскачыць з горада ў лес і павандраваць з кошыкам на прыволлі. У чалавеку жыве патрэба сутыкнуцца з простым, першародным, што ідзе ад зямлі, вады, травы, хмар на небе, ветру, які абвявае твар, дажджу, які да ніткі прамочыць вопратку. Такімі вось вандроўкамі Высоцкі лячыўся ад аднастайнасці сваіх заняткаў.

Ён ехаў у горад, дзе прайшла маладосць, і ціха шчымела пад сэрцам. З тых далёкіх дзён, калі ён выбраўся адтуль назаўсёды, ён быў там два ці тры разы, але пахапкам, нават не пераначаваўшы, дый было тое даўно, гадоў дзесяць ці дванаццаць назад.

Цягнік імчыць з поўначы на поўдзень, з краю ўзгоркаў, курганоў, асмужаных пералескаў на вялікую раўніну, дзе лясы большыя, дзе цячэ спакойная Прыпяць і хмурай елкі амаль не ўбачыш.

Вераснёвы час, [:] паспелі яблыкі, грушы, слівы, іх салодкі пах пранікае, здаецца, нават у вагон, які праносіцца міма станцыйных пасёлкаў, наўсцяж засаджаных садамі. (273 словы)

Паводле І. Навуменкі

**193.** Скаланаючыся ад вільготнай стыласці ранку, Агееў надзеў сваю сінюю куртку і, узяўшы рыдлёўку, пайшоў да абрыву.

Нярадасны выгляд кар’ера, які пасля ліўня адкрыўся яму ўчора, амаль не змяніўся за ноч: вялізныя лужыны на дне кар’ера па-ранейшаму былі поўныя жоўтай вады; гара глею і пяску, што рухнула з краю абрыву, разваліласяя сярод адной з іх шырокай гаццю, па-ранейшаму палохаючы яго сваім аб’ёмам.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Агееў з пагорка сышоў на дарогу і пратаптанай ім у быльнягу сцежкай, месцамі слізгаючы нагамі па мокрай зямлі, спусціўся ў самую глыб кар’ера. Зляжалы пясчана-гравійны грунт тут не надта паддаўся дажджу і там, дзе не было лужын, добра трымаў чалавека. Вада ў лужынах стаяла густая і жоўтая, бы апельсінавы сок, і ў глыбокіх мясцінах, мабыць, дасягала яму да пояса. Крыўднае было ў тым, што лівень амаль цалкам затапіў самае патрэбнае яму месца пад навіслым абрывам, на якое ў дадатак да ўсяго яшчэ і рухнула глыба грунту. Агееў нерашуча ступіў на край гэтай глыбы і на яе беражку ля вады згледзеў нешта такое, што змусіла яго ўпусціць з рук рыдлёўку.

Гэта быў абмыты дажджом, зморшчаны і пагнуты жаночы туфель няпэўнага колеру на высокім абцасе, з адкрытым наском і вузенькім раменьчыкам на гузічку – зусім такі, якія перад вайной звалі лодачкамі. Ён амаль сатлеў, доўга праляжаўшы ў зямлі, раскіс ад вільгаці, ледзьве захаваўшы сваю першапачатковую форму, але ўсім сваім выглядам прымусіў Агеева адчуць нечаканае хваляванне, амаль разгубленасць. Праўда, па меры таго, як ён узрушана круціў знаходку ў руках, мацаючы слізкую скуру, напаўадарваны абцас з рэштаю ржавых цвікоў, хваляванне яго стала марнець пад напорам цвярозых думак: ці мала тут магло знайсціся кінутага абутку, яму ўжо траплялiся і кірзавыя халявы ад ботаў, і дзіравыя дзіцячыя галошыкі, цяпер гэты туфель... (275 слоў)

Паводле В. Быкава

**194**. Тры гады мінула з тае пары, як скончылася вайна. Яна адгрымела гарматнай кананадай, адстракатала кулямётнымі чэргамі, гул яе, нібы рэха, паступова знік удалечыні ці дзесьці там і растаў, сцішыўся. На змену гэтым вусцішным гукам, што неслі людзям гора і смерць, прыйшлі іншыя – [] гукі жыцця: жыханне піл у вёсках, стук сякер, віск малатарняў. Перабінтаваўшы раны фізічныя, падлячыўшы раны душэўныя, людзі нанова адбудоўвалі жыллё, аралі зямлю і ціха радаваліся, што засталіся жывымі, што зноў бачаць сонца, жартуюць, смяюцца. Многія жонкі хоць і пакалечаных, але мужчын з вайны дачакаліся, а адсюль – [] радасць двайная.

Здавалася, Сялюцічы былі назаўсёды сцёртыя з зямлі: ні адной сядзібы цэлай не засталося, а ўсіх жыхароў фашысты ў дымператварылі. Аднак – [] не, ажылі і яны. Гэта як у прыродзе. Вырвеш вясной стары непатрэбны куст парэчак разам з карэннямі, штосьці на тым жа месцы іншае пасадзіш, а ўлетку глядзіш – [:] парэчкавыя пасынкі дружна з глебы выперлі. Усё пачысціш, выпалеш – праз які месяц зноў тырчаць. Вось якое яно ўпартае, жыццё, ты яго, здаецца, – насмерць, а яно насуперак усім нягодам пастулова ажывае, распрамляе плечы і зноў насустрач сонцу імкнецца.

Так і з Сялюцічамі сталася. Хтосьці ў час аблавы змог у цёмным склепе адседзецца, хтосьці ў глыбокім падполлі хаты жывым застаўся, камусьці

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пашчасціла ў час пякельнай мітусні непрыкметна за капой сена ад вострага варожага вока схавацца, а потым, шчыльна прыціскаючыся да зямлі-матухны, да лесу дапаўзці. Зноў жа не ўсіх сялюціцкіх мужыкоў на вайне пазабівала, хаця і параненыя, а да спаленага паселішча ўсё ж дацягнулі, пачалі паціху зямлянкі капаць, а калі адагрэліся, адталі сэрцам ды вярнулі душэўную раўнавагу, то пачалі па-новаму жыць. Праз год-[,]другі плач немаўляці іскрыстым званочкам над вёскай-магілай празвінеў, паведаміў свету, што жыццё тут не спынілася, не сышло цалкам, а працягваецца, набірае сілу і моц. (284 словы)

Паводле В. Шабалтаса

**195.** Мы ўдвух – [,] сур’ёзна-заклапочаны Толя ( [–] яму ж ужо было цяпер дванаццаць) [–] і я ( [–] на два гады малодшы) [–] падаліся з коскамі на плячах на Дальнюю Старыну.

Суняліся на лугавой палянцы. Трава на ёй была яшчэ нікім не чапаная, амаль белая ад расы. Толя зняў з пляча касу і, утыркнуўшы кассём у зямлю, пачаў спрытна з аднаго і другога боку шахаць па ёй мянташкай.

Памянташыўшы, прылажыў касу да травы. Узмах управа – і каса пачала нізенька, пры самай зямлі выстругваць і адкідваць убок густую, мокрую ад расы траву. Я проста залюбаваўся, які роўненькі атрымліваўся ў Толі пракос. Прагнаўшы пракос да сярэдзіны лугавіны, паказаўшы мне, як трэба касіць, хлопец утыркнуў там сваю касу і вярнуўся да мяне. Я рабіў усё, як ён. Калі што рабіў не так, мой настаўнік цярпліва папраўляў мяне, паказваючы, як трэба рабіць правільна.

Потым адвёў мне збоку ражок лугавіны між лазовымі кустамі, дзе я павінен быў прайсці сваю "практыку" касьбы. Галоўнае, вучыў мяне Толя, – трымаць касу пры самым доле, увесь час ціснучы на яе пятку. Ён стаў у мяне за спінай, паклаў левую маю руку на кассё вышэй ручкі, а правую – на саму ручку, ашчаперыў мае рукі сваімі, і мы пайшлі ў чатыры рукі касіць. Я аж узрадаваўся: і праўда, так гэта ўсё проста! Але калі Толя адышоў убок і я ўзяўся касіць сам, то ўжо з першага маху сеў у лужыну: дзюбка касы ўторкнулася ў зямлю і я чуць яе вырваў.

З горам напалам я ўсё ж дабіў свой ражок сенакосу. Але калі пад канец паглядзеў на свае вузенькія пракосікі з паклычанай, пазбіванай паверху травой, то вельмі апанурыўся, упаў духам. Ды Толя, як мудры настаўнік, дома пахваліў мяне перад усімі, сказаў, што з мяне атрымаецца праўдзівы касец. Так што назаўтра я ізноў пайшоў з ім на Дальнюю Старыну. (288 слоў)

Паводле К. Цвіркі

**196.** Шчыглоўка – вёска малая, лясная, ціхая. І гэтакую, як сам навакольны лес, можна было б назваць глухменню, калі б не шлях з вёскі ў свет – [,] шырокі, пясчана-мяккі, высаджаны бярозамі. Антон палюбіў яго яшчэ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

малым хлапчуком і заўсёды бачыў у ім не толькі загадкавую веліч, уладу над наваколлем, але і сваю радасць, мару, надзею на спагадную долю. Востра адчуваў, што гэта яго, яму па спадчыне ад бацькоў наканаваны шлях.

І не памыліўся.

На пачатку жыцця шлях прывёў яго, малога, у блізкі, за вёскаю, [] лес, дзе як насыпана было суніц. І ці не ў той самы час з гэтага лесу пачаў насіць грыбы. Яшчэ пазней, калі хлопчыку набегла і пяць, і шэсць гадкоў, бярозавым шляхам ганяў са Шчыглоўкі каня на пашу – [] на ўсю ноч. А як скончыў тры класы ў роднай вёсцы, шлях прывёў у мястэчка Бялынкавічы – [,] да вялікай школы. Тады ўбачыў яшчэ і тое, які доўгі ягоны шлях: да новай школы ажно пяць кіламетраў. Мераў ды перамерваў яго дробнымі крокамі кожны дзень – [:] у маразы ды снежныя завеі, у вясновую ды восеньскую халепу, у лютыя, з ваўчыным стогнам вятры, у дождж ды спякоту – любіў і школу, і шлях бярозавы. Да школы кожны раз спяшаўся, каб не спазніцца на першы ўрок, бо машыны ў той час не хадзілі, пад'ехаць з кім-небудзь на калі шанцавала зрэдку, а ўжо са школы, бывала, пакуль да вёскі дойдзе, колькі разоў спыніцца: то якая птушка прывабіць голасам, то грыб выскачыць на вочы з-за бярэзіны, то прыдарожны каласок пакloніцца, то карытца з бярозавым сокам, разумным чалавекам на вясну выстаўленае, каб падарожнік смагу прагнаў, затрымае… У пятнаццаць гадоў дайшоў ім да чыгункі, сеў на цягнік і апынуўся ў чырваназорнай сталіцы. Там не адразу адшукаў па сэрцы занятак, але вывучыўся ў выдатных настаўнікаў на мастака і ўсё астатняе жыццё з удзячнасцю ўспамінаў сваю дарогу… (292 словы)

Паводле В. Карамазава

**197.** Адгарэла восень залаціста-чырвонымі барвамі. Абляцела жоўта-бурае лісце асін, бяроз, клёнаў. Яшчэ ніжэй схілілася і пабурэла трава прыбяседскай поймы каля Хатынічаў – звону касы яна так і не дачакалася. Вільготны, пругкі норд-вест прынёс свінцова-шэрыя балтыйскія хмары. Некалькі дзён амаль без перадыху сыпаў дробны золкі дождж.

А потым, на пачатку лістапада, выбліснула зыркае сонца, ласкавае, але не гарачае, быццам позняе каханне. Сонца высвеціла ўсё наваколле: голую дуброву каля Бабінай гары, цёмна-зялёныя густакосыя, бы нявесты перад шлюбам, елкі, пяшчотна-зялёныя непралазныя купчастыя хвойнікі. У маладым хваёвым лесе любяць расці казлякі. Іх там высыпае гэтулькі, што хоць касу закладай, але нічыя рука не збірала бліскуча-карычневыя, знізу жоўта-белыя, як сыр, грыбы: менавіта яны, казлякі-масляты, найбольш назапашваюць радыенукліды. Набіраліся гэтых клятых нуклідаў і іншыя дарункі лесу.

Пётр Мамута і Юзя добра ведалі пра гэта і ўсё ж выбраліся ў грыбы. Паездка аказалася ўдалай. Нарэзалі два кашы з коптарам маладзенькіх казлячкоў, крамяных жаўтлявых гусак – так у Хатынічах называлі зялёнкі. Трапляліся ў траве на ўзлессі белавата-ружовыя рыжыкі, знайшлі некалькі баравікоў, ужо не цёмна-карычневых, як у жніўні, а светлых, з далікатным

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

загарам, на кароткіх тоўстых ножках: галавы грыбы ўжо надта не задзіралі, бо халадэча прыціскала да зямлі, прымушала хавацца пад мохам, прыкрывацца шыгаллем.

Пашанцавала натрапіць на апенькі. Пад высачэзнымі елкамі знайшлі некалькі пнёў, абсыпаных грыбамі. Але верхнія пастарэлі, пабурэлі, пакрыліся белым налётам плесені – [,] не дачакаліся, бедалагі, каб хто іх зрэзаў. Затое знізу падпіралі маладзейшыя, іхнія капялюшыкі нагадвалі пятакі, а былі і меншыя з капялюшыкамі-гарошынамі. Вось гэткай малечы і нарэзалі хатыніцкія грыбнікі. Асабліва радавалася нядаўняя гараджанка Юзя: гэтульки грыбоў не даводзілася збіраць ніколі.

Парадкуючы грыбы, даглядаючы гаспадарку, Пётр Еўдакімавіч часта пазіраў на неба, прыслухоўваўся да прагнозаў сіноптыкаў: ён чакаў ціхага, пагодлівага дня, каб уцяпліць на зіму пчол. І вось, на пачатку лістапада, неба, мусіць, стамілася плакаць, вецер разагнаў шэрыя, кудзелістыя хмары, выблiснула сонца. Вымытая ад пылу і бруду прырода заззяла нейкай сарамлівай, сцішанай прыгажосцю. (294 словы)

Паводле Л. Левановіча

**198.** Неяк на самым граным тыдні выправіўся Бус у лес: панасіліся ўсе лапці і трэба было надраць лыка, каб сплесці новыя. Праўда, з гэтай работай ён крыху прыпазніўся: лазу лепей драць увесну, калі сама ідзе сок і калі кара ў лазы лёгка дзярэцца. Надрэжаш унізе, шмарганеш – і ўжо ўся лазіна да самага верху стаіць голая. Аднак Бус усё ж спадзяваўся нашморгаць лыка хоць на двое-трое лапцей.

Хацеў спачатку зайсці па дарозе на свой клін, які з боку поля глыбока ўдаецца ў пушчу, каб паглядзець, ці не патаптаў хто жыта і ці ляжыць на месцы барана, якую ён, заскародзіўшы яшчэ ўвосень ніву, прысланіў да бярозкі. Але передумаў, разважыў па-іншаму: лепей ён зробіць гэта потым, калі спраўдзіць тую справу, дзеля якой і прыйшоў у лес.

Ідучы праз белакоры беразнячок, Бус звярнуў увагу на купку станістых, як дзяўчаткі, бярозак, вакол якіх добра вытаптана трава. Памятаў, бацька яму, малому, неяк паказваў такое ж месца ( [–] толькі абтаптаныя там былі не бярозкі, а сасонкі) [–] і казаў, што траву вытапталі русалкі, якія якраз тады, пасля Сёмухі, павыходзілі з ракі, каб усё лета жыць у лесе і ў полі.

Махнуў перад сабою рукой, нібы ачышчаючы ад нечага сабе дарогу, і пайшоў да Шаўковага балота, дзе раслі густыя лазнякі.

Працавалася яму лёгка і спорна – [,] так, як і ўвесну: надрэжа кару, падчэпіць лязом, шмаргане – і ўся лазіна стаіць распранутая.

Азірнуўся на круглыя, як стажкі, лазнякі, ля якіх ён пабываў і ўбачыў: яны бялелі свежаакоранымі ствaламі і нават сукамі, бо кара не рвецца, садраная са ствала, а пераходзіць на сукі [( ] – спачатку на большыя, а затым на меншыя [ ) ], – і куст распранаецца як не да самай вершаліны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На лазняк непрыемна было глядзець, як быццам бачыў нешта тое, чаго б не хацелася бачыць: кусты стаялі нейкія безабаронныя, нібы голыя людзі. Перавёў позірк на зямлю, на кучкі падранай лазы. Іх было шмат.

– Заканчвай, Бус, працаваць: лазы ўжо хопіць і на дзесяць пар лапцей. (298 слоў)

Паводле Я. Сіпакова

**199.** Добра вядомы ў вучоным асяроддзі – [( ] асабліва славянскім, асабліва філалагічным! – [ )] паклоннік Слова, прафесар, доктар філалагічных навук, аўтар больш як двух дзясяткаў кніг па мове і законах развіцця яе, а адначасова і беззаконні, што часам творыцца ў моўным агародзе намаганнямі няграматных заканадаўцаў-неспецыялістаў, Фёдар Міхайлавіч Янкоўскі не спяшаўся абнародаваць свае літаратурныя творы. Ён быццам не давяраў сваёй літаратурнай творчасці, сваёй літаратурнай фантазіі, сваёй літаратурнай сіле. Відаць, адсюль і сціпласць ці нават асцярожнасць у жанравым вызначэнні таго, што стварыў: “эцюды”, “абразкі”... Пагодзімся: і “эцюды”, і “абразкі” – невялічкія, далікатна выхапленыя з жыццёвай плыні імгненныя карцінкі яе, якія аўтар умеў убачыць і паказаць чытачам, але і апавяданні ў самым сур’ёзным тлумачэнні гэтага саліднага празаічнага жанру. Фёдар Міхайлавіч быў апавядальнік па нутры, па душэўнай неабходнасці, калі слова само просіцца на паперу і калі яно само – [] і ідэя, і сюжэт, і будаўнічы матэрыял. І слова гэта прыроднае, народнае, пачутае і падслуханае, натуральнае ў сваёй сутнасці і прасторы пражывання. Слова як нараджэнне самой зямлі, як яе памяць і памяць людзей, якія яго сатварылі, слова, што з’явілася ўраз і назаўсёды.

Фёдар Міхайлавіч любіў слова. Ён любіў працаваць са словам і ўмеў гэта рабіць. Так добры бондар дзесяць разоў перакідвае з рукі на руку ім жа адабраную з залацістага правага дрэва і ім жа выгабляваную клёпку, паварочвае ў бок сонца, правяраючы на раўніну, на звонкасць і прыдатнасць для дзежкі, дзежачкі ці цабэрка, каб паставіць яе на адзіна ўгатаванае ёй майстрам месца, каб доўга служыла на радасць гаспадыні, у рукі якой тая дзежачка ці цабэрак патрапяць.

Фёдар Міхайлавіч любіў пазабаўляцца са словам, сагрэць яго сваім дыханнем, сваёй пяшчотай, паняньчыцца з ім, як бацька няньчыцца з любым дзіцяткам, гушкаючы яго на руках і падкідаючы “пад самае неба”.

Былі ў Фёдара Міхайлавіча і акопы, і шпіталі, і раны, і боль. Але былі радасць і шчасце – [:] было Слова. Яно і сёння жыве і грэе. (299 слоў)

Паводле А. Кудраўца

**200.** Сябры ішлі па лесе, уважліва гледзячы пад ногі і па баках, каб не збіцца са шляху, якім рухаўся загон. Было зразумела, што воіны трымаліся ланцужком адзін за адным: так заставалася менш слядоў. Ды пільныя хлапечыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вочы заўважалі: вось у адной мясціне застаўся прымяты мох, у маладой хвойкі [–] толькі што абламаная галінка, а ў забалочанай нізіне захаваліся і адбіткі ног.

Чым далей адыходзілі хлопчыкі ад сваёй вёскі і набліжаліся да ўзгоркаў, ці, як іх раней называлі, Сініх Гор, тым гусцейшым станавіўся лес і вышэйшымі дрэвы. Пад імі распасціраўся суцэльны дыван то з верасу, то з моху, то з дурманлівага багуну. Асабліва прыемна ступалася па мяккім імху. Трапляліся, праўда, і вострыя сучкі, але падэшвы ног, загартаваныя ад хады басанож, амаль не адчувалі болю.

У ніжэйшых мясцінах, між хвояў, сустракаліся зараснікі маладога ялінніку і высокай, ледзь не ў рост чалавека, папараці. Тады трывожна рабілася на сэрцы. Хлопчыкі бліжэй туліліся адзін да аднаго, мацней сціскалі зброю, бо ў гушчары далёка не ўбачыш, таму лёгка знянацку натрапіць на дзіка ці мядзведзя. Ад дзіка можна выратавацца на дрэве, а вось ад крывалапага цяжэй: залезе нават на самую хвою.

У такой глушэчы ў падарожнікаў узнікала жаданне павярнуць дахаты ці хутчэй дагнаць загон, бо лепш самая жорсткая лупцоўка, чым мядзведжыя кіпцюры.

Камлі таўшчэзных вываратцей, то нядаўніх, то ўжо зусім спарахнелых ад часу, раз-пораз перагараджвалі шлях. Некаторыя дрэвы, падаючы, зачапіліся сукамі за суседнія хвоі і так, нахіленыя, і застылі. І пад імі было небяспечна прабірацца, бо волаты маглі кожнае імгненне абрынуцца ўніз, нішчачы пад сваім цяжарам усё жывое. Там, дзе віхор пракладваў сабе дарогу ў зялёным лабірынце лесу, вывараці ляжалі спрэс, як пачварныя веліканы на нейкім полі бою. І праз такія мясціны не мог пралезці ні звер, ні чалавек. Толькі яшчаркі, нерухома застыўшы на камлях, грэліся на сонцы ды працавітыя дзятлы выстуквалі – [( ] аж водгулле ішло – [ )] мёртвыя дрэвы, шукаючы на спажыву розных казюрак. (304 словы)

Паводле М. Чарняўскага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Спіс рэкамендуемай літаратуры


Беларуская мова: Тэорыя. Тэсты: для школьнікаў і абітурыентаў / Э.Д.Блінава, Н.В.Гаўрош, М.Ц.Кавалёва і інш. Мн., 2004.

Беларускі правапіс: дапаможнік/ І.Л. Бурак [і інш.]; пад агул. рэд. Д.В. Дзятко. Мн., 2012.

Кароткая граматыка беларускай мовы: у 2 ч./ пад. рэд. А.А. Лукашанца. Мн., 2007 – 2009.

Красней, В.П. Беларуская мова: дапаможнік-рэпетытар для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання. Мн., 2012.

Куліковіч, У.І. Новае ў беларускай арфаграфіі. Правілы. Заданні. Тэсты. Даведачны матэрыял. – 3-е выд., стэрэатып. Мн., 2010.

Куліковіч, У.І. Сучасная беларуская арфаграфія. Правілы. Трэніровачныя заданні. Кантрольныя работы. Заліковыя тэсты. Даведкі: вучэб. дапам. Мн., 2011.

Лепешаў, І.Я., Малажай, Г.М., Панюціч, К.М. Практыкум па беларускай мове. Мн., 2005.

Малажай, Г.М. Беларуская мова: дапаможнік для падрыхтоўкі да абавязковага цэнтралізаванага тэсціравання. Мн., 2004.

Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. Мн., 2008.

Яўневіч, М.С., Сцяцко, П.У. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы: падручнік для студэнтаў філал. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі. Мн., 2006.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Змест

**Прадмова**…………………………………………………………..3
**Прынятыя скарачэнні** ……………………………………….
**I. Слоўнікавыя дыктанты**…………………………………………5
Правапіс галосных е, ё, я……………………………………………..5
Правапіс галосных о, э, а……………………………………………..5
Правапіс галосных у складаных словах……………………………..6
Правапіс і, ы, й пасля прыставак……………………………………7
Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах…………8
Правапіс прыстаўных і ўстаўных галосных……………………...9
Правапіс ў, у…………………………………………………………9
Правапіс д-дз, т-ц……………………………………………………10
Правапіс звонкіх і глухіх, шыпячых і свісцячых…………………11
Правапіс прыставак…………………………………………………12
Правапіс падоўжаных і падвоеных зычных………………………..12
Правапіс прыстаўных зычных……………………………………...13
Правапіс спалучэнняў зычных……………………………………..14
Правапіс мяккага знака і апострафа………………………………15
Правапіс складаных назоўнікаў……………………………………16
Правапіс складаных прыметнікаў…………………………………17
Правапіс прыслоўяў і спалучэнняў, блізкіх да прыслоўяў……….19
Правапіс суфіксаў розных часцін мовы. Правапіс зычных на стыку марфем………………………………………………………………20
Ужыванне і правапіс часціц з рознымі часцінамі мовы…………...21
**II. Тэкставыя дыктанты**……………………………………………..22
Просты сказ………………………………………………………...22
Адасабленне даданых членаў сказа…………………………........36
Складаны сказ……………………………………………………......51
**III. Кантрольныя дыктанты**……………………………………...65
**IV. Дыктанты-ключы**……………………………………………......79
**Слоўнікавыя дыктанты**……………………………. .........79
Правапіс галосных е, ё, я……………………………………………..79
Правапіс галосных о, э, а……………………………………………80
Правапіс галосных у складаных словах……………………………80
Правапіс і, ы, й пасля прыставак……………………………………81
Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах…………..82
Правапіс прыстаўных і ўстаўных галосных… …………………....82
Правапіс ў, у…………………………………………………………..83
Правапіс д-дз, т-ц…………………………………………………….84
Правапіс звонкіх і глухіх, шыпячых і свісцячых…………………..84
Правапіс прыставак…………………………………………………..85
Правапіс падоўжаных і падвоеных зычных…… ……………………86

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Правапіс прыстаўных зычных……………………………………....87
Правапіс спалучэнняў зычных………………………………………88
Правапіс мяккага знака і апострафа………………………………88
Правапіс складаных назоўнікаў……………………………………90
Правапіс складаных прыметнікаў…………………………………91
Правапіс прыслоўяў і спалучэнняў, блізкіх да прыслоўяў……….93
Правапіс суфіксаў розных часцін мовы. Правапіс зычных на стыку марфем…………………………………………………………….. 94
Ужыванне і правапіс часціц з рознымі часцінамі мовы…………...95
**Тэкставыя дыктанты**…………………………………………..............97
Просты сказ…………………………………………………………...97
Адасабленне даданых членаў сказа……………………………......108
Складаны сказ……………………………………………………......122
**Кантрольныя дыктанты**………………………………………………134
**Спіс рэкамендуемай літаратуры**……………………………………......149

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ